Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

9 СТУДЗЕНЯ 2008 г.
СЕРАДА
№ 3 (26116)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

МАЯ СЯМ'Я: АД ДАПАМОГІ ДА ЖЫЛЛЯ

Памеры штомесячных дзіцячых дапамог і аднаразовых дапамог пры нараджэнні, магчымасць атрымання дапамог на дзіця ва ўзросце больш за 3 гады і бясплатнага харчавання на немаўлят, падатковыя вылікі шматдзетным сем'ям і сем'ям з дзецьмі-інвалідамі, працоўныя гарантыі сем'ям, дапамога ў пагашэнні як ільготных, так і нельготных крэдытаў на жыллё, а таксама іншыя пытанні — усё гэта стане тэмай чарговай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам **намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяны Васільеўны ШЭМЕТАВЕЦ**.

Такім чынам, увага! Згодна з папярэдняй дамоўленасцю, «прамая лінія» адбудзецца **з 11 да 12 гадзін 17 студзеня** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 21 і 292 38 92.** Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8-017) 287 17 57.

ДЗЯРЖАВА І ЦАРКВА ВЫРАШАЮЦЬ АДНУ ЗАДАЧУ

Фота БЕЛТА.

«Мы ніколі не аддзялялі сябе ад царквы, бо дзяржава і царква вырашаюць адну і тую ж задачу», — заявіў 7 студзеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы мінскі Свята-Духаў кафедральны сабор.

«Мы заўсёды апіраліся на ідэі царквы, выпрацаваныя тысячагоддзямі, па сутнасці, выбралі яе галоўным ідэолагам беларускай дзяржаўнасці, і мы ў гэтым не памыліліся», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пры гэтым падкрэсліў, што толькі разам, намаганнямі дзяржавы і ўсіх рэлігійных канфесій Беларусі, можна ўмацаваць наш агульны дом — Беларусь і дастойна адказаць на выклікі сучаснага свету. «Добра, што мы сумленна, адкрыта, нягледзячы на канфесіянальную прыналежнасць, жывём утульна, цёпла, спакойна ў нашым агульным доме», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі падзякаваў Уладыку Філарэту за падтрымку, якую аказвае дзяржаве Беларуская праваслаўная царква ў справе ўмацавання здароўя нацыі. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што гэты год па яго ініцыятыве аб'яўлены Годам здароўя. «Год здароўя — гэта не проста заклік стаць на лыжню або нешта падобнае. Мы перш за ўсё павінны пераабсталяваць бальніцы ўсіх узроўняў — раённыя, абласныя, цэнтральныя», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт растлумачыў, што абсталяванне, якое выкарыстоўваецца ў беларускіх бальніцах і фельчарска-акушэрскіх пунктах, значна зношана. І таму ў гэтым, максімум у наступным годзе яно павінна быць заменена на самае сучаснае. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў неабходнасць паляпшэння догляду пажылых людзей, якія засталіся без апекі родных.

«Гэта будзе складаны год, і мы павінны панесці значныя затраты, каб забяспечыць здароўе людзей. А вынік года будзе ацэнены па практычных крытэрыях», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў мінулым годзе, аб'яўленым Годам дзіцяці, упершыню за апошняе дзесяцігоддзе ў Беларусі нараджальнасць перасягнула смяротнасць. «Гэта шчасце. Ніводная еўрапейская дзяржава не можа завяшчь пра такі поспех. Такі ж вынік мы павінны атрымаць у Год здароўя», — сказаў Прэзідэнт.

Беларусь у 2008 годзе павінна зрабіць рывок у эканоміцы, перакананы кіраўнік дзяржавы. «Гэты год будзе няпросты. І не таму, што растуць цэны на энерганосьбіты, а таму, што мы павінны зрабіць рывок для забеспячэння эканамічнага росту, стварыць фундамент для паляпшэння эканамічнага дабрабыту», — сказаў ён. «Таму пасля свят трэба адразу пераключацца на работу, для таго каб у выніку нашай працы нам і нашым дзецям жылося лепш. Гэты год будзе вызначальным у пяцігодцы. Вельмі складаныя задачы стаяць перад намі, і мы павінны іх выканаць», — адзначыў Прэзідэнт.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Беларусі было б прасцей нарошчваць тэмпы эканамічнага развіцця, калі б на краіну не было знешняга націску. «Але гэта заканамерна, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Такі закон канкурэнцыі: мы — маладая дзяржава, якая, падвоіўшы сваю вытворчасць, спрабуе актыўна прадаваць сваю прадукцыю. Адсюль і націск, як правіла, несправядлівы: уплывовым людзям не падабаецца, калі нехта акрамя іх пачынае дабівацца вялікіх поспехаў». «Наша задача ў сувязі з гэтым — спакойна рабіць сваю справу», — заявіў Прэзідэнт Беларусі. «Мы павінны зрабіць усё, каб выкарыстаць кан'юнктуру сусветнага рынку і абараніць нашых людзей праз павышэнне заработнай платы і пенсій», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што найвялікшым дасягненнем Беларусі ў сучасным супярэчлівым свеце, перапоўненым войнамі і канфліктамі, з'яўляецца тое, што ў нашай краіне не былі дапушчаны ні раскол грамадства, ні панаванне крыміналу, ні палітычная смута. Паводле слоў Прэзідэнта, трэба зрабіць усё, каб хаос і несправядлівасць, якія існуюць вакол нас, не ўвайшлі ў наш дом — Беларусь. У пацвярджэнне сваіх слоў кіраўнік дзяржавы прывёў цытату з Евангелля ад Матфея: «Усякае царства, якое падзялілася само ў сабе, апусцее; і ўсякі горад або дом, які падзяліўся сам у сабе, не выстаіць».

Аляксандр Лукашэнка, віншуючы вернікаў з вялікім святам Раждаства Хрыстовага, падарыў Мітрапаліту Мінскаму і Слуцкаму Філарэту, Патрыяршаму Экзарху ўсяе Беларусі вышыты бісерам абраз прападобнага Серафіма Сароўскага работы майстра Святланы Цімашкевіч. Прадстаяцель Беларускай праваслаўнай царквы паднёс кіраўніку дзяржавы ў дар абраз Хрыста Збавіцеля.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота БЕЛТА.

«Пір» на пірсе

г. Брэст

Надвор'е

МОЦНЫХ МАРАЗОЎ У СТУДЗЕНІ БОЛЬШ НЕ БУДЗЕ

Аб гэтым учора журналістам паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава. Паводле яе слоў, тэмпература паветра ўначы ў апошні тыдзень зніжалася да мінус 15—18, а па крайняй поўначы і паўночным усходзе Беларусі — да 19—21 градуса марозу.

З цягам часу моцны антыцыклон згубіць сваю сілу і атмасферны ціск пачне паніжацца. У сераду месцамі па краіне пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу; па захадзе пачнуцца галалёдныя з'явы, пройдзе снег з дажджом, раніцай туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 0 градусаў на захадзе да мінус 13 градусаў на ўсходзе краіны, удзень — 1—7 марозу, на захадзе — да плюс 2 градусаў.

Паводле прагнозаў сіноптыкаў, барацьба холаду з цяплом працягнецца і 10 студзеня, калі па большай частцы краіны будуць ісці ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу, раніцай туман і галалёдзіца. Тэмпература паветра захаваецца ад плюс 2 на захадзе да мінус 5 градусаў на ўсходзе краіны.

Бліжэй да выхадных паветраныя патокі зменяцца на паўднёва-заходнія. Ападкі магчымыя ў паўночна-ўсходняй частцы рэспублікі. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 5 да плюс 1 градуса, а ўдзень — ад мінус 2 да плюс 4 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у астатняй частцы студзеня моцных маразоў не прадбачыцца. У бліжэйшыя некалькі тыдняў у нас будзе трымацца даволі высокі для зімы тэмпературны фон. Ўначы будзе трымацца слаба мінусавая тэмпература, а ўдзень месцамі з плюсамі. Не прадбачацца ў студзені і моцныя снегапады.

Сяргей КУРКАЧ.

Паводле слоў Вольгі Фядотавай, ранняй вясны ў гэтым годзе не чакаецца. Такі прагноз заснаваны на развіцці сінаптычнай сітуацыі пачатку года. Моцныя студзеньскія маразы хутка адыдуць, і будзе пераважаць даволі высокая тэмпература. У начныя гадзіны яна будзе крыху ніжэйшая за нуль, а днём — плюсавая. У далейшым цыкланічныя працэсы не прасочваюцца, значыць, ападкаў будзе няшмат, адзначыла спецыяліст.

Сярэднясутачная тэмпература лютага, паводле ацэнкі сіноптыкаў, складзе 2—7 градусаў марозу, што блізка да кліматычных нормаў. Чакаюцца няўстойлівыя атмасферныя працэсы. Паводле ацэнкі сіноптыкаў, у лютым выпадзе каля 30—40 мм ападкаў.

Звычайна сельскагаспадарчая вясна ў Беларусі надыходзіць у пачатку красавіка, не стане выключэннем і гэты год. Паўтарэнне ранняй вясны, як гэта было ў мінулым годзе, малаверагоднае, падкрэсліла Вольга Фядотава.

«Паводле нашых разлікаў, бліжэй да канца сакавіка — пачатку красавіка на паўднёвым захадзе Беларусі, а ў красавіку і ў цэнтральнай яе частцы могуць пачацца палявыя работы», — падкрэсліла спецыяліст, адзначыўшы пры гэтым, што прагнозы пакуль што папярэднія.

БЕЛТА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЭПІДЭМІЯ ГРЫПУ Ў БЕЛАРУСІ МОЖА ПАЧАЦЦА ПАЗНЕЙ ЗА ХАРАКТЭРНЫЯ ДЛЯ РЭСПУБЛІКІ ТЭРМІНЫ

Эпідэмія грыпу ў Беларусі можа пачацца пазней за характэрныя для рэспублікі тэрміны (канец студзеня — пачатак лютага). Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведаміў намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Міхаіл Рымжа.

Паводле яго слоў, канкрэтныя тэрміны ў многім будуць залежаць ад надвор'я. Так, калі яно застанецца па-ранейшаму цёплым, то эпідэмія грыпу пачнецца пазней. Як чакаецца, эпідэмія будзе сярэдняй інтэнсіўнасці.

САГНУЦЬ ЦВІК РУКАМІ ЗДОЛЬНЫ БРЭСЦКІ ВЫКЛАДЧЫК ФІЗКУЛЬТУРЫ

Незвычайнае хобі стала методыкай выкладання спартыўных дысцыплін у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна, дзе Юрый Касьян працуе выкладчыкам фізкультуры. Сістэма ізаметрычных практыкаванняў з выкарыстаннем уласнага цела, якая прымяняецца Юрыем у рабоце са студэнтамі, дае нядрэнныя вынікі. Практычна кожны чалавек здольны на такія трукі з цвікамі, сцвярджае Юрый. Зрабіць хоць бы два звяны ланцуга з цвікоў — спосаб атрымаць залік аўтаматам на кафедры фізічнага выхавання Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Праўда, ніхто са студэнтаў так і не змог патрацець трук Юрыя Касьяна. Аднак яго майстар-класы карыстаюцца вялікай папулярнасцю.

Фота Уладзіміра ЧАБЕРКУСА, БЕЛТА.

ЗАГАДКАВАЯ СМЕРЦЬ БЕЛАРУСКАГА БІЗНЭСМЕНА

Беларускі камерсант Сяргей Дода загінуў у Санкт-Пецярбургу.

Як паведамляюць расійскія сродкі масавай інфармацыі, труп нашага суайчынніка быў знойдзены на тэрыторыі складскога корпуса адной з тамтэйшых фірмаў.

Прычына і абставіны смерці беларускага бізнэсмена пакуль не высветлены. Вядома толькі, што ён знаходзіўся ў паўночнай сталіцы Расіі з дзелавым візітам.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ВЫРАТАВАЛІ НА ФЕРМЕ 450 РАГУЛЬ

Буйнога ўрону ўдалося пазбегнуць СВК «Бальшавік Агра» Салігорскага раёна дзякуючы зладжаным дзеянням персаналу і аператыўнай працы выратавальнікаў-пажарных.

Пасля вячэрняй дойкі ў памяшканні корпуса малочнатаварнай фермы выйшла са строю вакуумна-помпавая ўстаноўка. Кароткае замыканне электраправодкі прыбора прывяло да ўзгарання. Убачыўшы задымленне, работнікі СВК выклікалі падраздзяленні МНС і пачалі эвакуацыю жывёлы: у будынку фермы на той момант знаходзілася 450 кароў. Выратавальнікі-пажарныя, якія прыбылі на месца, ліквідавалі агонь на працягу паўгадзіны. Пашкоджана частка даху і перакрыцці фермы, а таксама помпавая ўстаноўка.

Паводле інфармацыі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, больш за дзесятак пажараў, якія адбыліся ў сталічнай вобласці за мінулыя тры дні, былі звязаны з парушэннем правілаў пажарнай бяспекі пры эксплуатацыі або ўладкаванні пячнога ацяплення. У пяці выпадках пры гэтым пацярпелі жылыя дамы. У большасці выпадкаў узгаранні былі ліквідаваны ў пачатковай стадыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДТЗ У КАЛЯДНЫЯ ДНІ

За мінулыя выхадныя і святочныя дні ў Беларусі адбылося 29 дарожна-транспартных здарэнняў (ДТЗ), у выніку якіх 6 чалавек загінулі і 32 — атрымалі раненні.

Як паведамілі ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны, супрацоўнікі ДАІ выявілі амаль 17 тысяч парушэнняў Правілаў дарожнага руху. У прыватнасці, за кіраванне транспартнымі сродкамі ў нецвярозым стане затрыманы 398 кіроўцаў, яшчэ 3628 — прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за перавышэнне хуткасці.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Сацыяльны работнік дойдзе да ўсіх?

Да 2010 года колькасць грамадзян, якія атрымліваюць сацыяльныя паслугі дома, ўзрасце на 24 тысячы чалавек. Прычым чакаецца, што да гэтага ж часу сацыяльныя работнікі змогуць наведваць усе населеныя пункты Беларусі незалежна ад іх памеру і аддаленасці ад райцэнтраў.

Паводле слоў начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Сяргеевай, цяпер сацыяльныя работнікі наведваюць дома 78 тыс. пенсіянераў і інвалідаў, 70 працэнтаў якіх пражываюць у вёсках. Прычым паказчык абслугоўвання працягвае ўзрастаць з 2004 года. Як мяркуюць у міністэрстве, перш-наперш падобная акалічнасць стала вынікам прымальных тарыфаў на надомныя паслугі. Да таго ж маламаёмным пенсіянерам, а таксама інвалідам I і II груп, якія з'яўляюцца адзінокімі ці маюць сваякоў за межамі Беларусі, паслугі прадастаўляюцца бясплатна.

Адначасова, зазначыла Валянціна Сяргеева, большая колькасць грамадзян краіны зможа карыстацца і іншымі відамі сацыяльнай падтрымкі. Сёння ў 36 тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання для пенсіянераў і інвалідаў, якія апынуліся ў цяжкай сітуацыі ці маюць праблемы з пражываннем ва ўласных дамах у зімовы час, ужо створаныя аддзяленні кругласутачнага знаходжання. А да 2010 года такія ж аддзяленні павінны з'явіцца яшчэ ў 35 раёнах.

Апроч таго, паведаміла Валянціна Сяргеева, зноў-такі да 2010 года пры ўсіх без выключэння цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання будуць працаваць аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Сяргей ГРЫБ.

Хакерская атака на сервер вядомага Інтэрнэт-партала

Камп'ютарныя зламыснікі ўчынілі напад на адзін з маскоўскіх серверaў беларускага Інтэрнэт-партала TUT.BY.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, хакерская агрэсія на айчынныя Інтэрнэт-рэсурсы была здзейснена ўвечары 5 студзеня. Невядомыя зламыснікі, выкарыстаўшы спецыяльныя шкодныя праграмы, на некалькі гадзін паралізавалі працу TUT.BY. Менш чым за 4 гадзіны сеткавым адміністратарам партала сумесна з супрацоўнікамі ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС краіны ўдалося адбіць атаку хакераў. Амаль усе камп'ютары, якія удзельнічалі ў гэтай «агрэсіі», устаноўлены. Камп'ютары, з дапамогай якіх быў здзейснены напад на беларускі партал, знаходзяцца ў Расіі.

У выніку хакерскай атакі пацярпелі дзесяткі тысяч беларускіх прыватных карыстальнікаў партала і каля 3,5 тысячы прадпрыемстваў, чые сайты знаходзяцца ў яго хостынгу HOSTER.BY. Дакладны памер матэрыяльнага ўрону пакуль нявызначаны. Паводле некаторых звестак, пад пагрозай аказаўся кантракт на некалькі мільёнаў долараў, які мела намер заключыць са сваім партнёрам адно з найбуйнейшых беларускіх прадпрыемстваў. Пакуль што дакладна не высветлена крыніца атакі і матывы «агрэсіі». Паводле слоў намесніка начальніка ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС Беларусі Ігара Пармона, адпрацоўваюцца тры асноўныя версіі: нядобрасумленная канкурэнцыя, вымаганне і дэманстрацыя хакерамі сваіх магчымасцяў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ДАТА-ШТАМПЫ АДМЕНЯЦЬ?

Дзяржпагранкамітэт Беларусі плануе адмяніць у пашпартах дата-штампы пры перасячэнні граніцы, заявіў намеснік начальніка ўпраўлення пагранкантролю камітэта Пётр Аксёнаў.

Паводле яго слоў, адмена дата-штампаў звязана з пачаткам функцыянавання на беларускіх пунктах пропуску адзінай аўтаматызаванай сістэмы пагранічнага кантролю (АСПК). «Мы былі гатовы адмяніць дата-штампы ўжо з 1 студзеня 2008 года, аднак вырашылі пачакаць і паглядзець на тое, як пакажа сябе новая АСПК», — адзначыў Пётр Аксёнаў.

Адмена дата-штампаў будзе праводзіцца ў два этапы. На першым (1-ы квартал 2008 года) — плануецца адмяніць іх пры перасячэнні граніцы для грамадзян Беларусі. Далей будзе адмена дата-штампаў для замежных грамадзян. Цяжкасці другога этапа звязаны з адсутнасцю ў многіх пашпартах замежных грамадзян машынасчытвальнай зоны.

БЕЛТА.

Калядныя «падарункі» ад «Звязды»

Учора ў сценах рэдакцыі прайшла штоквартальная звяздоўская латарэя, у якой было разыграна каля 50 прызоў, сярод якіх падпіска на 2-і квартал 2008 года, фірменныя майкі і кепкі, наручныя гадзіннікі. Сярод суперпрызоў значыліся мікрахвалевая печ «Гарызонт», каляровы тэлевізар «Віцязь» і 2-камерны халадзільнік «Атлант».

Усе калядныя «падарункі» ад газеты «Звязда» знайшлі сваіх уладальнікаў з лёгкай рукі супрацоўнікаў РУП «Белсаюздрук» Андрэя ГАРКАВАГА і РУП «Белпошта» Наталлі ГУЛЯЕВАЙ, а таксама нашага даўняга чытача Уладзіміра ВАСІЛЮКА (на пярэднім плане).

Падрабязнасці розыгрышу — у адным з бліжэйшых нумароў газеты.

Кар. «Звязды».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

АДЧЫНЯЙЦЕ ДЗВЕРЫ, КАЛЯДА ІДЗЕ!

Вёска Рог Салігорскага раёна — адно з тых месцаў Беларусі, дзе ніколі не перарывалася жывая традыцыя Калядаў. Тут заўсёды існавала свая адметная атрыбутыка шчадроўнага абраду. Валянціна САРОТНІК не проста мясцовая жыхарка і заўсёдная ўдзельніца рогаўскіх калядных карнавалаў і гульняў. Як кіраўнік сельскага Дома культуры яна заклапочана, каб Каляды на гэтай зямлі святкаваліся заўсёды, як вялося ад продкаў-палешукоў. Сярод традыцыйных масак Шчодрыкаў былі Каза, Бусел і вось такі незвычайны конік.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Працяг тэмы на 6-й стар.

Зусім асабістае

ЗА СЯБЕ І ТАГО ХЛОПЦА,

альбо Атрымай, родная краіна, новага грамадзяніна!

Раніцай 5 студзеня амаль што роўна а пятай гадзіне мне патэлефанавала мая каханая жанчына і павіншавала: ты зноў стаў бацькам! Зноў сын!

Віцебскі карпункт «Звязды», я думаю, мяне падтрымаюць калегі, безумоўна, можа ганарыцца тым, што ў мінулым 2007-м — Годзе дзіцяці, яго адзіны супрацоўнік, як кажуць, не на словах, а на справе пастараўся ўнесці свой сціплы ўклад у паляпшэнне нялёгкага дэмаграфічнага становішча нашай любімай краіны. Праўда, хлопец — другі па ліку, нарадзіўся ўжо сёлета, своечасова. Так пажадала маці—прырода.

Старэйшаму Міхаілу Аляксандравічу 26 снежня 2007-га споўнілася 3. Ён мне як сябра. А інакш, я лічу, быць у нас з ім і не можа. Як адзначае каханая, я сам, як дзіця. Адрозненне толькі ў тым, што грошы зарабляю ды магу выканаць нейкае сямейнае няцяжкае заданне.

Я перыядычна звяртаюся да Мішы на «вы», заву «старым», калі ён паказвае характар, ды і проста пад настрой. Ну, як усе гэтыя нюансы нашых адносінаў распісаць? Менавіта ён часта натхняе мяне на нейкія артыкулы па розных гарадскіх праблемах. Напрыклад, дзе ў Віцебску ў будні дзень можна правесці вольны час з дзіцем такога ўзросту, калі няма «Славянскага базару» і цырк не прыехаў? І гэта ў «культурнай сталіцы»! Толькі ў заапарку? І апошні, між іншым, даўно патрабуе капітальных перамен. Добра, што новы малады дырэктар Аляксей Андрэйкаў поўны планаў. Затое ў Віцебску пакуль што адкрываецца ўсё больш новых залаў гульняў... у «аднарукія бандыты». Ну не туды ж пойдзеш, і не ў кіно ж з такім малым, хай і ў кіназалу — Дом кіно пасля рамонту. А што, не так?

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Звяздоўцы шчыра віншуюць Аляксандра з найпрыемнай падзеяй — нараджэннем сына і набыццём новага ганаровага статуса — бацькі цяпер ўжо (ці пакуль яшчэ) дваіх дзяцей.

ОАО «Белтрубопроводстрой»

ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ,

что выплата дивидендов по итогам работы Общества за 4 квартал 2007 года будет осуществляться по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 и почтовыми переводами.

Справки по тел. (017) 334 30 31, 334 34 74.

ОАО «Руденск» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион

по продаже здания склада (об. пл. 463,4 кв.м, железнодорожная ветка), расположенного по адресу: Пуховичский район, г. п. Руденск, ул. Железнодорожная, 3. Начальная цена с НДС — 247 800 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка — 0,0723 га. Объект продается без условий. Задаток 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Переход прав на земельный участок будет произведен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **22.01.2008 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.01.2008 г**. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Телефон (8017) 2246134. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

ISSN 1990 - 763X

0 8003 >

9 771990 763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.01.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 162,87
1 латвійскі лат	4 533,47
1 літоўскі літ	916,10
1 чэшская крона	121,12
1 польскі злоты	878,14
1 расійскі рубель	87,61
1 украінская грыўня	425,55

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,5462
10 UAH	48,2357
1000 BYR	11,3897
EUR	35,9332

Курс у гандлёвых кампаніях (на 8.01.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Прыз Каляднага турніру аматараў хакея вярнуўся на радзіму

Фота БЕЛТА.

Каманда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі выйграла IV Калядны міжнародны турнір аматараў хакея. 7 студзеня ў фінальным матчы супраць каманды Расіі з Тальяці беларуская дружына перамагла з лікам 6:2, узяўшы такім чынам рэванш за мінулагоднее паражэнне. Трэцяе месца заняла каманда Украіны, якая ў гэты ж дзень перамагла зборную з Аўстрыі з лікам 8:6.

На афіцыйнай цырымоніі закрыцця турніру кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім камандам, якія ўзялі ўдзел у турніры. У прыватнасці, камандзе Расіі, якая прадэманстравала выдатную гульню ў фінале, і камандзе Украіны, якая ў апошні момант адклікнулася на запрашэнне і паказала бліскучую гульню, заняўшы трэцяе месца. Прэзідэнт адзначыў, што прыемнае ўражанне пакінулі каманды Аўстрыі і Швейцарыі. Асобных слоў падзякі заслужылі і хакеісты Германіі і асаблівa Канады, для каманды якой вялізная адлегласць не стала перашкодай. «Канада не толькі падарыла нам хакей, яна дагэтуль трымае высокую марку лідара сусветнага хакея», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Усім нашым гасцям выказваю ад імя беларускага народа шчырую падзяку», — сказаў у сваім выступленні кіраўнік дзяржавы.

Па выніках турніру ўсім яго ўдзельнікам уручаны памятныя сувеніры, а лепшыя ігракі атрымалі каштоўныя прызы ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Лепшым вратаром прызнаны Віталь Коваль (Беларусь), абаронцам — Уладзімір Цыплакоў (Беларусь), нападаючым — Максім Губараў (Расія). Самым рэзультатыўным гульцом спаборніцтваў стаў нападаючы каманды Беларусі Андрэй Асташэвіч, на рахунку якога 14 рэзультатыўных балаў (9 шайб плюс 5 перадач). Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка набраў 7 (3 плюс 4) ачкоў.

Прыз сімпатый гледачоў атрымала каманда Швейцарыі, якая прайграла ўсе тры свае паядынкі на турніры. Спецыяльны прыз ад газеты «Советская Белоруссия» — «За адданасць і вернасць хакею» — атрымаў аўстрыйскі хакеіст Гюнтэр Штокхамер,

Хакеісты камандаў—удзельніц у сваю чаргу адзначалі высокі ўзровень правядзення Каляднага міжнароднага турніру, які атрымаў неафіцыйны статус чэмпіянату свету сярод аматараў.

Яраслаў РОЖЫН, каманда «Аўтатрэйд» (Расія):

— У фінале зноў традыцыйна сустрэліся каманды Расіі і Беларусі. Але ні ў якім разе нельга сказаць, што астатнія сапернікі слабыя. Проста ў дадзены момант хтосьці мацнейшы, хтосьці слабейшы — так заўсёды ў спорце. І ў Расіі, і ў Беларусі хакей на высокім узроўні, моцныя нацыянальныя каманды, таму нічога дзіўнага ў расійска-беларускім фінале няма. Перамогі хацелі ўсе, і ў нас стаяла задача — не зняславіць Расію, якую мы маем гонар прадстаўляць.

Уладзімір ЯРКІН, капітан каманды «Аўтатрэйд» (Расія), дэпутат Самарскай Губернскай Думы:

— Па ўзроўні прадстаўніцтва — выдатны турнір, які дастойны стаць чэмпіянатам свету сярод аматараў. Тым больш што для аматарскіх спаборніцтваў гэта вельмі высокі ўзровень арганізацыі. У Расіі, магу сказаць дакладна, такія турніры не праводзяцца. У фінальнай гульні беларуская каманда выглядала больш прывабна. Мы не чакалі такога балельшчыцкага аншлагу, падтрымка трыбун шалёная — гэта дзейнічае на каманду, безумоўна.

Наша каманда аматарская, арганізавана тры гады таму, у асноўным у ёй гуляюць супрацоўнікі холдынга «Аўтатрэйд». Хтосьці раней гуляў на прафесійным узроўні, але ў большасці за плячыма дзіцячаюнацкая спартшкола «Лада».

Уладзімір ЦЫПЛАКОЎ, хакейная каманда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, лепшы абаронца турніру:

— Адзіная наша мэта на гэтым турніры — рэабілітаваць сябе за леташняе паражэнне, выйграць фінальную сустрэчу і вярнуць сабе Кубак. Я бачыў і ўдзельнічаў у шматлікіх і рознага ўзроўню турнірах і калі правадзіць паралелі, то па цікавасці балельшчыкаў, напале барацьбы, узроўні арганізацыі гэтыя спаборніцтвы — своеасаблівыя Алімпійскія гульні алімпійскіх камандаў. Што датычыцца нашай каманды, то мы мэтанакіравана рыхтаваліся да гэтага турніру, трэніраваліся тры разы на тыдзень, часам атрымлівалася і чатыры...

— Чаму беларуская каманда амаль заўсёды перамагае з разгромным лікам?

— Гэта каманда добрага ўзроўню. У нас шмат ігракоў, якія ў свой час гулялі на высокім узроўні, і ў пасляспартыўным жыцці засталіся запатрабаванымі ў спорце, перайшоўшы ў аматарскі хакей, што для былых спартсменаў вельмі важна. Не ва ўсіх камандаў такі падбор ігракоў.

Алена КРАВЕЦ.

«МАБІЛЬНЫХ ЦЕНЯЎ» СТАЛА МЕНЕЙ

На айчынным рынку мабільных тэлефонаў істотна павялічылася доля легальных апаратаў.

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта, за перыяд са студзеня па лістапад мінулага года ў нашу краіну было афіцыйна імпартавана больш за 363,4 тыс. мабільных тэлефонаў агульным коштам 35,4 млн доларaў. Для параўнання, за аналагічны перыяд 2006 года ў Беларусь было легальна завезена 215,1 тыс. мабільнікаў на 24 млн доларaў. Варта нагадаць, што ў 2004 годзе афіцыйна ў нашай краіне было рэалізавана 126 тыс. мабільных тэлефонаў, у 2005-ым — усяго 66 тыс. Разам з тым штогод беларусы купляюць прыкладна 1,7 млн сотавых тэлефонаў, затрачваючы на іх набыццё агулам 255 млн доларaў. Няцяжка падлічыць, якая частка рынку мабільнікаў усё яшчэ знаходзіцца пад кантролем «ценевікоў», ад якіх дзяржава недаатрымлівае ў выглядзе мытных пошлін і падаткаў дзесяткі мільёнаў доларaў.

Сітуацыя пачала мяняцца ў лепшы бок у снежні 2006 года, калі было прынята рашэнне аб маркіроўцы ўвозімых у нашу краіну мабільнікаў. На ўпакоўку кожнага тэлефона, які імпартуецца, пачалі наклейваць спецыяльную марку серабрыстага колеру. Апараты, якія не маюць гэтай адзнакі, адразу ж трапляюць пад канфіскацыю, а іх гаспадарам даводзіцца плаціць штраф.

Такім чынам, як бачна, «срэбная метка» стала даволі эфектыўным сродкам барацьбы з «шэрым» імпартам мабільнікаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

У ГОМЕЛІ РЫБАК УМЁРЗ У ВОЗЕРА

У Гомельскай вобласці зарэгістраваны першы выпадак утаплення ў новым годзе. Труп жыхара абласнога цэнтра быў знойдзены умерзлым у лёд на адным з гарадскіх азёраў.

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, тапельца заўважылі рыбакі, якія і паведамілі аб ім у міліцыю. Супрацоўнікі праваахоўных органаў, у сваю чаргу, звярнуліся па дапамогу да выратавальнікаў.

Супрацоўнікі МНС, якія прыехалі на месца, убачылі над ледзяной паверхняй толькі верхнюю частку галавы чалавека. Яго твар і шыю скаваў лёд, а цела знаходзілася ў вадзе. Для таго каб выцягнуць загінулага з возера, супрацоўнікам МНС давялося выкарыстаць бензапілы. У морг ён быў дастаўлены разам з глыбай лёду.

Паводле версіі спецыялістаў, пад лёд мужчына праваліўся некалькі дзён таму, аднак ледзяная корка не дала яму пайсці на дно возера. У такім становішчы ён і замерз у вадзе.

У цяперашні час устанаўліваецца асоба загінулага.

Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.

ПАЦЫЕНТ НЕ ПАМЯТАЕ, ДЗЕ І ЯК АТРЫМАЎ АБМАРАЖЭННІ

За выхадныя дні ў апёкавае аддзяленне Магілёўскай бальніцы № 1 паступілі тры чалавекі з абмаражэннямі рук і ног.

Маразы на ўсходзе Беларусі былі не самыя вялікія — у раёне 10—15 градусаў, але ў спалучэнні з алкагольнымі напоямі і яны сталі для некаторых небяспечнымі.

Два пацыенты без праблем пойдуць на папраўку, паведамілі ў апёкавым аддзяленні. А вось мужчына, якога 7 студзеня прывезлі з вёскі, атрымаў сур'ёзныя абмаражэнні. Тым больш што паміж абмаражэннем і шпіталізацыяй прайшоў пэўны час. Сам пацыент цяпер не памятае, дзе і пры якіх абставінах абмарозіў канечнасці.

Ілона ІВАНОВА.

ДТЗ «ПАД ГРАДУСАМ»

7 студзеня на Гродзеншчыне першую з пачатку года аварыю з цяжкімі наступствамі ўчыніў нецвярозы вадзіцель.

Жыхар абласнога цэнтра, які толькі летась дасягнуў паўналецця, у той дзень ужываў моцныя напоі. Спачатку, па яго словах, выпіў паўтара літра піва, потым — на трох чалавек бутэльку гарэлкі. Сцвярджае, што не помніць, як трапіў у аварыю. Апрытомнеў у машыне «хуткай дапамогі». А кіраваў ён «Маздай». Калі рухаўся ў напрамку Гродна, каля прыгараднай вёскі на прамым апрацаваным спецыяльнай сумессю ўчастку дарогі машыну правым бокам вынесла на паласу сустрэчнага руху. Там адбылося сутыкненне з «Рэно». Пасажыр «Мазды», у якой цалкам дэфармаваўся кузаў, памёр на месцы здарэння. Вадзіцель гэтай машыны шпіталізаваны. Не атрымаць істотных траўм жанчыне, што кіравала «Рэно», дапамаглі рэмень бяспекі і пнеўматычныя падушкі.

Працягваючы працу ва ўзмоцненым рэжыме, супрацоўнікі ДАІ ў той святочны дзень адхілілі ад кіравання 19 нецвярозых вадзіцеляў.

Алег ДУК, старшы інспектар ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ІНТЭРНЭТ-ТРАФІКА

«Белтэлекам» пашырыў з пачатку года знешні шлюз доступу ў Інтэрнэт да 3,1 Гбіт/с.

Пашырэнне адбылося ў напрамку найбольш запатрабаванага беларускімі карыстальнікамі расійскага сегмента сеткі Інтэрнэт і было рэалізавана за кошт арганізацыі яшчэ аднаго канала прапускной здольнасцю 622 Мбіт/с. Дарэчы, за зусім кароткі адрэзак часу «Белтэлекам» ужо ў другі раз пашырае доступ да знешніх інфармацыйных рэсурсаў — папярэдняе пашырэнне шлюзу да 2,5 Гбіт/с адбылося ў кастрычніку 2007 года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Прамая лінія «Звязды»

ЯК НАБЫЦЬ ЗЯМЕЛЬНЫЯ ЎЧАСТКІ ПАВОДЛЕ НОВЫХ ПРАВІЛАЎ

З 1 студзеня ўступіў у сілу Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2007 года № 667 «Аб адабранні і выдзяленні зямельных участкаў». Менавіта гэты комплексны дакумент будзе рэгуляваць зямельныя адносіны ў нашай краіне. З гэтай нагоды ў мінулую пятніцу «Звязда» арганізавала «прамую лінію» з намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Андрэем Гаевым. Наш высокакваліфікаваны эксперт не толькі дасканала патлумачыў розныя моманты Указа кіраўніка дзяржавы № 667, але і адказаў на ўсе «зямельныя» пытанні чытачоў «Звязды».

☎ — ***У нашай вёсцы Нясвіжскага раёна застаўся дом бацькоў, якія памерлі. На пабудову дакументы аформлены, зроблены тэхнічны пашпарт і іншыя паперы. А вось зямлю мы не афармлялі. Справа ў тым, што там даволі вялікі зямельны ўчастак памерам 22 сотні. Нам так шмат зямлі не трэба. Калі гэта магчыма, то ўзялі б 5 сотак зямлі і ўсё. Як такую працэдуру аформіць паводле новых правілаў?***

Міхась САКАЛОЎСКІ, *г. Мінск.*

— Наколькі я разумею, то на зямельны ўчастак у вас ніякіх дакументаў зроблена не было?

— На зямлю ў нас ніякіх паперняма.

— Цяпер у гэтым доме жыве хто-небудзь?

— Так, аднак толькі ў летні сезон.

— Вам трэба напісаць заяву ў сельскі Савет аб выдзяленні зямельнага ўчастка для абслугоўвання жылога дома ў памеры 5 сотак, а не 22, якія лічацца за домам. Потым трэба будзе заключыць дагавор аб стварэнні землеўпарадкавальнай справы. Пасля гэтага вам выканаюць усе работы, зарэгіструюць аб'ект нерухомасці і аддадуць гатовыя дакументы.

— А пасля рэгістрацыі гэтага аб'екта нерухомасці пенсіянерам трэба будзе плаціць падатак на зямлю?

— Згодна з існуючым заканадаўствам пенсіянеры вызваляюцца ад выплаты зямельнага падатку.

☎ — ***Маю дачны ўчастак па лініі электрычкі, які не прыватызаваны. Якія змяненні ўносіць Указ № 667 у працэс прыватызацыі?***

Зінаіда ВІНІК, *г. Мінск.*

— Усе правілы, якія былі вызначаны для атрымання зямельных участкаў ва ўласнасць, захоўваюцца і цяпер.

— Што трэба рабіць?

— Накіраваць адпаведную заяву ў райвыканкам і далей па працэдуры: заключыць дагавор падраду з Белгіпраземам на афармленне землеўпарадкавальнай справы, а пасля рэгістрацыі атрымаць дакумент. Зямлю можна выкупіць ва ўласнасць па кадастравым кошце або аформіць у пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну.

— А калі мы пачалі прыватызацыю і афармленне яшчэ летась, то як гэта рабіць цяпер?

— Пры афармленні і прыватызацыі зямельных участкаў, якія былі атрыманы да пачатку 2008 года, дзейнічаюць старыя правілы. Новыя правілы пачынаюць дзейнічаць, калі грамадзяне збіраюцца набыць новыя зямельныя ўчасткі сёлета.

Асобна заўважу, што для грамадзян, якія хочуць аформіць права на свой участак у дзеючым садаводчым таварыстве, ніякіх ускладненняў і змяненняў няма. Пасля адпаведнай заявы правы на зямлю будуць аформлены па прынцыпе «аднаго акна».

☎ — ***Згодна з новым Указам № 667 чалавек атрымлівае зямельны ўчастак паводле нормы закона, як маючы патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Такі грамадзянін павінен пачаць будаўніцтва жылля на ўчастку на працягу года. А калі ён не пачаў гэта будаўніцтва, то яго папярэджваюць і адбіраюць участак. Які тэрмін яму даюць пасля папярэджання, каб ён паспеў стартаваць» з будаўніцтвам?***

Антон ДАНІЛЕВІЧ, *г. Мінск.*

— Папярэджанне даецца тэрмінам на адзін месяц. Калі ж на працягу гэтага месяца ўладальнік зямлі не пачаў будаўніцтва, то будзе ставіцца пытанне аб адабранні зямельнага ўчастка.

— Калі чалавека папярэдзілі аб неабходнасці пачаць будаўніцтва, то праз які час яму трэба будзе завяршыць гэта будаўніцтва?

— У такім выпадку дзейнічае Указ кіраўніка дзяржавы № 87, які быў прыняты ў лютым 2006 года, дзе прадугледжана, што тэрмін для завяршэння будаўніцтва жылых дамоў для грамадзян вызначаны на працягу трох гадоў. Акрамя гэтага, прадугледжана магчымасць прадоўжыць такі тэрмін яшчэ на год, а пры неабходнасці — закансерваваць аб'ект на тэрмін да трох гадоў. Адзінае, што такая кансервацыя не можа быць зроблена бліжэй за 500 м ад рэспубліканскіх дарог.

— Калі я набуду зямельны ўчастак на аўкцыёне, то такі ўчастак таксама маюць права адабраць? Але ж гэта будзе ўжо мая прыватная ўласнасць.

— Вы павінны разумець, што любы зямельны ўчастак, які выдзяляецца, павінен выкарыстоўвацца для пэўных мэтаў па прызначэнні незалежна ад таго, купілі яго на аўкцыёне або неяк інакш. Калі ўчастак не будзе выкарыстоўвацца па прызначэнні, то будзе ставіцца пытанне аб яго адабранні.

— Патлумачце, а калі я куплю зямельны ўчастак на аўкцыёне, ці буду потым мець права прадаць яго пустым?

— Так. Пры набыцці зямельнага ўчастка на аўкцыёне яго можна будзе потым прадаць без пабудоў.

☎ — ***Жыву разам з бацькамі і братам у двухпакаёвай кватэры. Разам з жонкай стаю на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Брат таксама з'яўляецца «чаргавіком». Купіць зямлю ў Мінску мы не можам, бо не хапае грошай. Ці можна атрымаць зямельны ўчастак за межамі сталіцы, бо мой брат працуе ў фірме каля Заслаўя?***

Аляксандр СНІТОК, *г. Мінск.*

— Калі ваш брат жыве менавіта ў гэтым населеным пункце і стаіць там на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, то можа атрымаць там зямельны ўчастак як «чаргавік» без аўкцыёну.

Сяргей КУРКАЧ.

(Працяг будзе.)

Справы партыйныя

ПКБ будзе ліквідавана?

Міністэрства юстыцыі Беларусі падало ў Вярхоўны Суд іскавую заяву аб ліквідацыі Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ). Гэта адбылося пасля вынясення партыі двух пісьмовых папярэджанняў і прыпынення яе дзейнасці.

Пісьмовыя папярэджанні ПКБ атрымала ад Міністэрства юстыцыі ў студзені і лютым 2007 года за парушэнне заканадаўства і ўласнага статута. Аднак, як гаворыцца ў паведамленні міністэрства, якое было распаўсюджана днямі, «парушэнні працягваліся». У такой сітуацыі міністэрства «было вымушана абраць больш жорсткую меру ўздзеяння» і звярнулася ў Вярхоўны Суд з іскавай заявай аб прыпыненні дзейнасці партыі.

У жніўні судовым рашэннем дзейнасць ПКБ была прыпыненая на 6 месяцаў. «Міністэрства юстыцыі спадзявалася, што кіраўніцтва партыі зробіць адпаведныя высновы і накіруе сваю дзейнасць у прававое рэчышча». Аднак і пасля прыпынення дзейнасці партыя «рабіла дзеянні, якія ёй забаронены ў гэты перыяд».

Так, паводле інфармацыі Міністэрства юстыцыі, ПКБ ажыццяўляла арганізацыю масавых мерапрыемстваў у Мінску і рэгіёнах краіны. Акрамя таго, «партыя працягвала палітычную дзейнасць». Сведчаннем гэтага з'яўляюцца паведамленні Інтэрнэт-крыніц аб тым, што ПКБ разам з іншымі суб'ектамі палітычнай дзейнасці падпісала «пагадненне аб прынцыпах удзелу» ў кампаніі па выбарах парламента ў 2008 годзе. Акрамя таго, з'яўляліся паведамленні, што ПКБ, як і іншыя суб'екты, якія падпісалі пагадненне, вылучыла сваіх прэтэндэнтаў у кандыдаты на выбарах.

Паводле інфармацыі Міністэрства юстыцыі, ПКБ працягвала і «актыўную міжнародную дзейнасць». Прадстаўнікі партыі ўдзельнічалі ў шэрагу канферэнцый за мяжой. Акрамя таго, ПКБ «стварала новыя аргструктуры (Ваўкавыскую і Рэчыцкую раённыя), змяняла прававы статус створаных раней сваіх аргструктур, а таксама праводзіла іншую працу, не звязаную з устараненнем парушэнняў, якія сталі падставай для прыпынення дзейнасці партыі».

Прыведзеныя звесткі, як лічаць у Міністэрстве юстыцыі, сведчаць пра тое, што ПКБ «фактычна ігнаруе» рашэнне Вярхоўнага Суда, аб прыпыненні дзейнасці партыі, а таксама парушае патрабаванні Закона «Аб палітычных партыях».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Спорт-тайм

Паміж Анголай і Венесуэлай

У рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбольнай гісторыі і статыстыкі па выніках 2007 года беларускі чэмпіянат заняў 70-е месца. Цікава, што першынство нашай краіны апынулася паміж чэмпіянатамі Анголы (69-я пазіцыя) і Венесуэлы (71-я), а ў сярэдзіне мінулага года было 72-м. У дзесятцы наймацнейшых турніры Англіі, Іспаніі, Італіі, Бразіліі, Аргенціны, Германіі, Францыі, Мексікі, Калумбіі і Партугаліі. Чэмпіянат Расіі заняў 13-е месца, а Украіны — 14-е.

Крыушэнка дэбютаваў у ролі трэнера

Футбалісты мінскага «Дынама» правялі першы матч пад кіраўніцтвам новага галоўнага трэнера 42-гадовага Ігара Крыушэнкі. Сапернікамі сталічнага клуба сталі ігракі літоўскага «Каунаса». Сустрэча ў мінскім манежы завяршылася ўнічыю — 2:2. У складзе гаспадароў галы забілі Гігевіч (34-я хвіліна) і Рак (78-я), а госці вызначыліся двойчы ў канцоўцы другога тайма.

Стрыпейкіс стане «шахцёрам»

Лепшы бамбардзір у гісторыі беларускага футбола 33-гадовы Валерый Стрыпейкіс пераходзіць у ФК салігорскі «Шахцёр». Кіраўніцтва «Гомеля» вырашыла не працягваць кантракт з ігракам.

Зноў канадцы

Наймацнейшай маладзёжнай зборнай па хакеі на планеце ў чацвёрты раз запар стала канадская. На турніры ў Чэхіі яна выйграла ў фінале ў авертайме ў шведскіх аднагодкаў — 3:2. «Бронза» на рахунку расіян, якія перамаглі амерыканцаў, — 4:2. У сімвалічную зборную турніру ўключаны нападаючы бронзавых прызёраў, унук легендарнага трэнера ЦСКА і каманды СССР Віктар Ціханаў.

Кантынентальны кубак у «Ак Барса»

Паўнамоцтвы ўладальнікаў Кантынентальнага кубка ў хакеістаў мінскага «Юнацтва» адабраў казанскі «Ак Барс». Віцэ-чэмпіёны Расіі перамаглі «Казцынк-Тарпеда» (Казахстан) — 2:1, «Ольбарг» (Данія) — 4:1 і «Рыгу-2000» (Латвія) — 6:2. Суперфінал другога па значнасці еўрапейскага клубнага хакейнага розыгрышу адбыўся днямі ў Рызе. Лепшым снайперам турніру стаў чэшскі форвард «Рыгі-2000» Томаш Хлубна, які не так даўно гуляў за беларускі клуб «Юнацтва».

Ралі «Лісабон — Дакар» адмянілі

Арганізатары экстрэмальнага ралі-марафону «Лісабон—Дакар-2008», якое павінна было стартаваць 5 студзеня, адмянілі гонку, бо мясцовасць у Маўрытаніі, па якой пралягае траса, дастаткова неспакойная, час ад часу там адбываюцца ваенныя напады. Доказ таму — нядаўні расстрэл чатырох французскіх турыстаў, якія прыехалі на пікнік. Нагадаем, што ў сёлетнім ралі павінен быў дэбютаваць беларускі экіпаж. Зразумела, навіна аб адмене марафону засмуціла нашу каманду, якая затраціла на падрыхтоўку шмат сілаў і фінансавых сродкаў. Экіпаж плануе правесці трэніроўкі ў Марока.

Марціне Хінгіс вынесена пакаранне

Міжнародная федэрацыя тэніса дысквалiфікавала экс-першую ракетку свету швейцарку Марціну Хінгіс на два гады за допінг-пробу са станоўчым вынікам на какаін. З-за гэтага 27-гадовая спартсменка будзе пазбаўлена сваіх тытулаў, пачынаючы з мінулага Уімблдонскага турніру.

На самы вялікі каток — з усмешкамі

У Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё самага вялікага ў краіне катка на Кастрычніцкай плошчы. Нягледзячы на тое, што ўсяго ў сталіцы працуе 170 лядовых пляцовак, менавіта гэты каток з першага дня карыстаецца вялікай цікавасцю сярод мінчан і гасцей горада.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗА СЯБЕ І ТАГО ХЛОПЦА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Памятаецца, калега зрабіла мне заўвагу: маўляў, мала было ў адным маім даўнім «прыватным матэрыяле» інтыму. Ну, атрымайце... Вельмі прыемны працэс, у выніку якога праз доўгія месяцы можа з'явіцца дзіця, можна апісваць доўга. Здарылася шчасце на гэты раз пасля работы (хай, начальства думае, што рэпарцёры заўсёды ўвесь рабочы дзень толькі і робяць, што займаюцца адной журналістыкай). Дарэчы, мая каханая часта канстатуе, што мяне цікавяць толькі дзве рэчы: мая работа і сэкс (ой, а калі гэта можна сумяшчаць, дык такое задавальненне, напэўна, атрымаеш).

Памятаю, прыкладна год таму атрымаў заданне падрыхтаваць артыкул па тэме дэмаграфічнага становішча. Нейкую, не самую цікавую назву прыдумаў. Чытаю чарговы нумар і бачу назву: «Ці будзе другі?» (калі не памыляюся, менавіта такая). А побач здымак майго цяпер ужо старэйшага сына з мабільным тэлефонам, што ён прыклаў да вуха (я фота адправіў у рэдакцыю, каб атрымаць дадатковы ганарар). Ну, і хто такі начальнік, які «бачыць будучыню» ў нашай рэдакцыі?

Настрой у мяне? Безумоўна, на ўсе сто. Зараз яшчэ крыху папішу і прыму «законных для шчасліва га бацькі 100 грамаў»... Не разумею тых мужчын, хто ў выніку разводу ці пасля расставання пасля так званага грамадзянскага шлюбу або рэдка сустракаюцца з роднымі дзецьмі, або наогул і бачыць іх не хочуць. І тых не разумею, каму ўжо 50 гадоў праз 20 споўніцца, а сям'і ўсё няма, а галоўнае — дзяцей. Колькі ў Віцебску адзінокіх жанчын! Што датычыцца меркаванняў тыпу: некалькі хвілін задавальнення (гэта ў каго як), а потым плаці гадамі аліменты... Не згодны з такой думкай. Упэўнены, што, бясспрэчна, лепш «укладваць грошы» ў родную крывінку, чым гадамі траціць іх на гарэлку і г.д. Хоць, безумоўна, такія жанчыны бываюць, што праз месяц знаёмства хочацца пешшу ісці ў камандзіроўку ў самы далёкі раён.

Гэта ўсё пра некаторых мужчын я шчыра, і зусім не таму, што я — такі добры, а нехта наадварот. Недахопаў у мяне шмат і грахоў. Проста не разумею: як можна спакойна жыць, хадзіць на работу, піць горкую, сустракацца з жанчынамі і не думаць, што тваё роднае дзіця, безумоўна, чакае сустрэчы з табой?... Толькі тваё дзіця шчыра цябе любіць. І, спадзяюся, будзе так усё жыццё.

Цяпер зусім пра іншае. Проста абурае, калі жанчыны расказваюць гісторыі пра тое, як на іх месцах працы начальства літаральна супраць жадання падначаленых лэдзі мець дзіця. Ды, бывае, у некаторых інстанцыях да жанчын ставяцца непаважліва. Прыклады? Калі жанчына была ў дэкрэтным водпуску, ды пажадала нарадзіць чарговага, і факт гэты бачны ўсім адразу (дзякуючы вялікаму жывату), а ёй гавораць пра бліжэйшую перспектыву пераатэстацыі... Безумоўна, яна адразу пасля «дэкрэту» не можа адпавядаць патрабаванням да працы, якія за гэты час змяніліся. Другая гісторыя: у паліклініцы ўрач сказала цяжарнай, што ёй трэба зайсці па кансультацыю да іншага спецыяліста. Маўляў, скажыце, што я накіравала, ідзіце без чаргі. А там: «А чаму без запісу, адкуль я ведаю, што вы цяжарная?» Ну, паскардзілася загадчыцы, а яшчэ ў адным кабінеце зноў нейкая праблема. Выходзіць, на ўзроўні кіраўніцтва краіны гаворыцца пра неабходнасць дэмаграфічнага «выбуху», а на месцах?.. Пра ўмовы ў радзільных дамах, што засталіся яшчэ з савецкіх часоў, мне расказвалі шмат. І што гэтыя ўсе прыклады не ўплываюць на вырашэнне дэмаграфічнай сітуацыі? Яшчэ як! А тыя ж праблемы на працы, звернешся па дапамогу ў розныя інстанцыі, потым жыцця не дадуць у роднай канторы. Ды, вядома, захочуць звольніць, падстава заўсёды знойдзецца.

Але ж не ўсё так дрэнна. Ёсць шмат пазітыву. У прыватнасці, добра, што ў Оршы пасля рэканструкцыі адкрылі радзільны дом. У Віцебску атрымлівае новае жыццё адна з такіх медыцынскіх устаноў. Ільготы прадстаўляюць сем'ям з дзецьмі пры будаўніцтве жылля. На жаль, аформіць гэты самы крэдыт ох, як няпроста. Ужо, прабачце, банкіры.

Дзяржаўная дапамога на дзяцей... Безумоўна, дзяржава — не Дзед Мароз. Ну, калі шчыра, мала «дзіцячых» грошай. Я маю на ўвазе для тых, каго можна лічыць добрасумленнымі бацькамі. Добра, такіх большасць!.. Аднойчы спецыялісты ўпраўлення аховы здароўя расказалі, што некаторыя маці, якія злоўжываюць спіртным і г.д., «робяць на нараджэнні дзяцей «бізнэс», бо першапачатковая сума грошай пры нараджэнні дзіцяці для такіх несумленных фантастычная: хапае на выпіўку надоўга. Што тычыцца практыкі медыкаў па стэрылізацыі такіх не самых лепшых жанчын, пытанне гэта філасофскае, няпростае. Ведаю вельмі добрых людзей, якія нарадзіліся не ад самых лепшых жанчын.

Кожныя нармальныя бацькі хочуць, каб у іх дзяцей было ўсё, што трэба. Таму многім і даводзіцца падпрацоўваць (і ў большасці выпадкаў мужчын «натхняюць» на гэта іх другія палавінкі). Але і гэта не ўсім зразумела. Маўляў, шмат вольнага часу на «галоўнай рабоце»? А ў кантракце «нічога такога» не забараняецца... Што датычыцца асабіста мяне, у сувязі з прыемнай падзеяй у рабоце віцебскага карпункта, хочацца звярнуцца да чытачоў і тых бізнэс-структур, якім рэклама патрэбна: тэлефануйце. Першым абяцаю, калі ёсць сур'ёзная праблема, пастараюся дапамагчы ў выглядзе артыкула. Калі не вельмі важнае пытанне, безумоўна, тэму «забяру на заметку», параю куды звярнуцца па параду. А другім гарантую рэкламныя артыкулы добрай якасці (ну, што не зробіш за вашы грошы?).

Бадай, і хопіць? Нас у рэспубліцы стала яшчэ болей. Будзь здаровым у Год здароўя і ўсе наступныя. Будзь шчаслівым! Будзь добрым, нездарма нарадзіўся ў дзень работніка сацыяльнай абароны. За дзяцей, за бацькоў, за Беларусь! Халасцякі, далучайцеся да справы павелічэння насельніцтва. Не пашкадуеце!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

На слыху

У ГОСЦІ — З ГРАНАТАМЁТАМ?

А як жа! Каб пахваліцца свайму дружбаку, якая незвычайная штука (такой, далібог, не знойдзеш не толькі ў ікняй вёсцы Літвінавічы, але і ва ўсім Кармянскім раёне) з'явілася ў яго гаспадарцы. З гэтай нагоды, ды яшчэ каб і павіншаваць з Новым годам і Калядамі, і прыйшоў сусед да суседа. Узялі мужыкі на грудзі за дзеда Мароза, за Снягурку, за мудрага Пацука ды і пачалі разглядаць указаную рэч. Што яны рабілі з ёй, цяжка сказаць. Толькі вядома: грымнуў стрэл. Гаспадар ад страху ледзь не страціў прытомнасць, бо ў хаце пачаўся пажар, а госць пазбавіўся кісці рукі. Адпаведныя органы вядуць следства, адкуль у яго з'явіўся гранатамёт?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

У БЫТАВЫХ СВАРКАХ ЗАГІНУЛІ ЖАНЧЫНЫ

Два забойствы на глебе празмернага спажывання спіртных напояў учынены напярэдадні калядных святаў у Магілёўскай вобласці.

Раніцай 4 студзеня ў Чэрыкаве знайшлі цела 35-гадовай жанчыны. Міліцыя хутка ўстанавіла, што напярэдадні яе моцна збіў, рукамі і нагамі, п'яны 25-гадовы сужыцель.

5 студзеня раніцай у вёсцы Вялікія Бортнікі Бабруйскага раёна адбылося забойства. Яго ўчыніў п'яны 47-гадовы мужчына. У сварцы ён ударыў нажом у жывот сваёй 52-гадовай жонцы, якая памерла. У абодвух выпадках распачаты крымінальныя справы, мужчыны затрыманы.

Міліцыя цяпер разбіраецца са здарэннем, якое адбылося ў Чавускім раёне 6 студзеня. Пакуль ёсць толькі папярэднія звесткі. Паводле якіх, увечары 41-гадовая магіляўчанка ехала пасажыркай у аўтамабілі ВАЗ-2101 па трасе «Магілёў—Чавусы». У час руху яна пасварылася з мужам і спрабавала спыніць аўтамабіль. Пасля таго як машына спынілася ў раёне вёскі Гарбавічы, жанчына рэзка выскачыла на дарогу і літаральна кінулася пад колы аўтамабіля, які рухаўся па сустрэчнай паласе. У выніку жанчына атрымала смяротныя траўмы. Здарэнне, якое выглядала як суіцыд, цяпер уважліва правяраюць праваахоўныя органы.

Між тым, увогуле выхадныя дні ў рэгіёне прайшлі даволі спакойна — паведамляе УУС Магілёўскай вобласці. За чатыры дні, з 4 да 7 студзеня, зарэгістравана меней за сто злачынстваў. Часам здараецца, што такая іх колькасць рэгіструецца за суткі.

Ілона ІВАНОВА.

ЗАСНУЛІ НАЗАЎСЁДЫ

У Кобрыне ў адным з гаражоў на завулку Заводскім здарылася трагедыя. Гаспадар раніцой прыйшоў у гараж і там у аўтамашыне знайшоў свайго 19-гадовага сына і 15-гадовую школьніцу. Абое былі мёртвымі.

Маладыя людзі закрыліся ў машыне, а каб не было холадна, завялі рухавік. А далей па вядомым сцэнарыі: гараж напоўніўся выхлапнымі газамі і няшчасныя непрыкметна заснулі... назаўсёды.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СВАРКА З КІПЕНЕМ

31 снежня, калі да наступлення Новага года заставаліся лічаныя гадзіны, на ферме ў вёсцы Макаранцы Магілёўскага раёна пасварыліся дзве сястры. Ад слоў даярка і рабочая мясцовага СВК перайшлі да справы: малодшая сястра штурхнула старэйшую, і тая звалілася ў ванну з кіпенем. У выніку 47-гадовая жанчына атрымала моцныя апёкі, але два дні яшчэ знаходзілася дома. І толькі 2 студзеня раніцай яе даставілі ў апёкавае аддзяленне Магілёўскай бальніцы № 1. Цяпер яна ў рэанімацыі, яе стан медыкі ацэньваюць як цяжкі.

КОЛЬКІ ЎЖО НАМ КАЗАЛІ ПР

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

9 студзеня 2008 г. № 1 (104)

УВАГА. КОНКУРС

ЛЕПШЫЯ САВЕТЫ БУДУЦЬ ПРЭМІЯВАНЫЯ

Цяпер у Віцебскай вобласці па традыцыі праходзіць агляд-конкурс сярод органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Вызначаць тыя Саветы, дзе лепш вырашаюцца пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва. Абласную камісію па падвядзенні вынікаў узначальвае старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Ацясаў.

Як расказаў нашаму карэспандэнту начальнік аддзела па рабоце органаў мясцовага кіравання і самакіравання Віцебскага аблвыканкама Леанід ДАРАФЕЕНКА, упершыню гэты конкурс прайшоў у 2001 годзе і ў далейшым стаў традыцыйным.

Лепшыя Саветы, установы сацыяльна-культурнай сферы атрымлівалі прызы, неабходныя для іх дзейнасці: аўтамабілі, трактары, камп'ютары, а лепшыя старэйшыны — коней, каб вяскоўцам было лягчэй апрацоўваць свае зямельныя ўчасткі.

Цяпер умовы спаборніцтва змяніліся. І лепшым замест прызоў будуць уручацца грашовыя прэміі. Вызначаць пераможцаў конкурсу сярод органаў улады ў вёсцы — лепшы сельскі, пасялковы Савет дэпутатаў; сярод органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — лепшы сельскі, пасялковы камітэт. Таксама будзе вызначаны лепшы старэйшына кожнага сельскага раёна вобласці.

Вынікі конкурсу будуць падведзены да 1 сакавіка. Памер прэміі для Саветаў і камітэтаў залежыць ад колькасці пражываючага насельніцтва і складае ад 80 да 600 базавых велічынь. Перамагчы ў конкурсе даволі складана. Трэба, каб на тэрыторыі паспяхова рэалізоўваліся абласныя і рэгіянальныя праграмы эканамічнага і сацыяльнага развіцця, патрабаванні Указа Прэзідэнта № 21 аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання, выконваліся нарматывы сацыяльных стандартаў... Будуць ацэньвацца праца па добраўпарадкаванні, стан мясцовых дарог і вуліц, палігонаў, і міні-палігонаў для складвання цвёрдых бытавых адходаў, а таксама могілак, арганізацыя работы па эканоміі і рацыянальным выкарыстанні паліўна-энергетычных і матэрыяльных рэсурсаў, арганізацыя культурных мерапрыемстваў (Дзён Саветаў, святаў вёскі інш.).

У ліку іншага членаў абласной камісіі па падвядзенні вынікаў агляду-конкурсу абавязкова зацікавіць, як у вёсцы, на тэрыторыі Савета развіваецца фізкультурна-аздараўленчая і спартыўная работа, наколькі эфектыўна дзейнічае прынцып «аднаго акна», выконваецца Закон «Аб зваротах грамадзян» і многае іншае.

Нават дэмаграфічнае становішча на адпаведнай тэрыторыі паўплывае на выбар камісіі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАТРАБУЕЦЦА РАБОТА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДЛЯ МЯСЦОВЫХ КАДРАЎ

– Скажу вам па сакрэце, нашы жанчыны — выключныя асобы. Калі чаго-небудзь моцна захочуць, то для іх няма перашкод, любую справу пацягнуць, — нечакана адхіляецца ад тэмы нашай размовы Таццяна Цітуленка. Яна, начальнік аддзела занятасці ўпраўлення райвыканкама, бадай, лепш за іншых валодае сітуацыяй наконт працаўладкавання беспрацоўных у Вілейцы.

Цітуленка свабодна аперыруе лічбамі і фактамі, без прамарудвання прыводзіць розныя прыклады, у тым ліку, на яе погляд, не зусім звычайныя. Так, яе моцна ўразіў бізнэс-план у нядаўнім мінулым беспрацоўнай жыхаркі Вілейкі Людмілы Вінцэвіч, якая вырашыла распачаць амаль з нуля ўласную справу па тэхнічным абслугоўванні і рамонце легкавых аўтамабіляў.

— І ведаеце, адкрыла майстэрню і ўжо мае кола сваіх кліентаў. І зарабляе нядрэнна — не перастае здзіўляцца Таццяна Чаславаўна.

Мы размаўляем у кабінеце старшыні Вілейскага раённага Савета дэпутатаў Яўгена Ігнатовіча, куды Таццяна Цітуленка зайшла, каб абмеркаваць папярэднія даныя аб беспрацоўі ў 2007 годзе. Яўген Антонавіч, як, дарэчы, і старшыні большасці сельскіх Саветаў раёна трымаюць гэту праблему на асабістым кантролі. У цэлым, лічыць ён, паказчыкі за мінулы год абнадзейваюць, паступова сітуацыя паляпшаецца. Узровень беспрацоўя скараціўся да 1,02 працэнта пры заданні 1,2. Агульнымі намаганнямі ўдалося стварыць на прадпрыемствах, ва ўстановах, у сферы малога бізнэсу больш за 440 працоўных месцаў. Уладкавана на пастаянную ці часовую працу амаль 500 чалавек.

Гэтыя лічбы — у значнай ступені вынік мэтанакіраванай працы мясцовай улады. Праблематыка беспрацоўя неаднойчы абмяркоўвалася на сесіі райсавета, дзе ў ходзе спрэчак выказваліся розныя прапановы. Так, дэпутат Анатоль Маркевіч узняў пытанне аб пашырэнні гандлёвай сеткі горада, а ў якасці прыкладу, дзе можна адкрыць новы магазін, назваў мікрараён, выбаршчыкаў якога ён прадстаўляе ў райсавеце. Было дадзена адпаведнае даручэнне райспажыўсаюзу. І вось крыху больш за месяц таму ў мікрараёне па вуліцы Стаханаўскай адкрылася новая крама. Назвалі яе «Верасок». Стаіць яна на бойкім месцы. У памяшканні пастаянна знаходзяцца пакупнікі, бо гандлююць тут рознымі харчовымі і прамысловымі таварамі. У выніку з'явілася некалькі працоўных месцаў.

Аднак дэпутаты, як і супрацоўнікі аддзела занятасці, далёкія ад супакоенасці. Напрыклад, Таццяна Чаславаўна акцэнтуе маю ўвагу на тым, што афіцыйныя паказчыкі зарэгістраванага беспрацоўя не зусім дакладна адлюстроўваюць яго сапраўдны ўзровень. Агульнавядома, што далёка не ўсе тыя, хто па розных прычынах страціў работу становяцца на ўлік у службу занятасці. Вельмі сціплая дапамога па беспрацоўі — каля 40 тысяч рублёў штомесяц — не самы моцны стымул для гэтага. Таму немалая частка людзей лічыць за лепшае самастойна шукаць працу, перабіваецца часовымі заробкамі. Адсюль не новая выснова — рэальны ўзровень беспрацоўя вышэйшы чым зарэгістраваны.

Свой «уклад» у такое становішча ўносяць некаторыя наймальнікі, якія прапаноўваюць работу з зарплатай на ўзроўні мінімальнага. Такія працоўныя месцы таксама мала каго вабяць і праблему не вырашаюць.

Зразумела, самы зручны і аптымальны сродак — адкрыццё новых прадпрыемстваў. У Вілейцы спрабуюць яго выкарыстоўваць. Адносна нядаўна на сесіі райсавета заслухалі справаздачу начальніка аддзела эканомікі райвыканкама аб выкарыстанні свабодных плошчаў і незанятых памяшканняў шэрагу вілейскіх прадпрыемстваў. Дэпутаты вялі размову аб неабходнасці пошуку інвестараў, якія выкупілі б гэтыя пустыя будынкі і адкрылі там новыя вытворчыя структуры. Так, летась на Вілейскім хлебазаводзе адкрыўся новы цэх пашыву спецадзення. А ў таварыстве «Камдор», якое займаецца мантажом вышак для мабільнай сувязі, з'явілася 15 новых працоўных месцаў. Ва ўласнасць інвестара — прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Электрапрамлізінг» — перайшоў будынак былога аграсэрвісу, дзе сёння мяркуецца адкрыць новае прадпрыемства, на якім у перспектыве будзе працаваць каля ста чалавек.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АДКРЫТЫ ФОРУМ

СПРАВА НЕ Ў КОЛЬКАСЦІ ГРОШАЙ...

Для органаў мясцовага самакіравання мінулы год стаў знакавым — прайшлі выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, быў падпісаны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва», пачаў работу Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання... Усё гэта не магло не адбіцца на дзейнасці мясцовых органаў улады, у першую чаргу яе пярвічнага звяна — сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў. Практычна ўвесь год яны працавалі па новых «правілах», вызначаных Указам № 21 і шэрагам іншых дакументаў, якія рэгламентуюць дзейнасць органаў мясцовай улады. Наколькі адчувальнымі былі змены на месцах? Чым запомніўся адыходзячы год кіраўнікам пярвічнага звяна ўлады? Што ў іх атрымалася і што не атрымалася? Гэтыя пытанні напярэдадні новага — 2008 года — мы па традыцыі задалі старшыням сельскіх Саветаў дэпутатаў.

Фёдар РАШЭЦКІ, старшыня Бастынскага сельскага Савета дэпутатаў Лунінецкага раёна:

— І мне, і, думаю, многім маім калегам год запомніўся тым, што быў падпісаны Указ № 21. Дзякуючы гэтаму дакументу сапраўды ўзрасла роля мясцовых органаў улады. На вырашэнне многіх пытанняў жыццезабеспячэння вясковых жыхароў пачало паступаць больш грошай. У нас сёлета ў канцы года засталося 6 мільёнаў свабодных рэшткаў, якія накіруем на грэйдаванне дарог. Увогуле на добраўпарадкаванне сельсавету на наступны год выдзелена каля 25 мільёнаў рублёў. (У 2007-м — 20 мільёнаў.) З іх трэба будзе разлічыцца за асвятленне, але і з тым, што застанецца, ужо можна працаваць.

Брэсцкімі абласнымі Саветам і выканкамам былі праведзены тры семінары, у тым ліку і на базе Лунінецкага раёна, па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Паглядзелі мы і Бярозаўскі раён, і Іванаўскі — там шмат чаму можна павучыцца ў сэнсе навядзення прыгажосці. Але сельвыканкам не можа добраўпарадкаваць кожнае прыватнае домаўладанне. Перад дэпутатамі сельскага Савета, членамі сельвыканкама і органамі грамадскага самакіравання пастаўлена задача працаваць менавіта з насельніцтвам — тлумачыць, заахвочваць лепшых і ў выніку дабівацца таго, каб нашы вёскі квітнелі. Ні раён, ні вобласць не ў стане прыбраць кожны двор, паставіць усім прыгожыя агароджы — людзі павінны рабіць гэта самі.

У адпаведнасці з Указам № 21, у прыватнасці, з артыкулам, які датычыцца збору з нарыхтоўшчыкаў дзікарослых пладоў і ягад (ён залічваецца ў бюджэт сельсавета), мы зарабілі сёлета больш за 4 мільёны рублёў. Раней гэтыя грошы ішлі ў бюджэт раёна.

Так што для нашага сельсавета ў цэлым год быў удалым.

Мікалай КАЛІНОЎСКІ, старшыня Дзітвянскага сельскага Савета дэпутатаў Лідскага раёна:

— У 2007 годзе быў вырашаны шэраг пытанняў па добраўпарадкаванні пасёлка Дзітва — пастаўлена 600 метраў агароджы на цэнтральных вуліцах, узведзена агароджа на могілках, на ўездзе ў пасёлак з'явіўся сучасны знак. А галоўнае, нам удалося спілаваць каля 70 старых аварыйных дрэў (гэта пераважна стогадовыя таполі), якія даўно непакоілі людзей. Безумоўна, рабілі мы гэта не самі — дапамог торфабрыкетны завод «Дзітва», размешчаны на нашай тэрыторыі. Спілоўваннем займалася спецыяльная брыгада, якая працавала цэлае лета. За работу мы не плацілі — завод быў зацікаўлены ў тым, каб забраць спілаваныя дрэвы сабе (прадпрыемства выкарыстоўвае драўняны вугаль). Атрымалася ўзаемная выгада.

Сёлета мы перамаглі і несанкцыянаваныя звалкі. Цяпер у пасёлку стаяць 24 кантэйнеры, а аддзяленне Лідскай ЖКГ рэгулярна вывозіць смецце.

На жаль, у 2008 год пераходзіць праблема, якая не вырашаецца гадамі. У вёсцы Дайнова з калодзежаў знікла вада — увесь водазабор ідзе на Ліду, на горад працуюць 24 свідравіны, вось і панізіўся ўзровень вады. А іншых крыніц водазабеспячэння ў Дайнове няма. Пакуль што раз на тыдзень возім туды ваду ў вялікіх ёмістасцях, напаўняем калодзежы. Але гэта не выйсце. У вёсцы неабходна правесці водаправад, паставіць калонкі — на сёння гэта самы танны спосаб вырашыць праблему.

Наталля ЯРМОЛІЧ, старшыня Тонежскага сельскага Савета дэпутатаў Лельчыцкага раёна:

— На гэтай пасадзе працую толькі год. Мой прыход супаў з выхадам Указа № 21 — таму практычна адразу аказалася з аўтамабілем. А таксама з камп'ютарамі, электроннай сувяззю, факсам і мабільным тэлефонам. Усё гэта вельмі дапамагае ў рабоце — некаторыя населеныя пункты ў нас знаходзяцца на адлегласці і 25, і 35 кіламетраў.

Вялікая работа праведзена па добраўпарадкаванні — зроблены агароджы, дзіцячыя пляцоўкі, праведзены рамонт калодзежаў... Грошы спецыяльна на добраўпарадкаванне сельсавету не выдзяляліся, але мы правялі суботнікі, а потым арганізацыі пералічылі на наш рахунак зароблены грошы — атрымалася каля 5 мільёнаў рублёў. А з новага года нам выдзяляюць дадатковую адзінку — штатнага работніка, які будзе займацца выключна добраўпарадкаваннем населеных пунктаў. (Дарэчы, такія адзінкі па рашэнні райвыканкама ўводзяцца ва ўсіх 14 сельсаветах раёна.) Работы чалавеку хопіць — на тэрыторыі нашага сельсавета размешчана 5 могілак і парк у Тонежы. Усё гэта павінна знаходзіцца ў нармальным стане.

Некалі вёска Тонеж квітнела, але ў апошні час, на жаль, моладзь ад'язджала ў іншыя месцы ў пошуку лепшай працы і заробкаў. У пачатку 2008-га ў нас пачне функцыянаваць яшчэ адно лясніцтва (чатыры ўжо ёсць), а таксама на працягу года павінен адкрыцца цэх па перапрацоўцы драўніны — жывём жа ў лясной зоне. Так што ў пачатку года з'явіцца 15 дадатковых працоўных месцаў, а да канца года — 60. Перспектыва ёсць — і гэта ўжо добра. Дарэчы, у Тонежы сёлета нарадзілася 5 немаўлят (у 2006-м — адно), а па сельсавеце — 15. І гэта, думаю, не мяжа.

Ганна СВАТКО, старшыня Грыцкевіцкага сельскага Савета дэпутатаў Нясвіжскага раёна:

— Увесь год працавалі ў асноўным па добраўпарадкаванні. У 2006-м у Грыцкевічах быў пабудаваны аграгарадок, так што цяпер за парадкам трэба сачыць. Спецыяльнай штатнай адзінкі, чалавека, які гэтым займаўся б, у нас няма — калі трэба было, бралі па дагавору. Увогуле падтрымліваць парадак дапамагае базавая гаспадарка — СВК «Грыцкевічы»: выдзяляюць транспарт для вывазу смецця, чысцяць вуліцы, якія не перададзены на баланс дарожных арганізацый, апрацоўваюць прысядзібныя ўчасткі вясковых пенсіянераў. Гаспадарка людзям і сена выдзяляе, і салому — падвозяць літаральна да ганка. Гэта вялікая справа — калі ў старшыні сельскага Савета і кіраўніка базавай гаспадаркі наладжаны трывалыя кантакты. Магчыма, дзякуючы такім кантактам, а яшчэ ўважліваму стаўленню да праблем людзей за апошнія дзесяць месяцаў ні ў раён, ні ў вобласць не паступіла ніводнай скаргі ад жыхароў нашага сельсавета.

Што пакуль не атрымалася? Не ўсюды, не на ўсіх вуліцах пакладзены асфальт — а хацелася б. Нядрэнна было б памяняць ліхтары асвятлення — мы закупілі іх толькі для адной вуліцы, а замена патрабуецца ва ўсіх вёсках. Са сваімі планамі мы наўрад ці ўпішамся ў выдзеленую на добраўпарадкаванне суму. Але, думаю, дадатковыя грошы заробім дзякуючы закупу малака ў насельніцтва — чысты прыбытак тут за апошні год склаў каля 2,5 мільёна рублёў.

Уладзімір ТАРАСАЎ, старшыня Стайскага сельскага Савета дэпутатаў Лепельскага раёна:

— Год быў у цэлым добры — у адпаведнасці з Указам № 21 сельскаму Савету выдзелілі машыну, камп'ютар, аргтэхніку... Вось завяршаем рамонт нашага адміністрацыйнага будынка — райвыканкам дапамог. Капітальна адрамантавалі магазін на цэнтральнай сядзібе — ён цяпер як супермаркет выглядае.

Ну а самае галоўнае, тры камбайнеры нашай базавай гаспадаркі «Заазер'е» (філіял Лепельскага малочна-кансервавага камбіната) сёлета ўпершыню намалацілі па 1000 тон збожжа. Сама ж гаспадарка поўнасцю тэхнічна пераабсталявалася і выйшла на добрую рэнтабельнасць.

Так што вынікамі года мы задаволеныя. Думаю, як і большасць маіх калег у цэлым па рэспубліцы. І справа не ў тым, колькі каму выдзелілі грошай. Трэба і самім крыху варушыцца, наладжваць кантакты, дамаўляцца — менавіта так мы працуем з прадпрыемствамі. Сёння сельскім Саветам ніхто не адмаўляе, такой палітыкі прытрымліваюцца і ў нас у раёне.

Скаргаў на работу службаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета і адказваюць за той ці іншы бок жыццядзейнасці людзей, сёлета практычна не паступала. Мы заўсёды плануем тое, што ў нас дакладна можа атрымацца, і не замахваемся на тое, што адназначна не атрымаецца. Не абяцаем людзям залатыя горы. Затое выконваем тое, што паабяцалі.

Наталля КАРПЕНКА.

ЛИЧНОЕ МНЕНИЕ

СОСТАВЛЯЮЩИЕ ТУРИЗМА — СОСТАВЛЯЮЩИЕ УСПЕХА

Развитие малых и средних городов сегодня является одним из государственных приоритетов. Для внедрения его в жизнь была принята соответствующая Государственная комплексная программа, предусматривающая несколько источников финансирования: бюджетные средства, деньги инвесторов и собственные средства. Каждая область, каждый регион теперь изыскивают внутренние резервы для выполнения программы.

Председатель Гродненского областного Совета депутатов Аркадий КАРПУТЬ:

– Область не стоит в стороне от выполнения программы возрождения малых городов и поселков. В нашу (областную) программу включено 30 населенных пунктов. Все организационные мероприятия проведены, кое-что удалось сделать. Безусловно, основная работа еще впереди.

Все мы прекрасно понимаем, что развитие туризма в нашей республике, в ее регионах оказывает стимулирующее воздействие на экономику, торговлю, строительство, производство товаров народного потребления. Туризм является одним из наиболее перспективных направлений деятельности органов власти на современном этапе. Значительным толчком в активизации деятельности в этом направлении стал Указ № 372 «О мерах по развитию агроэкотуризма в Республике Беларусь». Благодаря этому документу и заложенным в нем стимулирующим моментам агроэкотуризм стал реальностью в сельских регионах. В нашей области организована деятельность 27 сельских усадеб, хотя еще два года назад их было только 12. Появились очень интересные усадьбы в Лидском, Зельвенском, Гродненском, Островецком и Ивьевском районах.

Согласно Указу № 21 «О повышении роли органов местного управления и самоуправления в решении вопросов жизнеобеспечения населения» все доходы от организации сельского туризма зачисляются в бюджеты сельсоветов. То есть, председателям на местах дается возможность: ОРГАНИЗОВЫВАЙ И ПОЛУЧАЙ ДОПОЛНИТЕЛЬНЫЕ СРЕДСТВА В БЮДЖЕТ.

Несколько слов об Указе № 21. Мы, представители Советов всех уровней, инициировали принятие такого документа. Хорошо, что он принят. Не скрою, все мы думали, что в нем будет заложено достаточное бюджетное финансирование. Но жизнь и время убедительно доказали, что лишних денег нет, что позиция «дай» ни к чему хорошему не приведет. Указ № 21 дает разумную возможность по более чем десяти позициям искать и находить способы зарабатывать деньги в бюджеты сельсоветов. Значительную работу в этом направлении проводит созданный при Совете Республики Совет по взаимодействию органов местного самоуправления. Если мы вместе с председателями исполнительных комитетов сообща будем менять свои подходы, учить кадры искать дополнительные источники, то в этом случае мы сможем добиться более значимых результатов.

То же касается и сельских усадеб. Мы осознаем, что пока результат еще мизерный. Вместе с тем видим, что пришло понимание важности и необходимости организации туристической работы на местах. При желании можно найти энтузиастов, людей, которые могут и хотят этим заниматься. На недавнем заседании областного исполнительного комитета была заслушана информация по этой теме управления физической культуры, спорта и туризма, дана оценка работы отдельных руководителей районов. Особой критике подверглась медлительность в развитии придорожного сервиса. Мы осознаем, что в этом вопросе вышли на непаханное поле и нам есть над чем поработать.

Чуть подробнее хотелось бы остановиться на некоторых составляющих туристического бизнеса.

Говоря о приеме гостей, все мы прекрасно понимаем, насколько важен в этом деле уровень сервиса нашего гостиничного хозяйства. Гродненский горисполком поэтапно ведет реконструкцию двух ресторанно-гостиничных комплексов. В стадии строительства — ряд объектов придорожного сервиса. Но несмотря на это проблема все еще имеет место. Хороших гостиниц по-прежнему не хватает.

Не может удовлетворить и уровень работы гостиничного персонала. Думаю, что такое положение и в других регионах, эта проблема не только местная, но и республиканская.

Учитывая тот факт, что взаимосвязь туризма и гостиничного бизнеса требует их одновременного формирования и укрепления, было бы целесообразным ввести с 2008 года обязательную сертификацию гостиничных услуг сначала в Минске, затем в областных центрах, а следом за этим и в регионах. Большинство гостиниц не имеет даже одной «звезды», поэтому сертификация в какой-то мере подстегивала бы к принятию в этом направлении более радикальных мер. Все, кто работает в гостиничном бизнесе, говорят о разности цены для иностранца и гражданина Беларуси, приводят примеры, когда туристы начинают более активно размещаться в частном секторе, за меньшую стоимость, тем самым поощряя теневой рынок. Приезжающие к нам туристы выражают непонимание отсутствием гибкой системы оплаты в зависимости от количества дней, сезона, категории туристов.

Не соблюдается принцип «цена-качество». В целях создания благоприятных условий привлечения туристов в регионы нужно изучить возможность отмены различных тарифов в зависимости от гражданства. Было бы разумным шагом утвердить нормативный документ, касающийся политики формирования цен на услуги гостиниц.

В больших городах проблема гостиничного хозяйства не стоит так остро, как в регионах, особенно на объектах историко-культурного значения. К примеру, Мирский замок. Жители Гродненщины благодарны за огромную помощь по восстановлению этого уникального комплекса. Только в 2007 году на его реконструкцию было выделено 12,3 млрд рублей. Поток туристов ежегодно растет. Этому способствует позиция министерства культуры, республиканского телевидения. Приезжие туристы с удовольствием задержались бы здесь при наличии достаточного количества гостиничных мест, но решить эту проблему на местном уровне пока не представляется возможным.

В этом контексте было бы целесообразным министерствам ЖКХ, экономики и финансов в целях привлечения инвестиций в строительство и реконструкцию гостиниц разработать систему льготного кредитования, утвердить схему размещения новых гостиничных комплексов.

Следует упомянуть и проблему кадрового обеспечения комплекса туристического сервиса. Еще не налажена четкая система подготовки персонала, включая знание технологии обслуживания гостей в гостиничных комплексах, владение иностранными языками, информационными технологиями, психологией и этикой общения. Нет и системы повышения квалификации различных категорий персонала. Кадры НУЖНО готовить. Интересен опыт Гродненского горисполкома и государственного университета имени Янки Купалы, при котором (решением горисполкома) был открыт учебный центр «Школа туризма и гостеприимства», осуществляющий переподготовку специалистов на базе высшего образования и студентов старших курсов. Университет готовит молодых людей, способных работать менеджерами в туристических фирмах, агентствах, бюро, гостиничных хозяйствах и сфере услуг.

Еще одна составляющая турбизнеса — транспорт. Мы гордимся тем, что у нас появился отечественный автобус МАЗ, который играет большую роль в туристической деятельности. Вместе с тем руководители транспортных организаций и туристических предприятий в один голос утверждают, что из-за отсутствия комплексной системы техобслуживания наши автобусы пригодны только для эксплуатации в пределах СНГ. Транспортники выступают за рассмотрение вопроса о выделении льготных кредитов для приобретения отечественных автобусов МАЗ, но одновременно просят изучить вопрос установления для транспортных организаций, имеющих лицензию на туристическую деятельность, временного порядка ввоза автобусов туристического класса ЕВРО-2, ЕВРО-3 со сроком эксплуатации не более 10 лет при ставке таможенной пошлины по типу сопредельных с нами государств.

Благодаря усилиям областного и городского исполкомов наш центр занял призовое место по благоустройству в республике. Изменился облик многих районных центров, малых городов и агрогородков. Сохранение историко-культурного и экологического потенциала, развитие инфраструктуры туризма в интересах жителей регионов и в будущем останется одной из приоритетных задач исполнительных и распорядительных органов власти.

Подготовила Инга МИНДАЛЁВА.

ЕСТЬ ХОЗЯИН — НЕТ БЕСХОЗЯЙСТВЕННОСТИ

Печищанский сельский Совет депутатов был образован в связи с ликвидацией сельсоветов в зоне, пострадавшей от аварии на ЧАЭС, строительством поселка для переселенцев в д. Медведово на 50 домов и разделением Чирковичского сельсовета.

В состав Печищанского сельсовета вошли шесть населенных пунктов, где насчитывалось 580 подворий. На его территории располагались земли колхоза «Прогресс» (в настоящее время Светлогорский сельскохозяйственный производственный кооператив «Колхоз Прогресс»), земли птицефабрики «Восход» (в настоящее время по программе возрождения села присоединены к ССПК «Колхоз Прогресс»), земли фермерского хозяйства Зинаиды Васильевны Туз, земли Боровиковского, Светлогорского, Чирковского и Сосновоборского лесничеств, земли отделения железной дороги и других обслуживающих организаций.

В настоящее время количество подворий возросло до 608, а постоянно люди проживают в 419 из них. Благодаря слаженной работе сельского Совета и правления ССПК проведена инвентаризация земли, всех имеющихся дворов, установлены их владельцы. И в настоящее время на нашей территории нет пустующих участков и пустующих (бесхозных) домов.

Сегодня, как я уже сказал, у нас осталось одно хозяйство с наличием земли около шести тысяч гектар. В настоящее время оно работает над расширением производственной базы и созданием рабочих мест для населения. Было проведено расширение молочной фермы д. Медведово, а также ее реконструкция с переводом на беспривязное содержание коров и использование передовых технологий по доению. Современный комплекс, оснащенный новыми технологиями, работники молочнотоварного комплекса назвали чудом. Самая большая гордость — доильный зал. Когда дойка закончена, ворота автоматически открываются и буренки идут в стойла. Процесс доения контролирует компьютер, он выдает информацию и о состоянии животных. В этом году начато строительство новой фермы на 600 голов по такой же технологии. Заложен плодово-ягодный сад на площади 80 га, который уже дает урожай. Введена в строй хмелесушилка и ведется строительство хмельников. В ССПК «Колхоз Прогресс» имеются три овощехранилища общей вместимостью более четырех тысяч тонн, которые дают возможность работать с продукцией круглый год.

Средняя заработная плата в хозяйстве за 9 месяцев составила 439 тыс. рублей.

В ССПК «Колхоз Прогресс» участки под картофель для людей выделяются в общем массиве, обрабатываются централизованно, урожай убирается и доставляется на подворья. Сено и солома выделяются в готовом виде, тоже с доставкой. В магазине ССПК «Колхоз Прогресс» круглогодично можно приобрести в счет будущей оплаты или за деньги любую продукцию, производимую в ССПК (овощи, картофель, зерно, мед, молоко и т.д.).

Сельский Совет проводит работу по наведению порядка на земле и благоустройству населенных пунктов. Так, на нашей территории установлено 5,5 км металлического забора, 4 км железобетонного декоративного и более 8 км — деревянного на железобетонных столбах. На территории имеется три гражданских кладбища, и находятся они в удовлетворительном состоянии. В каждом населенном пункте оборудованы полигоны для бытовых отходов, которые еще до Указа Президента Республики Беларусь № 21 были переданы коммунальной службе. По населенным пунктам установлено 100 контейнеров для сбора мусора, сельским исполнительным комитетом регулярно проводятся обследования санитарного состояния, выдаются предписания нарушителям, составляются протоколы и принимаются административные меры.

Правление ССПК «Колхоз Прогресс» и сельский исполнительный комитет постоянно проводят работу по развитию территории и созданию дополнительных рабочих мест. Ежегодно строится и заселяется по пять и более домов усадебного типа со всеми удобствами.

Людям помогают и в ведении личных подсобных хозяйств — им предоставляются культурные пастбища, производится выдача нетелей, завозятся корма в готовом виде, оказывается помощь в обработке приусадебных участков, проводится обмен картофеля на лучшие сорта с более высокой репродукцией. На 01.01.2007 г. количество коров у населения по сельсовету сокращено на 5 % (при районном показателе в 20 %).

Через территорию Совета проходит (и сохранен) старый Екатерининский шлях, восстанавливаются хутора. Вокруг населенных пунктов созданы искусственные водоемы — летом можно покупаться и посидеть с удочкой. Создаются дополнительно условия для агроэкотуризма. Уже в ближайшем будущем это направление получит свое развитие.

Владимир СОКОЛ,
председатель
Печищанского сельского
Совета Светлогорского
района.

ПАТРАБУЕЦЦА РАБОТА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Уладзімір Палачанскі, начальнік міні-ТЭЦ, якую летась узвялі на ўскрайку Вілейкі, расказвае, што прымаліся сюды толькі мясцовыя жыхары. Хоць ТЭЦ і «міні» і працуе на мясцовых відах паліва, яна тым не менш — даволі складанае прадпрыемства, з сучасным абсталяваннем і аўтаматычным камп'ютарным кіраваннем. Адсюль і высокія патрабаванні да персаналу. Напрыклад, да спецыялістаў па ачыстцы вады, праграмістаў, машыністаў турбін. Нехта прыйшоў сюды ўжо гатовым спецыялістам, іншым спачатку давялося прайсці курсы перападрыхтоўкі ў Мінску ў вучэбным камбінаце ТЭЦ-4, затым была практыка ў Маладзечанскіх электрасетках. Але стаўка была зроблена на мясцовыя кадры. Такім чынам 25 вілейчан знайшлі сабе новую работу.

Чаму ўзровень беспрацоўя ў Вілейцы аказаўся вышэйшым, чым у сярэднім па вобласці? Да развалу Савецкага Саюза жыхары раёна ганарыліся тым, што ў райцэнтры ўзвялі завод «Зеніт». Гэта было горадаўтваральнае прадпрыемства. Сотні людзей атрымалі высокааплатную работу. Тут будаваліся шматкватэрныя жылыя дамы, дзіцячыя садкі, школы, магазіны, добраўпарадкаваліся вуліцы, была створана інфраструктура райцэнтра. Менавіта дзякуючы «Зеніту» Вілейка перастала нагадваць вялікую вёску і набыла абрысы сучаснага горада.

Але з-за розных суб'ектыўных і аб'ектыўных абставінаў прадпрыемства не знайшло сябе ў новых рынкавых умовах. У выніку шмат людзей (пераважна жанчын), якія былі заняты на зборцы апаратуры, страцілі работу. Знайсці новае месца пашчасціла далёка не ўсім. Праўда, сёння «Зеніту» зноў патрэбны кадры, але ўжо высокай кваліфікацыі. І не кожны беспрацоўны можа падысці прадпрыемству.

Стаўка была зроблена на мясцовыя кадры. Такім чынам 25 вілейчан знайшлі сабе новую работу

Таму невыпадкова ў беспрацоўя Вілейкі, гаворыць Таццяна Цітуленка, жаночы твар. Жанчыны складаюць больш за 80 працэнтаў ад усёй колькасці беспрацоўных раёна. Паводле даных на канец года, з 259 беспрацоўных, якія знаходзяцца на ўліку, 229 — жанчыны. У гэтым спецыфіка і галоўная складанасць вырашэння дадзенай праблемы, бо рынак працоўнай сілы раёна, арыентаваны пераважна на мужчын. Прадстаўнікі моцнага полу запатрабаваны на большасці прадпрыемстваў горада. Напрыклад, у тым жа аўтобусным парку і г.д.

Тым не менш, органы мясцовай улады шукаюць свае спосабы паступовай ліквідацыі беспрацоўя. Скажам, сучаснай і перспектыўнай формай работы зарэкамендавала сябе выдзяленне беспрацэнтнай бюджэтнай пазыкі тэрмінам на два гады для стварэння працоўных месцаў, уласнай справы. У прыгарадней фермерскай гаспадарцы «Чэмпіён» з'явілася 8 дадатковых працоўных месцаў. І такіх прыкладаў шмат.

Таксама эфектыўнай мерай у барацьбе з беспрацоўем сталі субсідыі, якія выдаюцца на 18 месяцаў з мэтай дапамагчы працаздольнаму энергічнаму чалавеку наладзіць свой дробны бізнэс. Перавага субсідыі ў тым, што яе не трэба вяртаць. Але, каб яе атрымаць, трэба быць зарэгістраваным як беспрацоўны і падаць у аддзел занятасці шэраг дакументаў, у тым ліку і дэтальныя прапановы па развіцці ўласнай справы, пераканаць у сур'ёзнасці сваіх намераў. Толькі летась статус індывідуальнага прадпрымальніка набылі больш за 20 жыхарак раёна. У асноўным яны спрабуюць сябе ў сферы гандлю, паслуг, бытавога абслугоўвання.

Тым беспрацоўным, якія пакуль нікуды не ўладкаваліся, органы мясцовай улады прапаноўваю падзарабіць на так званых грамадскіх работах. Удзел у іх залічваецца ў працоўны стаж. Акрамя пэўнай сумы грошай ці натуральнай аплаты бульбай, цыбуляй ці мясам, людзі атрымліваюць яшчэ і маральнае заахвочванне — лепшых запрашаюць на раённыя злёты перадавікоў вытворчасці і таксама ўзнагароджваюць.

У нашай размове са старшынёй райсавета мы гаварылі аб планах на бліжэйшую перспектыву, і аб удзеле дэпутатаў у рэалізацыі дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў на 2007—2010 гады, у якую ўключана Вілейка. Паводле слоў Яўгена Антонавіча, сёлета органы мясцовай улады, сельскія Саветы намецілі комплекс мераў, якія будуць садзейнічаць далейшаму вырашэнню гэтай складанай сацыяльнай праблемы. У першую чаргу намаганні будуць накіраваны на далейшае стварэнне працоўных месцаў, садзейнічанне дзелавой прыватнай ініцыятыве жыхароў раёна.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.
г. Вілейка.

ЗРУЧНЫ БЫТ

ЖЫЦЬ З КАМФОРТАМ

Пенсіянерка Вера Емяльянаўна Полазава жыве ў доме па вуліцы Пятрушы ў Кіраўску. Так склаўся лёс, што жанчыне выпадае самастойна наладжваць жыццё і клапаціцца пра камфорт.

— Для таго, каб тапіць печ і займацца дровамі, патрэбны сілы, якіх у мае 67 гадоў ужо не стае, — прызнаецца Вера Емяльянаўна. — Таму ў мяне даўно была задумка правесці газ.

Полазава стала ініцыятарам стварэння кааператыва і ўгаварыла сваіх суседзяў, таксама пенсіянераў. Вядома ж, справа гэта не танная, але цяпер дзяржава аплачвае 30 % кошту работ. Вера Емяльянаўна — бухгалтар са стажам, таму адразу падлічыла, што справа выгадная, а капіталаўкладанне, хоць і не адразу, але акупіцца.

— Спачатку сума падалася мне страшнай, — прызнаецца пенсіянерка. — Усё разам мне абышлося ў 5 мільёнаў рублёў. І цяпер, калі шчыра, я вельмі задаволеная. Газ таго каштуе. А грошы? Я — чалавек эканомны, ды яшчэ займаюся сваёй невялікай справай: вырошчваю ў цяпліцы расаду таматаў. Так атрымліваецца і ўнукам дапамагчы, і пра сябе паклапаціцца.

На тэрмометры ў хаце Веры Емяльянаўны — 20 градусовая. Таму трэба дабівацца, каб яна была паніжана, прычым значна.

Жыхары райцэнтра і аграгарадкоў аб'ядноўваюцца ў кааператывы, каб падвесці ў свае дамы прыродны газ

Бадай, праблема № 1 у Ветрыне — пустыя будынкі, якія не эксплуатуюцца. Пры гэтым аб'яўленая цана продажу трох з іх — 18, 36 і нават 360 мільёнаў! Хто ж іх купіць за такія вялікія грошы? А там маглі б не толькі размясціць кафэ, але і нейкую вытворчасць распачаць. Ды і Прэзідэнт гаварыў, што, будынкі, якія доўгі час не выкарыстоўваюцца, можна прадаваць па сімвалічнай цане.

Яшчэ адну праблему «падняслі» падчас сустрэчы ў школе: цяжка запісацца на прыём у гарадскую паліклініку, дзе абслугоўваюць вяскоўцаў.

— У нас у пасёлку працуе добрая паліклініка, — расказвае выбаршчыца. — Але, каб трапіць на прыём да медыкаў вузкай спецыяльнасці, трэба ехаць раніцай у горад па талон, а прыём можа быць прызначаны на канец рабочага дня. А што рабіць увесь гэты час: ехаць назад дадому альбо хадзіць па горадзе? А калі кансультацыя патрэбна падлеткам? Няўжо пра гэта медыкі не падумалі. Нельга запісацца на прыём па тэлефоне? Усякае можа здарыцца з непаўналетнімі падчас такога доўгага чакання. Хай «вузкія спецыялісты» прыязджаюць да нас часцей, а не раз у месяц. Ды і хацелася б, каб гарадскія ўрачы ставіліся да пацыентаў з вёсак з большай павагай.

Гэтыя прапановы абавязкова павінны быць разгледжаны медыцынскімі кіраўнікамі раёна і вобласці ў цэлым.

саў цяпла. Прычым, такая тэмпература паветра цяпер трымаецца пастаянная — і ўдзень, і ўначы. З печкай такога не атрымлівалася, бо дом са шлака-бетону імкліва астывае: раніцай натопіш — спякотна, а ўдзень ужо холадна. Заказваць і цягаць дровы, выносіць попел зараз не трэба. Так што газавы кацёл, усталяваны на кухні, гаспадыня дэманструе з гордасцю.

— Дзеці і ўнукі паставіліся да маёй ініцыятывы з павагай і цяпер гавораць, што я ў іх суперпередавая, — усміхаецца Полазава.

Дырэктар філіяла газазабеспячэння Кіраўскага раёна Рыгор Каранкевіч гаворыць, што такіх перадавых кліентаў, як Полазава і яе партнёры па кааператыву, у раёне хапае. Прычым не толькі ў раённым цэнтры, але і ў вёсцы.

— Да нас ідуць людзі, і сярод іх шмат састарэлых, — запэўнівае Каранкевіч. — Ніхто не адмаўляецца ад камфорту, нягледзячы на цэны на газ. Мне 70-гадовая бабуля казала: «Колькі б газ ні каштаваў, а я назад на дровы не перайду». Газ — гэта зручна. Гэта ацяпленне і гарачая вада. Людзі ў Кіраўску ўжо прыбудовы робяць да прыватных дамоў, дзе ўстанаўліваюць ванны.

Жыхары кіраўскіх вуліц актыўна ствараюць кааператывы, каб правесці ў свае дамы газ. Гэта праца, натуральна, актывізавалася пасля таго, як дзяржава ўзяла на сябе амаль трэцюю частку кошту. А мясцовая ўлада паспяшалася растлумачыць людзям, як правільна самаарганізавацца і аформіць неабходныя паперы.

Філіял газазабеспячэння Кіраўскага раёна мае сёння шмат працы. Напрыклад, кааператыў па вуліцы Мельнікава пабудаваў больш за кіламетр газаправода, і некалькі дзесяткаў абанентаў ужо карыстаюцца газам. У кааператыве «Рассвет» пабудавана 7 кіламетраў газаправода, там зарэгіструюць 75 карыстальнікаў. Па вуліцы Першамайскай у кааператыў аб'ядналіся тры пенсіянеры. Больш за паўсотні жыхароў раёна вуліцы Селішча хочуць правесці газ. Гэты спіс можна працягваць.

Цэнтр Кіраўска даўно жыве з газам, цяпер у кааператывы аб'ядноўваюцца жыхары новых вуліц і раёнаў на ўскраінах.

— Далей трэба рухацца ў вёску, — упэўнены Рыгор Каранкевіч. — Нам туды не выгадна вазіць газ у балонах: пакуль з Магілёва прывязуць, пакуль мы падвязём. І людзям чакаць нязручна. Ва ўсіх аграгарадках ёсць прыродны газ. Нам толькі трэба развіваць сеткі.

Паводле слоў газавікоў, увод газу ў дом і ўнутранае абсталяванне каштуюць прыкладна 2 мільёны рублёў. Адвод ад магістралі — яшчэ у сярэднім 2,5 мільёна рублёў. Але народ аб'ядноўваецца ў кааператывы ахвотна. Калі няма назапашаных сродкаў, банкі даюць крэдыты.

— Людзі хочуць жыць цывілізавана, — зазначае дырэктар газавай гаспадаркі Кіраўскага раёна. — І, безумоўна, моладзь падводзіць газ у першую чаргу. У праекты сваіх будучых дамоў маладыя людзі адразу закладваюць газазабеспячэнне. Проста жыццё з цягам часу мяняецца, і жыхару райцэнтра альбо вёскі хочацца жыць не грош, чым гараджаніну.

Ілона ІВАНОВА,
Кіраўскі раён.

АКВАПАРК, ЛІФТЫ Ў ХРУШЧОЎКАХ І НОВЫЯ ГАСЦІНІЦЫ

Праз некалькі гадоў у Мінску з'явяцца адразу ж 10—15 вялікіх аб'ектаў, будаўніцтва якіх чакалася з вялікім нецярпеннем. Гэта будуць зусім новыя, і па архітэктуры, і па сваёй скіраванасці і дзейнасці будынкі, комплексы, грамадскія месцы.

Хрушчоўкі застануцца. Але з рамонтам

Увогуле, у папярэдне распрацаваны генеральны план горада, магчыма, будуць унесены змяненні — сталіца расце вельмі хутка. Паводле слоў старшыні камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама, галоўнага архітэктара сталіцы Віктара Нікіціна, у наступныя некалькі гадоў колькасць квадратных метраў жылля істотна павялічыцца. Прычым новыя кватэры будуць узводзіць і пры дапамозе замежных інвестараў, і выбіраць для гэтага тэрыторыі, якія раней не былі засвоены. Ужо існуюць некалькі рэальных прапаноў:

— Сама сваімі сіламі сталіца не можа кожны год будаваць усё больш і больш жылля. Таму мы прыцягваем замежныя інвестыцыі. Напрыклад, ужо распрацаваны сумесны праект з Кітаем. У якасці пляцоўкі для выкарыстання капіталу з гэтай краіны, яе праектных і будаўнічых магутнасцяў разглядаецца частка раёна Лябяжы. Мяркуецца, што кітайскія кампаніі ўзвядуць там 150 тысяч квадратных метраў жылля.

Адначасова, у лютым, пачнецца рэканструкцыя пяціпавярховых хрушчовак. У кожным сталічным раёне будзе праведзена выпрабавальная мадэрнізацыя аднаго квартала такіх дамоў. Пасля вывучэння вопыту суседніх сталіц — Кіева і Масквы — сталічныя ўлады распрацавалі праекты, згодна з якімі будуць цалкам заменены інжынерныя камунікацыі дамоў, зроблены капітальны рамонт у пад'ездах, нават магчымыя надбудовы верхніх паверхаў і з'яўленне ліфтаў.

— Зносіць хрушчоўкі мы не будзем. Таксама мы пераканаліся ў тым, што пашыраць кухні, што-небудзь мяняць у кватэры немагчыма. У дамах, якія пабудаваны ў 60-х гадах мінулага стагоддзя, вельмі «цвёрдае» размяшчэнне апорных канструкцый. Таму ўсе праекты наконт таго, каб цалкам перарабляць кватэры, з'яўляюцца не больш чым фантазіяй, — адзначыў В. Нікіцін.

Пад шклом аквапарка...

Шчыра кажучы, аквапарк мінчане чакалі вельмі даўно. Раней была агучана ідэя аб яго стварэнні ў парку экстрэмальных забаў, які размешчаны на вуліцы Арлоўскай. Існавала думка аб яго ўзвядзенні і на тэрыторыі спартыўна-аздараўленчага комплексу «Алімпійскі», што на вуліцы Сурганава. Зараз, паводле інфармацыі Віктара Нікіціна, ужо накіравана праектная прапанова «буйной і вядомай фірме з Вялікабрытаніі». Таму, хутчэй за ўсё, зараз аквапарк усё ж такі пачнуць будаваць. Магчымая яго плошча складзе 15 тысяч квадратных метраў. Галоўны архітэктар сталіцы распавядае:

— Усе аб'екты будуць змешчаны пад шкляным дахам. Будзе адкрыты басейн, разнастайныя горкі, прадугледжана магчымасць карыстацца забавамі ў аквапарку не толькі летам, але і зімой. Людзі будуць вылятаць са шкляных трубаў, пралятаць над снегам і ўлятаць у басейн. Комплекс водных забаў павінен адпавядаць еўрапейскаму ўзроўню і мець статус рэспубліканскага.

Ужо падрыхтаваны і праект комплекснай рэканструкцыі праспекта Пераможцаў. Па ўсёй яго працягласці не толькі з'явяцца новыя аб'екты, але і будуць знесены некаторыя састарэлыя. Дакладней, на месцы інтэрната Белдзяржуніверсітэта запланавана пабудаваць гандлёва-адміністрацыйны комплекс. План закранае тэрыторыю ад плошчы Свабоды да МКАД. Ажыццёвіцца рэканструкцыя гасцініцы «Беларусь», у раёне водасховішча «Дразды» з'явіцца цэнтр мастацкай гімнастыкі і воднаспартыўны комплекс.

Гасцінічны бум?

Пачатак для будаўніцтва адразу ж некалькіх гасцініц, якія стануць самымі лепшымі ў краіне па ўзроўню абслугоўвання і камфорту пражывання, таксама будзе дадзены ў 2008 годзе. У раёне Кастрычніцкай плошчы, побач з музеем Вялікай Айчыннай вайны, плануецца пабудаваць гасцініцу вядомай сусветнай сеткі «Кемпінскі». Эскізны праект, які ўключае кангрэс-хол і вялікую колькасць гандлёвых пунктаў, ужо зацверджаны.

Акрамя таго, іранская кампанія выступіла інвестарам праекта адміністрацыйнага, гасцінічнага і адначасова дзелавога комплексу ў раёне Нацыянальнай бібліятэкі. Ён ацэньваецца Віктарам Нікіціным як «унікальны» і каштуе каля 120 мільёнаў еўра.

Гасцініцы ў 25—27 паверхаў будуць высіцца пасля ажыццяўлення плана па рэканструкцыі стадыёна «Дынама». Для гэтага задзейнічаюць фінансавыя сродкі з Арабскіх Эміратаў. А яшчэ да 2011 года, да таго часу, як скончыцца рэканструкцыя праспекта Дзяржынскага, там будуць пабудаваны яшчэ тры новыя гасцініцы. Акрамя таго, разглядаюцца і варыянты па пераразмеркаванні транспартных суязяў. Не выключана, што МКАД стане чацвёртым транспартным кальцом, а ў якасці перспектывы можа з'явіцца і пятае.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

АБРАБАВАЛІ ХРАМ

У адзін з вечароў перад Калядамі невядомыя рабаўнікі спрабавалі залезці ў краму райспажыўсаюза ў вёсцы Хадзявічы Слонімскага раёна. Ажыццявіць злачынны намер ім перашкодзіла мясцовая жыхарка.

Жанчына ішла вечарам па вуліцы і ўбачыла, як нейкія асобы спрабуюць сарваць замкі з дзвярэй крамы. Кабета хутка звярнула на другую вуліцу і патэлефанавала ў міліцыю. Ахоўнікі правапарадку ўжо праз пяць хвілін былі на месцы. Зламыснікі не паспелі сарваць з дзвярэй замкі. Аднак самім ім удалося ўцячы.

Прыкладна ў гэты ж час злодзеі пагаспадарылі і ў суседняй з Хадзявічамі вёсцы Сынковічы. Са знакамітага храма, які летась восенню адзначыў свой 600-гадовы юбілей, начныя рабаўнікі забралі ахвяраванні прыхаджанаў: два пярсцёнкі з каштоўнымі камянямі, каля аднаго мільёна беларускіх рублёў і сто долараў ЗША.

Сяргей ЧЫГРЫН.

ЛЮДЗІ ВЫКАЗАЛІСЯ...

Наш карэспандэнт пабываў у Полацкім раёне і, як кажуць, на месцы пазнаёміўся з праблемамі, пра якія шчыра расказалі мясцовыя жыхары.

Калі гарадскія вучацца ў вёсцы?

Хочацца адзначыць, што ў гэтую камандзіроўку я адпраўлялася, дзякуючы маладому дэпутату віцебскага абласнога Савета Руслану Вінакураву — першаму сакратару абласнога камітэта БРСМ, які паехаў на Полаччыну, каб сустрэцца з выбаршчыкамі. Думаю, што работа нашага «дэпутацка-журналісцкага дэсанта» была даволі эфектыўнай.

Полацкі дзяржаўны прафесійны ліцэй сельскагаспадарчай вытворчасці знаходзіцца ў гарадскім пасёлку Ветрына. Тут вучаць будучых трактарыстаў-машыністаў сельскагаспадарчага профілю, вадзіцеляў, электраманцёраў, швачак, касіраў, гандляроў і інш. Усяго больш за 430 навучэнцаў, большасць з якіх хлопцы.

— Многія (працэнтаў 30) ездзяць штодзень на вучобу з суседніх Полацка і Наваполацка. Білет у адзін бок на праезд у аўтобусе каштуе 2400 рублёў. Вось і падлічыце, колькі каштуе ў месяц дарога да вучобы, — расказваюць мне і дэпутату настаўнікі. — У сувязі з адменай ільгот хочацца спадзявацца, што, калі яны будуць вызначацца па новай сістэме, каб была магчымасць улічыць гэты важны момант. Думаецца, што наша сітуацыя ў гэтым сэнсе ўнікальная. Безумоўна, навучэнцы-гараджане могуць жыць у нашым вялікім інтэрнаце, дзе месца хопіць на ўсіх, але ж нават самыя лепшыя інтэрнацкія ўмовы нельга параўноўваць з хатнімі.

— Чаму ў Ветрыне не працуе кафэ? — цікавіцца адзін з выкладчыкаў. — Прабачце, але няўжо ў спажывецкай кааперацыі не разумеюць, што ў такім вялікім пасёлку кафэ проста неабходна?

Ну, хоць бы сталовую!

У Ветрынскай сярэдняй школе болей за 350 вучняў. Настаўніца таксама паскардзілася на адсутнасць кафэ: «Прыкладна два гады таму яно ў нас закрылася. А як было б добра, калі б працаваў свой кандытарскі цэх, дзе можна было той жа торт заказаць. Калісьці ў пасёлку працавалі адначасова і дзіцячае кафэ, і дарослае. А зараз нават сталовай няма. Дзе спраўляць вяселлі, святы ды і памінкі?..

Як растлумачыў Руслан Вінакураў, гэта праблема павінна быць абавязкова вырашана. Будынак кафэ знаходзіцца ва ўласнасці рэспубліканскай арганізацыі. Цана продажу будынка на аўкцыёне нерэальна высокая. Таму трэба дабівацца, каб яна была паніжана, прычым значна.

Бадай, праблема № 1 у Ветрыне — пустыя будынкі, якія не эксплуатуюцца. Пры гэтым аб'яўленая цана продажу трох з іх — 18, 36 і нават 360 мільёнаў! Хто ж іх купіць за такія вялікія грошы? А там маглі б не толькі размясціць кафэ, але і нейкую вытворчасць распачаць. Ды і Прэзідэнт гаварыў, што, будынкі, якія доўгі час не выкарыстоўваюцца, можна прадаваць па сімвалічнай цане.

Яшчэ адну праблему «падняслі» падчас сустрэчы ў школе: цяжка запісацца на прыём у гарадскую паліклініку, дзе абслугоўваюць вяскоўцаў.

— У нас у пасёлку працуе добрая паліклініка, — расказвае выбаршчыца. — Але, каб трапіць на прыём да медыкаў вузкай спецыяльнасці, трэба ехаць раніцай у горад па талон, а прыём можа быць прызначаны на канец рабочага дня. А што рабіць увесь гэты час: ехаць назад дадому альбо хадзіць па горадзе? А калі кансультацыя патрэбна падлеткам? Няўжо пра гэта медыкі не падумалі. Нельга запісацца на прыём па тэлефоне? Усякае можа здарыцца з непаўналетнімі падчас такога доўгага чакання. Хай «вузкія спецыялісты» прыязджаюць да нас часцей, а не раз у месяц. Ды і хацелася б, каб гарадскія ўрачы ставіліся да пацыентаў з вёсак з большай павагай.

Гэтыя прапановы абавязкова павінны быць разгледжаны медыцынскімі кіраўнікамі раёна і вобласці ў цэлым.

І нават... казіно

Ветрына калісьці быў райцэнтрам (Ветрынскі раён ліквідаваны ў 1960-м). Дзякуючы рэалізацыі дзяржаўнай праграмы развіцця малых гарадоў такія населеныя пункты могуць атрымаць добрыя перспектывы. Нагадаю, праграма разлічана да 2010 года, значыць чакаць давядзецца нядоўга.

Скажам, у будынку былога магазіна энтузіясты мараць адкрыць... выставачную залу. Знайшліся інвестары з-за мяжы, якія гатовы ўкласці вялікія грошы ў стварэнне на базе былога ваеннага гарадка ўнікальнага забаўляльнага комплексу для адпачынку — з гатэлем і рэстаранам. Нават казіно плануюць пабудаваць. Побач — старажытны Полацк, прырода цудоўная, пры добрай рэкламе турыстаў будзе шмат. Тым больш што паспяхова пачаў рэалізоўвацца міжнародны праект «Дзвіна — Даўгава», які актыўна рэкламуецца ў скандынаўскіх краінах.

Усяго ў Ветрыне ў бліжэйшыя гады будуць рэалізаваны тры інвестыцыйныя праекты. Асабіста кіраўнік райвыканкама дапамагае вырашыць лёс будынкаў, якія пакуль што зачынены на замок.

Зарплату чакаем доўга

Супрацоўнікі Фарынаўскага ўчастка Ветрынскага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі паскардзіліся на тое, што доўга даводзіцца чакаць зарплату.

— Я працую дворнікам, на 1,5 стаўкі зарабляю 250 тысяч рублёў у месяц, — вельмі эмацыянальна расказвае жанчына. — Зарплату атрымліваю цалкам, але з вялікай затрымкай. Чаму не выплачваюць яе два разы ў месяц і своечасова? Тэлефон жа, калі не заплаціш за яго ў тэрмін, адключаць адразу.

Раней працаваў у Фарынаве завод дома-будаўнічага камбіната. Даўно было вырашана аб'явіць прадпрыемства банкрутам,ды працэс зацягнуўся. Гэта праблема, з-за якой немагчыма знайсці новага гаспадара, будзе вырашацца.

У мясцовым дзіцячым яслях-садку выбаршчыкі паскардзіліся на адсутнасць магазіна прамысловых тавараў. І яшчэ пацікавіліся: няўжо нельга зрабіць, каб гарачая вада падавалася часцей, а лепш — заўсёды. Каб без праблем можна было хоць бы рукі дзецям памыць. Дзіўна, што пра нізкія заробкі супрацоўніцы адкрыта не гаварылі. А яны вельмі мала зарабляюць. Безумоўна, ужо на рэспубліканскім узроўні трэба пастарацца падняць пытанне павышэння заробкаў тых, хто выхоўвае нашу будучыню — дзяцей!

* * *

За адзін дзень давялося пабываць у некалькіх месцах. Пра ўсё напісаць — не хопіць газетнай старонкі. Галоўная выснова: людзі даўно чакаюць перамен і канкрэтных рашэнняў сваіх праблем. Напрыканцы паездкі дэпутат падзяліўся спісам пытанняў і заўваг выбаршчыкаў са старшынёй райвыканкама. Будуць разам «прабіваць» складаныя тэмы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Полацкі раён — Віцебск.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
МАЛАФЕЕЎ А. А.,
старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовому самакіраванню;
САСОНКА М. П.,
старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцовому самакіраванню і рэгламенту;
СЯЛІЦКІ В. С.,
старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;
СІВАКОЎ В. А.,
старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;
ЯРКОВІЧ В. І.,
старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:
Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292 21 03.

Спіс

юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяюць дзейнасць, звязаную з працаўладкаваннем грамадзян Рэспублікі Беларусь за мяжой на 26 снежня 2007 года

№ п/п	№ ліцэнзіі тэрмін дзеяння	Назва юрыдычнай асобы, прозвішча, імя, імя па бацьку ІП	Нумар тэлефона	Юрыдычны адрас	Дзяржава працаўладкавання	Спецыяльнасць
1.	02010/0200579 24.06.2005—24.06.2010 унесены змяненні 02010/0200958 да 24.06.2010	Грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» (філіялы: абласныя камітэты грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» ў Брэсце, Віцебску, Гродне, Гомелі, Мінску, Магілёве, Мінскі гарадскі камітэт грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»)	222 31 87 222 33 77	г. Мінск, вул. К. Маркса, 40	Расія	студэнцкія атрады
2.	02010/0200581 29.07.2005—29.07.2010	Таварыства з дадатковай адказнасцю «Маладзёжны цэнтр «Штаб студэнцкіх атрадаў»	8 0222 22 83 00	г. Магілёў, вул. Ленінская, 68	Чэхія	рабочыя ў лясной гаспадарцы
3.	02010/0200592 12.08.2005—12.08.2010	Інфармацыйна-рэкламнае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Вілената»	296 64 53	г. Мінск, вул. Някрасава, 7—105	Расія ААЭ Чэхія	будаўнікі абслуговы персанал рабочыя спецыяльнасці
4.	02010/0200601 02.09.2005—02.09.2010	Прыватнае ўнітарнае вытворча-камерцыйнае прадпрыемства «Арцель»	36 47 80	г. Віцебск, вул. Маякоўскага, 13	Польшча	будаўнікі
5.	02010/0200602 02.09.2005—02.09.2010	Індывідуальны прадпрымальнік Нікалаевіч Алена Вікенцьеўна	52 09 77	г. Гродна, вул. Гарнавых, 5	Расія	будаўнікі
6.	02010/0200605 02.09.2005—02.09.2010 унесены змяненні 02010/0200801 да 02.09.2010	Грамадскае аб'яднанне «Інфармацыйна-кансультацыйная служба» «Юнверс»	288 61 59	г. Мінск, вул. В. Харужай, 3-606 А	ЗША ЗША	абслуговы персанал на круізных лайнерах праца для студэнтаў у час летніх канікулаў
7.	02010/0200609 02.09.2005—02.09.2010	Установа адукацыі «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі»	227 12 06	г. Мінск, вул. Кірава, 16	Расія ЗША Вялікабрытанія	памочнік менеджара праца для студэнтаў у час летніх канікулаў студэнцкія праграмы (с/г работы)
8.	02010/0200610 02.09.2005—02.09.2010 унесены змяненні 02010/0338040 да 02.09.2010	Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Карал Круіз Сэрвіс»	254 78 15 254 78 13	г. Мінск, вул. Цімірязева, д. 65Б, 6-ы паверх памяшканне 115 (офіс нумар 610)	Літва ЗША Польшча	вадзіцелі, прадаўцы, швачкі абслуговы персанал на круізных лайнерах праца ў сферы суднавытворчасці
9.	02010/0200611 02.09.2005—02.09.2010 унесены змяненні 02010/0338019 да 02.09.2010	Турыстычнае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Интурбюро»	201 34 55	г. Мінск, пр. Пераможцаў, 11—1208	Расія Чэхія Чэхія Літва	будаўнікі рабочыя ў лясной гаспадарцы рабочыя на мясакамбінаце рабочыя завода па вытворчасці поліэтылену
10.	02010/0200617 23.09.2005—23.09.2010	Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Стар Травел»	232 61 83 287 26 06	г. Мінск, вул. Старавіленская, д. 100, пак. 436	Расія ЗША	спецыялісты ў галіне транспартнай лагістыкі і аўдытарскай дзейнасці студэнцкія праграмы
11.	02010/0200994 27.04.2007—27.04.2012	Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Феліксбуд»	226 01 03	г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 21а, пак. 2	Расія	будаўнікі
12.	02010/0200628 21.10.2005—21.10.2010 унесены змяненні 02010/0200660 да 21.10.2010	Сумеснае прадпрыемства «Цэнтр маладзёжных падарожжаў» ТАА	293 17 49	г. Мінск, вул. Варвашэні, 17—101	ЗША	абслуговы персанал (праца для студэнтаў)
13.	02010/0200629 21.10.2005—21.10.2010	Сэрвіснае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Джэтэкспа»	206 67 57	г. Мінск, вул. Старажоўская, д. 8 — 4 п	Вялікабрытанія Вялікабрытанія Літва	памочнік па доглядзе студэнцкія праграмы (с/г работы) рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў
14.	02010/0200630 21.10.2005—21.10.2010	Адкрытае акцыянернае таварыства «Нафтазаводмантаж»	59 82 93	Віцебская вобласць, г. Наваполацк	Расія	будаўнікі
15.	02010/0200631 21.10.2005—21.10.2010	Індывідуальны прадпрымальнік Яцэнка Ала Аляксандраўна	20 07 56	г. Брэст, вул. Кірава, 50—71	Расія	будаўнікі
16.	02010/0200644 18.11.2005—18.11.2010	Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «РАЙЕТ-плюс»	36 58 23	г. Віцебск, вул. Леніна, 3а	Расія ЗША	персанал дзіцячага санаторыя ў г. Анапе праца для студэнтаў у час летніх канікулаў
17.	02010/0200648 02.12.2005—02.12.2010	Турысцкае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Лінгва Тур»	281 73 73	г. Мінск, пр. Незалежнасці, д. 58, корп. 9, пак. 301	Расія Германія	спецыялісты па вытворчасці і продажы тэкстыльных вырабаў праграма ОПЭР
18.	02010/0200650 23.12.2005—23.12.2010	Індывідуальны прадпрымальнік Драбышэўскі Дзмітрый Іванавіч	56 37 75	г. Гомель, вул. Галавацкага, 18	Расія	будаўнікі
19.	02010/0200653 23.12.2005—23.12.2010 унесены змяненні 02010/0200957 да 23.12.2010 г.	Замежнае прыватнае ўнітарнае будаўніча-гандлёвае прадпрыемства «Нафтабуд Сэрвіс» Фіскіна А.	50 45 66	г. Гомель, вул. Рабочая, 16, 1-ы паверх	Расія	дарожныя будаўнікі
20.	02010/0200656 13.01.2006—13.01.2011 унясенне змяненняў 02010/0200901 да 13.01.2011	Рэспубліканская маладзёжная грамадская арганізацыя «Ліга добраахвотнай працы моладзі»	284 08 81	г. Мінск, вул. Б. Хмельніцкага, д. 4	Расія	персанал дзіцячага аздараўленчага лагера ў г. Анапе
21.	02010/0200664 10.02.2006—10.02.2011 унесены змяненні 02010/0200725 да 10.02.2011	Прыватнае турыстычнае ўнітарнае прадпрыемства «Лідар-Тур»	227 62 46	г. Мінск, вул. К. Маркса, 16—44	Расія	будаўнікі
22.	02010/0200671 03.03.2006—03.03.2011 унесены змяненні 02010/0200945 да 03.03.2011	Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Белэсттрэйд»	32 72 71	г. Магілёў, вул. Першамайская, д. 97, пак. 80.	Эстонія	будаўнікі
23.	02010/0200689 07.04.2006—07.04.2011	Замежнае прыватнае ўнітарнае кансалтынгавае прадпрыемства «Латвійскі Цэнтр Міжнароднага Абмену» грамадскай арганізацыі «Цэнтр Міжнароднага абмену»	203 70 19 226 79 24	г. Мінск, пр. Пераможцаў, д. 1, к. 40а	ЗША	студэнцкія праграмы
24.	02010/0200690 07.04.2006—07.04.2011 унесены змяненні 02010/0200912 да 07.04.2011	Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Кампара Плюс»	203 60 15	г. Мінск, вул. Мірашнічэнкі, 21, пак. 21	Расія	будаўнікі
25.	02010/0200691 07.04.2006—07.04.2011	Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Дыскаверы»	256 15 27	г. Мінск, вул. Кальварыйская, д. 33, пак. 228	Вялікабрытанія Швецыя	студэнцкія праграмы (с/г работы) збор лясных ягад
26.	02010/0200693 07.04.2006—07.04.2011 унесены змяненні 02010/0200916 да 07.04.2011	Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЭВІ груп»	287 68 65	г. Мінск, вул. Мележа, д. 5, корп. 1, пак. 235	ЗША	студэнцкія праграмы (абслуговы персанал)
27.	02010/0200741 30.06.2006—30.06.2011	Таварыства з абмежаванай адказнасцю «КТЛ»	285 38 58	г. Мінск, вул. Чапаева, 5—228	Расія	вадзіцелі па міжнародных перавозках
28.	02010/0200760 21.07.2006—21.07.2011	Мантажна-наладачнае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белэлектрамантажналадка»	226 81 05	г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 8	Расія	будаўнікі ГЭС
29.	02010/0200810 29.09.2006—29.09.2011	Прыватнае кадравае ўнітарнае прадпрыемства «ІВР»	32 46 17	Брэсцкая вобл., г. Пінск, вул. Іркуцка-Пінскай дывізіі, д. 36, п. 209	Расія	рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў
30.	02010/0200841 27.10.2006—27.10.2011	Таварыства з дадатковай адказнасцю «ЯВІКА»	37 05 14	г. Віцебск, вул. Калініна, 14а, офіс 1а	Расія ЗША	дызайнеры-архітэктары, праекціроўшчыкі, агенты па аптовым гандлі праца для студэнтаў у час летніх канікулаў
32.	02010/0200861 23.11.2006—23.11.2011	Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЛігаБудСэрвіс»	77 66 44 77 55 19	г. Гомель, вул. Жаркоўскага, д. 11, каб. 3—13	Расія	рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў
33.	02010/0200906 12.01.2007—12.01.2012	Індывідуальны прадпрымальнік Чарняўскі Андрэй Якаўлевіч	5 53 66	г. Дзяржынск, вул. Тургенева, 16—38	Расія	рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў
34.	02010/0200922 16.02.2007—16.02.2012	Індывідуальны прадпрымальнік Бандарэц Алена Віктараўна	50 91 19	г. Гомель, 8-я Іншагародняя, д. 2/17, кв. 54	Расія	кандытары, механікі, наладчыкі
35.	02010/0200923 16.02.2007—16.02.2012	Адкрытае акцыянернае таварыства «Электрацэнтрмантаж»	212 50 29	г. Мінск, прамзона «Заходняя», вул. Мантажнікаў, 37	Расія	мантажнікі і наладчыкі абсталявання ГЭС
36.	02010/0200952 16.03.2007—16.03.2012	Прыватнае сэрвіснае ўнітарнае прадпрыемства «Міжнароднае інфармацыйнае агенцтва занятасці моладзі і студэнтаў»	782 07 80	г. Гродна, вул. Сакалоўскага, 20	Вялікабрытанія	праца для студэнтаў у час канікулаў на с/г фермах
37.	02010/0338010 11.05.2007—11.05.2012	Індывідуальны прадпрымальнік Жук Валерый Георгіевіч	46 07 64	г. Брэст, вул. Лучынскага, д. 15/1	Рэспубліка Польшча	рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў
38.	02010/0338021 01.06.2007—01.06.2012	Вытворчае ўнітарнае прадпрыемства Пелуця Зігмунта Казіміравіча «Паланійны цэнтр бізнэсу і турызму» г. Гродна	73 17 43 74 56 49	г. Гродна, вул. Будзённага, 48а	Расія	рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў
39.	02010/0338037 15.06.2007—15.06.2012	Таварыства з дадатковай адказнасцю «Дарыко і К»	7 18 91 4 57 39	г. Маладзечна, вул. В. Гасцінец, 40, пак. 14	Расія	рабочыя будаўнічых спецыяльнасцяў
40.	02010/0338057 29.06.2007—29.06.2012	Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Студыя моды Сяргея Нагорнага»	209 95 90	г. Мінск, зав. Дамашэўскі, 9—409	Украіна	дэманстратары адзення, фотамадэлі
41.	02010/0338074 03.08.2007—03.08.2012	Індывідуальны прадпрымальнік Сакадын Сяргей Іванавіч	21 37 89	г. Брэст, вул. Кірава, 91—22	Чэшская Рэспубліка	электрамеханікі
42.	02010/0338075 03.08.2007—29.06.2012	Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Транслейборыдж»	226 73 28	г. Мінск, пр. Пераможцаў, д. 31, пак. 328	Каралеўства Нідэрланды	праграмісты
43.	02010/0338088 03.08.2007—03.08.2012	Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ІММО-ТРАСТ»	226 00 24	г. Мінск, зав. Казарменны, д. 4, офіс 14	Германія	праграмісты

Інфармацыя прадастаўлена Дэпартаментам па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

СВАЯ СПРАВА
4 8 1
БІЗНЭС, ЭКАНОМІКА, ФІНАНСЫ

Выпуск № 1 (12)
9 студзеня
2008 года

САБАЛЕЎШЧЫНСКІ «ТРОХКУТНІК»

Калядныя прыгоды на хутары паміж двума азёрамі і Віктосевай крынічкай

У самую містычную пару, на мяжы двух гадоў, кожны з нас прагне накіравацца ў край сваіх дзіцячых мараў, дзе казачнае і будзённае жывуць у арганічным адзінстве. Усе пачынаюць усур'ёз верыць у цуды, а, як вядома, калі нечага вельмі захацець, яно абавязкова збудзецца. Адчуў уплыў гэтай магічнай «формулы» на сабе, накіраваўшыся ў падарожжа ў дзіўны час, калі самы маленькі дзень і самая доўгая ноч. Імкнуўся адшукаць той самы запаветны куток, дзе шалёны рытм сучаснасці, здаецца, запавольвае хаду, час амаль спыняецца і ты сапраўды пачынаеш жыць — раптам заўважаеш харство наваколля, узіраешся ў зорнае неба і адчуваеш сябе абсалютна шчаслівым…

Станіслава АСТРОЎСКАЯ заўсёды рада гасцям.

Усё толькі пачынаецца

У Нарачанскім краі шмат маляўнічых мясцін, нездарма ж гэтая тэрыторыя лічыцца сярод турыстаў адной з найбольш прывабных для адпачынку. Тут размешчаны шматлікія санаторыі і базы, якія наведваюць не толькі беларусы, але і замежныя госці (якіх, дарэчы, апошнім часам становіцца ўсё больш). Бадай, самая вядомая тутэйшая «фішка» — возера Нарач. Але не толькі гэтая адметнасць прыцягвае вялікую ўвагу, акрамя беларускага «мора» тут ёсць чаму здзіўляцца. Прычым самыя нечаканыя адкрыцці здараюцца ў звычайных на першы погляд месцах.

Літаральна ў ваколіцах Мядзела размясціўся хутар Сабалеўшчына. Нават у даваенныя часы тут было сем хат, а цяпер дык і ўвогуле тры засталося, у якіх некалькі жыхароў. Пры выездзе з райцэнтра паварочваеш направа і адразу апынаешся ў тыповым вясковым асяроддзі — вулачка, уздоўж якой некалькі дамоў. Аднак патрэбны падворак так адразу і не знойдзеш, толькі з вопытным «гідам» яго магчыма адшукаць. Але гасцей ужо чакаюць, і па стромкай сцяжынцы спускаемся да сядзібы. Абапал — сосны і бярозы, а пры падыходзе — вялізны камень, які парос ізумрудным мохам. Ну чым не пачатак падарожжа ў госці да казкі?

Зверху, з галоўнай вясковай «стрыт» падворак амаль не прыметны, аднак адпаведны маршрут паспелі ўжо вывучыць многія. Справа ў тым, што пэўны час таму тут з'явілася аграсядзіба «Крынічка». Месца вельмі прыдатнае для арганізацыі адпачынку. Напэўна, менавіта так разважала і Станіслава Астроўская, калі пачала збіраць дакументы для рэгістрацыі сваёй справы. У яе нарэшце з'явілася магчымасць паказаць усім ахвотнікам родныя мясціны — як лічыць гаспадыня сядзібы, гэта проста ўнікальны куток некранутай, шыкоўнай прыроды. Станіслава Станіславаўна нарадзілася тут і да заканчэння школы жыла разам з бацькамі ў мілай яе сэрцу Сабалеўшчыне. Пасля яна паступіла на біяфак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і далейшы свой лёс звязала са сталіцай. Выкладала хімію і біялогію ў фінансава-эканамічным, а таксама ў гандлёвым каледжы. Як выйшла на пенсію, то без усялякіх ваганняў і развагаванняў адразу паімчала на свой хутар. З верасня 2001 года Астроўская пастаянна жыве менавіта ў Сабалеўшчыне.

— Мая душа тут увесь час знаходзілася, — кажа Станіслава Станіславаўна. — Калі прыязджала сюды (а імкнулася пабываць ледзь не кожныя выхадныя), то выходзіла з аўтобуса і літаральна бегла да бацькоўскай хаты. Таму што хацела хутчэй патрапіць дадому, а ў Мінск вярталася ўжо з зусім іншымі пачуццямі. Сваё жыццё ў сталіцы ўспрымала як абавязак, такую своеасаблівую доўгую камандзіроўку. Таму менавіта цяпер для мяне ўсё пачынаецца, я вярнулася туды, дзе заўсёды хацела знаходзіцца.

Калі слухаеш гаспадыню «Крынічкі», то цябе захопліваюць прыкладна такія ж пачуцці і пачынаеш па-асабліваму ўзірацца ў наваколле. Нетаропкае хутарское жыццё ўсё больш прываблівае стомленага цывілізацыяй гараджаніна. Тут сапраўды дыхаецца лягчэй і, не паверыце, таксама здаецца, што ўсё толькі пачынаецца.

На елку — па... грушы

Калі шэсць з лішкам гадоў таму Астроўская вярнулася ў бацькоўскую хату, то ў яе адразу ўзнікла вялікае жаданне заняцца абуладкаваннем сядзібы. І не сказаць, што нешта тут Станіславу Станіславаўну не задавальняла, аднак хацелася яшчэ больш падкрэсліць асаблівасць гэтых мясцін. Так пенсіянерка Астроўская стала прыватнікам, пазычыла значную суму ў родных (па-першае, такі крэдыт беспрацэнтны, а, па-другое, які банк з ёй супрацоўнічаў бы і пачала ўсё даводзіць да ладу.

— Спачатку былі нейкія ідэі наконт сваёй справы ў сферы турыстычнага сэрвісу, а як пачула пра аграгурызм, то цвёрда вырашыла: трэба менавіта гэтым і займацца, — узгадвае Станіслава Станіславаўна. — Пенсіі ж у былых настаўнікаў самі ведаеце якія, трэба падзарабляць на жыццё. А тут вельмі ўжо накірунак перспектыўны, я на працы была першай, таму і цяпер да новага імкнуся, тым больш што такія сядзібы для гасцей нашага краю заўсёды вельмі дарэчы. Галоўнае — стварыць добрыя ўмовы для адпачынку і людзі гэта ацэняць. Упэўнена, што ў такіх маленькіх «баз адпачынку» вялікая будучыня.

Спатканне з хутарам Сабалеўшчына і яго руплівай гаспадыняй — сапраўдная прыгода, паколькі ў наш рацыянальны, меркантыльны час усё тут здзіўляе. Недаверліва пазіраеш на гасцей галоўны ахоўнік сядзібы — сабака Кузя. Ён хоць і «чыстапародны» дварняк, але ж службу сваю добра ведае: ні за якія шашлыкі да дому гаспадароў турыстаў не падпусціць. Кузя заўсёды адсочвае інтанацыю, з якой Станіслава Станіславаўна з наведвальнікам размаўляе, і ў залежнасці ад сітуацыі дзейнічае. Калі забрыдуць на падворак няпрошаныя госці, то доўга яны тут не затрымаюцца — звычайна лагодны Кузя ў такіх выпадках вельмі злосным становіцца.

Вакол сядзібы разрослася вялікі сад — каля сямі дзесяткаў толькі яблынь і груш, таксама адных толькі сліў восем гатункаў і шмат чаго яшчэ. Бацька Станіславы Станіславаўны быў апантаным селекцыянерам-аматарам, усёй акрузе дапамагаў. Ён стварыў проста ўнікальныя гатункі, вартыя ўвагі і захаплення. Напрыклад, у старым садзе зараз можна ўбачыць незвычайнае дрэва — вельмі высокае, як елка, а на галінках самыя сапраўдныя грушы растуць. Смачныя плады маюць адценне хваёвага «водару», а калі пакаштаваць іх яшчэ несаспелымі, то сківіцы не раздымеш ад смалы. Некалі бацька цяперашняй гаспадыні сядзібы паспрабаваў прышчапіць грушавую галінку на елку і, як бачым, смелы вопыт аказаўся ўдалым!

У свой час у старым садзе развялося шмат шкоднікаў. Каб ад іх пазбавіцца, Астроўская паставіла тут 45 шпакоўняў. Цяпер у цёплы час усе птушыныя домікі «заселеныя» крылатымі жыхарамі. У садзе пасялілася цэлая зграя: 90 шпакоў, 6 салаўёў, зязюля і сава. Начную птушку да сваёй сядзібы Станіслава Станіславаўна наўмысна прывабіла — развешвала для яе пачастункі (кавалачкі мяса) на алешыне. Цяпер сава прывыкла да людзей і стала зусім ручная, выдае свае «кугу» амаль як на «заказ» — сапраўдная экзотыка. А яшчэ з вясны да восені на падворку бегае сямейка сімпатычных вожыкаў, яны рэгулярна частуюцца малаком са сподачка і радуюць малых (калі часам хто з гасцей разам з дзецьмі на сядзібу завітае), ды і дарослыя такі «нумар» не кожны дзень убачаць.

Пра «сярэбраную» ваду і метэарыт

Сядзібу Станіславы Станіславаўны з усіх бакоў акружае вада — два возеры і Віктосева крынічка (у гонар яе, мабыць, і назва «аб'екта аграгурызму»). Яны быццам і ўтвараюць той самы своеасаблівы Сабалеўшчынскі «трохкутнік». За лясочкам — возера Рудакова. Вельмі адметны вадаём, між іншым, метэарытнага паходжання. Як кажа Астроўская, у правым пярэднім вугле ў добрае, спакойнае надвор'е добра бачная характэрная воронка, гэтае паглыбленне, напэўна, утварылася ў далёкія часы ад сутыкнення з даволі вялікім «нябесным каменем». Возера чысцюткае (з дна б'юць крыніцы), а вада ў ім сапраўды гаючая. Самая вялікая глыбіня — 90 метраў, а ў сярэднім — каля 40. Гаспадыня «Крынічкі» разам з суседзямі неаднойчы на некалькіх лодках выплывалі і рабілі замеры.

Станіслава Станіславаўна ж хімік-біёлаг па адукацыі, таму яшчэ ў студэнцкія гады яна брала пробы вады з Рудакова, прычым з рознай глыбіні. Жанчына адвозіла іх на аналіз у аналітычную лабараторыю БДУ, а калі пачала працаваць, то правярала ў каледжы. Такія намаганні аказаліся не дарэмнымі — у рудакоўскай вадзічцы знайшлі злучэнне серабра! Атрымліваецца, што гэта навукова ўстаноўлены факт. І вада сапраўды валодае гаючымі ўласцівасцямі: лечыць ранкі, гнайнічкі, якія доўга не загойваюцца.

Нездарма ж, мабыць, яшчэ з даўніх часоў здалёк прыязджалі да Рудакова людзі, каб набраць вады, — паілі хатніх жывёл, калі тыя хварэлі, і яны хутка папраўляліся. Кажуць, што калі пакупацца ў возеры, то адразу ўсю стомленасць як рукой здымае, атрымліваеш вялікі зарад бадзёрасці, толькі станоўчыя эмоцыі. Непадалёк ёсць крынічка, вада з якой таксама здольная шмат у чым дапамагаць. Яна ўтрымлівае солі калію (карысная пры сардэчна-сасудзістых захворваннях), а таксама натрыю (спраўляецца з захворваннямі вачэй). Таму выпіць шклянку сцюдзёнай крынічнай вады і ўмыцца ёю нікому, напэўна, не пашкодзіць, а толькі здароўя прыбавіць. Для гасцей сядзібы штодзённыя паходы да метэарытнага возера і крынічкі заўсёды ў радасць, многія заўважаюць, што пасля такіх карысных «водных працэдур» на самай справе адчуваецца вялікі прыліў сіл.

Як вугры ракаў з'елі

Возера Мястра зусім побач з хутарам, пабачыць водную далячынь можна, напрыклад, з другога паверха гасцявога доміка (тут два пакоі з рознымі «карцінкамі» для агляду). Станіслава Станіславаўна казала, што вельмі рамантычна сядзець каля акна ў шторм, калі вялікія хвалі падымаюцца ледзь не з гарызонту, і піць шампанскае. Увогуле гасцявы домік падзелены на дзве часткі — «летнюю» і «зімовую». У апошняй можна з камфортам адпачыць і ў халады, тут зроблена грубка з ляжанкаю. Сцены драўляныя, таму дыхаецца ва ўтульным пакоі вельмі добра. Сёлета пабудавалі цудоўную лазню, будынак гэты з «сакрэтам». Справа ў тым, што ўнутры яна абабітая рознымі пародамі дрэва (дубам, сасной, бярозай, клёнам, ліпай, рабінай, нават ядлоўцам), спачатку дошчачкі ўсмоктваюць пару, а пасля пачынаюць выдзяляць характэрны для кожнай пах. Кажуць, што «букет» атрымліваецца проста ўнікальны.

Камфорт гасцям гарантаваны, паколькі ў наяўнасці ўсе «гарадскія выгоды». На падворку абсталяваны альтанкі, столікі, ёсць мангалы, прыстасаванне для барбекю, дзве печкі для прыгатавання не толькі юшкі, але і самых розных далікатэсаў, вяндлярня і нават… вялікі акварыум. Гэта для таго, каб рыба, якую зловіце, магла «пачакаць» да прыгатавання. На Мястры адзін з самых «рыбных» куткоў у Нарачанскім краі — вам кожны тутэйшы жыхар аб гэтым скажа. Толькі вось ці пакажуць месцічы прыезджым добрае месца — яшчэ пытанне. А вось Станіслава Станіславаўна дакладна пакажа і аб усім падрабязна раскажа. Паводле яе слоў, у кожнай рыбы ў возеры ёсць свой дом: там, дзе бераг багністы, жыве шмат вялікіх тлустых лінёў, карасёў і сазанаў. Дзе трыснягі і пясочак абавязкова падчэпіш на кручок шчупака, акуня альбо плотку. У Рудакове таксама многа рыбы, сярод якой вялізная салака (амаль як акіянічны селядзец), яна якраз у снежні нерастуе. Тут жыве японскі омуль, а таксама ўсім вядомы вугор. Дарэчы, гэтая рыба, якую можна смела лічыць сапраўдным сімвалам усяго азёрнага краю, тут крыху іншай формы, чым, да прыкладу, у Нарачы. Раней у Рудакове было шмат ракаў, аднак іх падчас лінькі (калі панцыр у ракаў становіцца надта мяккім) з'елі… вугры. Гаспадыня аграсядзібы правамерна лічыць, што па рыбалцы яна вялікі спецыяліст. Бацька яе ледзь не з пялёнак браў з сабой на азёры.

Каля сядзібы растуць цэлыя плантацыі розных грыбоў, пакуль закіпае вада, то можна іх колькі трэба назбіраць і адразу прыгатаваць. Летась гаспадыня пяць вёдзер адных рыжыкаў літаральна на падворку нарэзала, іх Станіслава Станіславаўна некалькі гадоў таму сама высаджвала. Расказвала, што ў лес заўсёды хадзіла з двума кашамі: у адзін збірала добрыя грыбы, а ў другі — чарвівыя (прыносіла іх у якасці насення). Шмат тут і рознай ягады — суніц, маліны, каліны, шыпшыны. Ёсць і сапраўдныя «рарытэты», кшталту дзікіх клубніц. Гэтыя ягады па форме нагадваюць вішню, як кажа гаспадыня, вельмі



ужо салодкія, нават калі яшчэ не выспелі. З розных лясных зёлак заварвае Станіслава Станіславаўна цудоўную гарбату, якой заўсёды частуе гасцей. Можа прыгатаваць самыя розныя прысмакі — бабку, «паляўнічыя» катлеты, дранікі па арыгінальным рэцэпце і шмат чаго іншага. А яшчэ пячэ духмяны хлеб. У спадчыну ад маці (якая сваімі смачнымі боханамі часта ставала таксама Машэрава і Церашкову) засталася дзежка і нават закваска, якую Астроўская ўвесь час падтрымлівае. Пячэ па ўсіх народных «канонах» — на аеры альбо кляновых лістах, «прысаджвае» ў печку на спецыяльнай лапатцы. Якраз на Каляды ў хаце Станіславы Станіславаўны лунае неперадавальны водар свежага хлеба…

— Самай кепскай рысай у беларусаў з'яўляецца тое, што яны не могуць як след адпачыць, прысвяціць час сабе, свайму здароўю, — кажа гаспадыня з маленькага хутара. — Будуць сядзець у сваіх кватэрах, не, каб шух — і выбрацца кудысьці-небудзь, адысці ад процьмы будзённых спраў, проста пасядзець каля возера, птушак паслухаць.

І сапраўды, чаму б не падараваць сабе, напрыклад, неперадавальныя калядныя прыгоды ў чароўным «трохкутніку»? Нічога тут не трэба прыдумляць, усё проста: шух — і паехалі…

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.
Мядзельскі раён.

МАРОЗ, ХАДЗІ КУЦЦЮ ЕСЦІ!

Так паводле традыцыі, клічуць-кажуць у беларускіх хатах, спраўляючы Каляды. А традыцыя, дзякуй Богу, жывая, жыватворная...

Гэтак заўсёды пачынае святкаванне ў сваім доме і жыхар вёскі Азяраны Жыткавіцкага раёна, вялікі аматар і знаўца старажытных звычаяў і абрадаў **Сяргей ЯФІМОВІЧ**. Да яго, як і да многіх жыхароў Гомельскага і Брэсцкага Палесся прыйшоў таямнічы, трэба верыць, цудадзейны час. Зіма, нягледзячы на імклівасць светлавога дня, завірухі і маразы, поўніць зямлю здаровай і неабходнай энергіяй, якую выпраменьвае каляровая калядная зорка, галасістыя і няўрымслівыя вестуны — шчадроўшчыкі, гэткія, як у вёсцы Грычынавічы Жыткавіцкага раёна.

Прастора калядная стыхіі неабсяжная і непрадказальная. Калядная звязда гэтымі вечарамі можа напаткаць вас літаральна ў любым куточку — і, верце, гэта добры знак.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Звязда» ўзняла праблему...

«ЛЫЖКА МЁДУ — «БОЧКА» КАРЫСЦІ»

У артыкуле пад такім загалоўкам («Звязда» за 1 лістапада 2007 г.) былі закрануты некаторыя праблемы беларускага пчалярства. На думку навуковага супрацоўніка па пчалярстве Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, пчаляра-практыка са шматгадовым стажам Мікалая Халько, бадай, ніводная галіна эканомікі (а менавіта так пчалярства разглядаецца ў многіх краінах свету) не можа пахваліцца такім патэнцыяльна шырокім колам прымянення сваіх прадуктаў. І сусветная тэндэнцыя сёння менавіта ў комплексным выкарыстанні пчаліных сем'яў, каб атрымліваць не толькі мёд, але і матачнае малачко, пылок, пяргу, пчаліны яд...

Аднак у Беларусі гэтай галіне ўвагі надаецца яўна недастаткова. Хоць прыродныя ўмовы ў нас не горшыя, а можа, нават і лепшыя, чым у іншых рэгіёнах, веды і прыстасаваныя да нашага беларускага вулля тэхналогіі ёсць. Трэба іх толькі правільна прымяніць. А для гэтага (і водгукі на артыкул — таму пацвярджэнне) пчалярству патрабуецца падтрымка на дзяржаўным, заканадаўчым узроўні, а таксама зацікаўленасць з боку аграпрамысловага комплексу, медыцыны, навукі.

П. ПАРЭЦКІ,
генеральны дырэктар
РУП «Белпчалярства»:

— Прачытаўшы ваш артыкул «Лыжка мёду — «бочка» карысці», лічым, што пытанні, якія былі закрануты, правільныя і актуальныя для развіцця галіны пчалярства ў рэспубліцы. Але ўсе гэтыя праблемы неабходна вырашаць на дзяржаўным узроўні і перш за ўсё — пытанне па стварэнні дзяржаўнай структуры кіравання гэтай галіной, якая будзе працаваць не толькі з пчальнікамі сістэмы Мінсельгасхарча, але і з грамадскімі аб'яднаннямі, якія таксама патрабуюць каардынацыі ў кіраванні.

У мэтах абмеркавання ўзнятых праблем матэрыялы артыкула дасланы ў абласныя ўпраўленні па пчалярстве і на адрас старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

В. ЯСЕВІЧ,
пчаляр, г. Ляхавічы:

— Прачытаў артыкул «Лыжка мёду — «бочка» карысці» і захацелася выказаць сваю думку па некаторых пытаннях. Прадукты пчалярства — гэта мёд, матачнае малачко, пылок, пярга, пропаліс, воск, пчаліны яд. З мёдам большменш наш чалавек знаёмы. Але большасць тых, хто купляе мёд, ведаюць аб ім даволі павярхоўна. Лечыць прастуду, дапамагае ў зажыўленні ранаў і іншыя карысныя справы робіць ужыванне мёду. Веды гэтыя носяць даволі павярхоўны характар, хоць мёд знаёмы людзям тысячагоддзі. Аднак яго навуковы аналіз і навуковае карыстанне ім стаіць яшчэ вельмі далёка ад нас.

А што датычыцца матачнага малачка, пчалінага яду, пропалісу і іншых прадуктаў, то для большасці пчаляроў гэта — цёмны лес. Яны добра ведаюць гэтыя прадукты, але як іх дастаць, як навукова захаваць — ніхто толкам не ведае. І прычына тут толькі адна: наша навука пакуль гэтым не займаецца. А калі маўчыць навука, то ніякіх тэхналогій для пчаляра няма. Вельмі мала тых, хто навукова можа здабываць матачнае малачко, пчаліны яд, пяргу. Сярод маіх знаёмых гэтым ніхто і не займаецца, бо калі і атрымаеш гэтыя прадукты, то толькі здабудзеш клопату, дзе і як іх збыць.

Праз пару гадоў пасля заканчэння адным доктарам медінстытута (цяпер універсітэта) я запытаў у яго: «Колькі гадзін вам чыталі пра прадукты пчалярства?» У адказ пачуў: дзве гадзіны, альбо адна лекцыя. Прычына: няма даследаў, а таму няма чаго гаварыць, акрамя агульных слоў.

Кітайцы, японцы, амерыканцы даўно разабраліся ў гэтых пытаннях, таму і раздаюць дзецям і пажылым людзям бясплатна медыцынскія прэпараты з матачнага малачка. А ў нас пра прадукты пчалярства пішуць толькі пчаляры, бо навукова абгрунтаванага тлумачэння аб іх карысці няма. А адсюль няма чаго сказаць доктару свайму пацыенту. Пакуль жа доктар не будзе раіць мёд для лячэння той ці іншай хваробы, датуль наш чалавек будзе купляць яго ад выпадку да выпадку, а не мець на стале заўсёды. Тут слова за навукай.

А. ВАЙЦЯХОВІЧ,
намеснік старшыні камітэта
па сельскай гаспадарцы
і харчаванні Гродзенскага
аблвыканкама:

— Некаторыя праблемы, закранутыя ў артыкуле «Лыжка мёду — «бочка» карысці», маюць месца ў развіцці пчалярскай галіны і ў Гродзенскай вобласці. Калі разглядаць пытанне аб колькасці вырабляемага мёду, то на 1 студзеня 2007 года ў вобласці ва ўсіх катэгорыях гаспадарак (згодна са статыстычнай справаздачнасцю) утрымліваецца 23,7 тысячы пчаласем'яў, у тым ліку ў сельскагаспадарчых арганізацыях — 5,8 тысячы. Па выніках работы за 2007 год у сельгасарганізацыях вобласці атрымана звыш 900 цэнтнераў валавога мёду, альбо па 17,1 кг на адну пчоласям'ю, таварнага мёду выраблена на адну пчоласям'ю ў сярэднім па 9,3 кг. А ў такіх гаспадарках, як ААТ «Ашмянскі мясакамбінат», ВК «Шчучынскае пчалярства», ДП «Іўеўская сельгастэхніка» на адну пчоласям'ю атрымана ў сярэднім па 19,3, 16 і 13 кг таварнага мёду адпаведна.

Што датычыцца пчолаінвентару беларускай вытворчасці і яго кошту, то вытворчасцю вулляў займаецца ААТ «Пагарэльскі воскавулевы завод», медагонкі трохрамачныя вырабляе Баранавіцкі завод гандлёвага машынабудавання і ў Мінску вырабляюцца дымары. А цэны, якія былі ў Савецкім Саюзе і цяпер, наогул не падлягаюць параўнанню з улікам росту кошту драўніны.

У артыкуле ўзнята пытанне аб узаемадзеянні сельгаспрадпрыемстваў з пчалярамі і апісваецца прыкладная схема работы. Па такой схеме ўжо даўно працуюць некаторыя сельгаскааператывы Гродзенскай вобласці, якія займаюцца садоўніцтвам. А для вырашэння спрэчных пытанняў, звязаных з утрыманнем пчальнікоў, неабходна прыняць Закон аб пчалярстве, праект якога распрацаваны, але не зацверджаны.

...Зрэшты, сістэма супрацоўніцтва сельгаспрадпрыемстваў з пчалярамі не павінна абмяжоўвацца толькі садоўніцтвам. Варта нагадаць аграрнікам, што дзякуючы апыленню пчоламі можна атрымаць не 50 кілаграмаў насення канюшыны з гектара, а да 5 цэнтнераў. 60—65 працэнтаў складае прыбаўка па грэчцы, 75—95 працэнтаў — па агурках. На 30—40 працэнтаў павялічваецца ўраджайнасць такой, можна сказаць, стратэгічнай культуры, як рапс, паколькі ён служыць для вырабу не толькі алею і кармоў для жывёлы, але і біяпаліва.

— Больш за тое, пасля ўборкі азімага рапсу на гэтым жа месцы можна пасеяць пажніўную грэчку і атрымаць някепскі ўраджай, — зазначае Мікалай Халько. — Летась мы правялі такі эксперымент на доследным участку Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта і пераканаліся, што пры захаванні агратэхнічных параметраў гэта ў нашых умовах рэальна. Дарэчы, яшчэ ў савецкія часы ў Навазыбкаўскім раёне Бранскай вобласці праводзіліся доследы і пажніўная грэчка давала да 13 цэнтнераў з гектара. На мой погляд, у сувязі з пацяпленнем клімату ў Беларусі неабходна праводзіць даследаванні па вырошчванні пажніўнай грэчкі і пры гэтым абавязковым аграпрыёмам павінна быць пчолаапыленне.

Увогуле, паводле падлікаў эканамістаў, расходы на арганізацыю апылення раслін пчоламі ў 15—20 разоў ніжэйшыя за кошт атрымання ў той жа год дадатковага ўраджаю гэтых культур. Прыбытак ад прыбаўкі ўраджаю ў выніку пчолаапылення ў 10—15 (а паводле некаторых падлікаў, — да 50) разоў перавышае кошт атрыманага мёду і воску. У нас, на жаль, гэты аграпрыём неяк выпадае з практыкі, хоць у многіх краінах ён ужо даўно задзейнічаны. Толькі адзін прыклад. У ЗША за падвоз аднаго вулля да квітнеючага міндаля плацяць 180 долараў. Відавочна, што без разумення выгады на такія затраты ніхто б не пайшоў.

Дарэчы, нават у савецкія часы, калі сельгаспрадпрыемствы з прыватнікамі амаль не працавалі, і тое былі рэкамендацыі, згодна з якімі за падвоз адной пчоласям'і да саду пчаляру плацілі 15 рублёў, да рапсу і грэчкі — 10, да канюшыны — 20 рублёў. І гэтыя стымулы даволі эфектыўна дзейнічалі.

— Няўжо сёння няма гаспадарнікаў, якія разумеюць значэнне пчалярства ў справе павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур?

— Думаю, што яны ёсць. Аднак хацелася б, каб гэта было пастаўлена на дзяржаўны ўзровень. Неабходна сістэма, якая не залежыць ад волі нейкага кіраўніка: хачу — дазволю, хачу — не. А то можа дайсці да абсурду, што за падвоз вулляў для апылення рапсу ці канюшыны той-сёй з пчаляра яшчэ і плату запатрабуе, маўляў, гэта ж кармавая база для тваіх пчол.

Важна зразумець, што супрацоўніцтва аграрнікаў з пчалярамі — справа ўзаемавыгаднае. Пчалярства можа арганічна ўклініцца ў існуючую ў нас сістэму сельгасвытворчасці, для чаго неабходна на дзяржаўным узроўні вызначыць правілы гэтага партнёрства, прыняць адпаведныя заканадаўчыя рашэнні. У выніку пчалярства мела б надзейную кармавую базу, а сельгаспрадпрыемствы — лепшую ўраджайнасць культур дзякуючы іх апыленню пчоламі. Тым больш што сёння ўжо распрацавана платформа для транспарціроўкі перасоўнага пчальніка са стандартнымі беларускімі вуллямі. Такая платформа магла б перамяшчацца ад сельгаскультуры, якая зацвітае першай, да другой, трэцяй...

Барыс ПРАКОПЧЫК.

На свае вочы

ПА ЗІМУ, НА ВОЛГУ!

Напярэдадні Новага года група беларускіх журналістаў па ініцыятыве Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы і Міжнароднага цэнтра інтэграцыйнай інфармацыі ў рамках Нацыянальнай выстаўкі «Беларусь-2007» наведала горад Валгаград.

Сёння, у век новых інфармацыйных тэхналогій, падарожніка нават у самыя далёкія кропкі цяжка застаць знянацку і адправіць у холад у лёгкай апратцы ці наадварот. Адкрываеш Інтэрнэт, чытаеш... Ну дык вось, гэтая чытанка пра Валгаград для нас сталася як не знаёмствам са зводкай надзвычайных здарэнняў. Вось загалоўкі стужкі навінаў толькі за адзін дзень перад вылетам: «Абрыў ЛЭП у Валгаградзе», «Без святла засталіся больш за 10 тысяч чалавек», «Асцярожна, моцны снегапад!», «Аб'ёмы рамонтных работ на электрасетках Валгаградскай вобласці растуць з катастрафічнай хуткасцю», «На вуліцы Валгаграда выведзена практычна ўся снегаўборачная тэхніка»... І гэта перад паездкай да ніжняга цячэння Волгі, адкуль і да Астрахані недалёка... Ну што ж, шлях адзін: на Ждановічы, па футра, па шапку... Лагодныя беларускія зімы прытупілі пільнасць, расслабілі. Можа, хоць зіму ў Мінск прывязём? (У рэшце рэшт так і выйшла.)

...Валгаград перадкалядны сустракае даўно забытай казкай. Дрэвы ў аэрапорце акуратна ўпакаваныя ў тоўсты бліскучы лёд — галінка ў галінку. Вялікая вільготнасць (дыханне Волгі), імклівае пахаладанне — вачам захапленне, электрыкам і камунальнікам — слёзы: уся гэтая прыгажосць шмат важыць, вось і экстрым: абарваныя правады, паваленыя дрэвы. Зіма, сябры! Не чакалі? Тут мы вам радня, таму заснежаным тратуарам нас не спалохаеш і нават не здзівіш. А вось чым здзівілі (мяне, у прыватнасці), дык гэта гарачынёй літаральна ва ўсіх памяшканнях, дзе давялося быць — у гатэлі, на выстаўцы, у пунктах харчавання... Усюды — +26—27. Хапае цяпла ў Расіі!

Перад гатэлем, на Цэнтральнай плошчы, кідкія расцяжкі: «Валгаград — за Пуціна!», «Расія і Валгаград — адзіныя!». Іранічна ўсміхаюся: так ужо і ўвесь Валгаград за Пуціна... Вясёлы вадзіцель Гена, які апекаваўся намі на працягу ўсёй паездкі, не падзяляе маёй іроніі: «Трэба тут жыць, каб не здзіўляцца такім рэчам. Сур'ёзнае за імі — жыццё, якое даецца... Далей самі ведаеце».

Людміла ВЕРАСНЁВА.



Прагнозы

За пяць гадоў колькасць эканамічна актыўных грамадзян узрасце на 400—420 тысяч

У 2008 годзе дзяржаўная кампенсацыя выдаткаў наймальнікам на набыццё абсталявання пры стварэнні працоўных месцаў для інвалідаў павінна павялічыцца амаль у паўтара раза — аб гэтым паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай Коханаў.

Калі апошнім часам удалося знізіць напружанасць з працаўладкаваннем моладзі і зменшыць удзельную вагу беспрацоўных жанчын, то сітуацыя з інвалідамі па-ранейшаму застаецца вострай. Між тым, зазначыў Мікалай Коханаў, разам з грамадзянамі, што працуюць без афармлення або выязджаюць на заробкі за мяжу, менавіта людзі з абмежаванымі магчымасцямі — адна з найбольш важкіх крыніц павелічэння колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі.

Дарэчы, мяркуюць у міністэрстве, да 2010 года сярод усяго насельніцтва краіны ў працаздольным узросце доля эканамічна актыўных грамадзян павінна павялічыцца да 71 працэнта. Інакш кажучы, у параўнанні з 2005 годам «прыбаўка» складзе прыкладна 400—420 тыс. чалавек.

Сяргей ГРЫБ.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

Royal **«Розыгрыш автомобиля»**

1. Настоящая рекламная игра называется «Розыгрыш автомобиля», проводится в соответствии с условиями настоящих правил с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников игры дополнительной платы.

Игра имеет цель — дополнительное увеличение посетителей (клиентов) казино «Royal», город Минск, проспект Независимости, 11, корп. 1.

2. Организатором Игры является ООО «Дакарай», расположенное по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11/2-610. Учетный номер плательщика 190617507. Свидетельство № 614 о государственной регистрации коммерческой организации выдано Минисполкомом 18 апреля 2005 г. (далее по тексту — «Организатор»).

3. Игра проводится в казино «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11, корп. 1 в период **с 11 января 2008 года по 04 апреля 2008 года** (включи тельно).

4. Призовой фонд Игры.

Призовой фонд Игры формируется в полном объеме за счет чистой прибыли Организатора игры – ООО «Дакарай». Призом Игры является автомобиль Мерседес-Бенц Е 200 К кузов W211, стоимостью 117 513 000 (сто семнадцать миллионов пятьсот тринадцать тысяч) белорусских рублей.

5. В Игре в период ее проведения могут принять участие совершеннолетние физические лица в возрасте старше 18 лет (далее по тексту — «Участники») с учетом ограничений, изложенных в настоящих Правилах.

В Игре не имеют права участвовать работники и представители Организатора Игры, работники предприятий, связанных с Организатором договорными отношениями (обслуживающих Игру), а также члены семей названных работников и представителей, работники и представители любых других юридических лиц, имеющих отношение к организации и/или проведению настоящей Игры, а также члены их семей.

6. Описание Игры.

Механизм проведения Игры:

- Для того чтобы принять участие в Игре и розыгрыше призов Участнику следует в период с 11 января 2008 года по 04 апреля 2008 года посетить казино "Royal", расположенный по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1 и принять участие в играх «ПОКЕР» стол № 3 и/или «РУЛЕТКА» стол № 2. Нумерация столов указана на столах.

При этом участнику игры «ПОКЕР» независимо от игры у «дилера» выдаются игровые купоны, при условии минимальной ставки эквивалентной 53 500 (пятьдесят три тысячи пятьсот) белорусских рублей, за выпадение следующих комбинаций:

«Стрит» – 1 купон;
«Флэш» – 2 купона;
«Фул Хауз» – 3 купона;
«Карэ» – 5 купонов;
«Стрит флэш» – 10 купонов;
«Роял флэш» – 20 купонов,

Участнику игры «РУЛЕТКА» при выплате суммы, эквивалентной 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей выдается 1 (один) игровой купон.

Купоны выдаются в период проведения рекламной игры с 00 час. 00 мин. 11 января 2008 года до 21 час. 50 мин. 04 апреля 2008 года.

Каждый купон, состоит из двух частей, имеющих свой идентификационный номер.

Участник Игры, получивший купон, по линии отрыва разделяет купон на две половины, одну половину оставляет себе, вторую — возвращает сотруднику Организатора Игры для дальнейшего участия переданной части купона в розыгрыше призов. Переданные Организатору Игры купоны помещаются в лототрон.

Получение купона участника игры подтверждает факт ознакомления и полное согласие Участника с Правилами Игры, выражает желание Участника участвовать в Игре, а также обязывает присутствовать при проведении розыгрыша призового фонда Игры.

Организатор имеет право проводить дополнительные экспертизы купонов участников игры, в том числе с привлечением экспертов. Поддельные купоны участника игры, к участию в Игре не допускаются. Идентификация купонов участника игры осуществляется работниками Организатора Игры.

7. В рамках Игры создается комиссия по проведению рекламной игры. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения рекламной игры с 11 января 2008 года по 04 апреля 2008 года.

Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры:

- Персональный состав комиссии утверждается приказом директора ООО «ДАКАРАЙ». В состав комиссии входят 3 человека — председатель и два члена комиссии.
- Решение комиссии признается действительным при условии присутствия большинства членов из общего состава комиссии.
- Член комиссии ведет протокол заседаний комиссии. В протоколе отражаются время и место проведения заседания комиссии, повестка дня.
- В протоколе розыгрыша призового фонда отражается время и место проведения розыгрыша призового фонда, сведения о составе комиссии по проведению розыгрыша, действия комиссии по проведению розыгрыша в том порядке, в каком они совершались, результаты проведения розыгрыша с указанием выигравшего купона и сведений о победителе, обладателе пыриза рекламной игры.
- Протокол подписывают все члены комиссии, присутствующие при проведении заседания комиссии.
- Протокол заседания комиссии по проведению розыгрыша приза рекламной игры является основанием для выдачи приза победителю.
- Комиссия уполномочена рассматривать жалобы и предложения со стороны участников Игры.

8. Розыгрыш приза Игры состоится по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, казино «Royal» в присутствии комиссии по проведению рекламной игры и участников Игры 04 апреля 2008 года в 22.00.

Определение победителя Игры будет проводиться посредством случайной выборки купонов участников Игры в течение срока проведения рекламной игры с 11 января 2008 года по 04 апреля 2008 года.

В розыгрыше допускаются игровые купоны, полученные в срок до момента проведения розыгрыша.

Все допущенные к участию в розыгрыше купоны участников Игры помещаются представителем Организатора в лототрон и перемешиваются. Один из членов комиссии случайным образом вытягивает 37 купонов участников Игры из лототрона и помещает их на игровой стол «РУЛЕТКА» по номерам от 0 до 36. Дилер три раза запускает шарик рулетки и выбираются три купона, которые находятся на соответствующих выпавшим в колесе номерах. Выбранные купоны кладутся на «три дюжины» на игровом столе «РУЛЕТКА». Дилер снова запускает шарик рулетки. Выигравшим считается купон, который лежит на «дюжине», в которую входит номер, соответствующий номеру, выпавшему в колесе на рулетке. Объявляется идентификационный номер выигравшего купона. Если в зале отсутствует владелец второй части купона с данным идентификационным номером, то из лототрона вынимается следующий купон и кладется на освободившуюся «дюжину» на столе «РУЛЕТКА». Данная процедура повторяется до тех пор пока не будет вытянут купон с идентификационным номером, совпадающим с номером купона, присутствующего в зале участника Игры. Таким образом, определяется победитель Игры.

9. По итогам розыгрыша составляется и подписывается членами комиссии протокол розыгрыша. Решение комиссии, касающееся результата розыгрыша Призового фонда, является окончательным и обязательным для всех участников и не может быть изменено.

10. О рекламной игре можно получить информацию, позвонив по телефону «горячей линии» (8029)1113333 ежедневно с 09.00 до 24.00, либо непосредственно в казино «Royal» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1.

11. Вручение приза Игры будет осуществляться по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 11, корп.1, казино «Royal» в срок до 14 апреля 2008 года.

12. Для получения приза выигравшему участнику Игры, необходимо иметь при себе паспорт, удостоверяющий личность и вторую половину игрового купона для сверки его идентификационного номера с номером выигрышного купона.

Если Победитель Игры самостоятельно не явится за получением приза по адресу, указанному в п. 11 настоящих Правил, Победитель лишается права на получение приза.

Если победителем становится лицо, признанное недееспособным или ограниченно дееспособным, право получения приза переходит к его законным представителям — родителям, усыновителям или попечителям.

13. При получении приза Игры Победитель будет ознакомлен с законодательством Республики Беларусь о налогообложении доходов физических лиц. В момент получения приза у победителя удерживается и перечисляется Организатором в бюджет сумма подлежащего уплате подоходного налога с суммы приза либо Победитель должен подтвердить документально обязательство о самостоятельной уплате подоходного налога. Победитель Игры несет ответственность за уплату всех применимых налогов и предоставление налоговой отчетности, установленных действующим законодательством Республики Беларусь, связанных с получением призов Игры.

14. Организатор не оплачивает Участнику Игры расходы, связанные с проездом к месту получения приза Игры.

15. Приз не подлежит замене, выплата денежного эквивалента стоимости приза не осуществляется.

Ответственность Организатора по выдаче приза ограничивается исключительно указанном в настоящих Правилах количеству и виду приза. Организатор Игры не несет ответственность за любые риски, связанные с повреждением приза и его эксплуатацией, возникшие после выдачи приза победителю.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках рекламной игры их имена, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники Игры по их согласию могут давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

16. Информирование о проведении Игры и ее условиях производится посредством размещения рекламы в средствах массовой информации, с использованием средств наружной рекламы, выпуском полиграфической продукции.

Настоящие Правила, сведения о Призовом фонде Игры и порядке его формирования, сведения о составе комиссии по проведению рекламной игры и регламенте ее работы подлежат публикации в средствах массовой информации до начала рекламной игры.

Информация о результатах розыгрыша Призового фонда Игры будет опубликована в том же СМИ, где будут опубликованы правила настоящей Игры и дополнительно может быть размещена в других средствах массовой информации не позднее 16 апреля 2008 года.

Дополнительную информацию об Игре можно получить по телефону «горячей линии»: (8029) 1113333 ежедневно с 09.00 до 24.00.

17. Участие в Игре автоматически подразумевает ознакомление с настоящими Правилами и согласие участников Игры следовать всем условиям настоящих Правил. Несоблюдение Участником выполнения настоящих Правил считается его отказом от участия в Игре.

Состав комиссии рекламной игры «Розыгрыш автомобиля»:

Председатель комиссии:

- Гременок Василий Петрович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)

Члены комиссии:

- Чеславская Ольга Геннадьевна (Место работы — ООО «Дакарай», должность — заместитель начальника смены)
- Яцук Александр Владимирович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — заместитель начальника смены)

Комиссия будет осуществлять свою деятельность в период проведения рекламной игры с 11 января 2008 года по 04 апреля 2008 года (включительно).

Призовой фонд рекламной игры «Розыгрыш автомобиля» составляет легковой автомобиль Мерседес-Бенц Е 200 К кузов W211, стоимостью 117 513 000 (сто семнадцать миллионов пятьсот тринадцать тысяч) белорусских рублей.

Свидетельство о государственной регистрации Правил проведения рекламной игры выдано Министерством торговли Республики Беларусь за № 921 от 22 декабря 2007 года.

Віншуем дарагога і любага мужа, татачку і дзядулю ***Міхаіла Казіміравіча ГАРОХАВІКА*** *з в. Дзераўная з 65-годдзем. Жадаем моцнага здароўя і доўгіх гадоў жыцця.*

Жонка, дзеці, унукі.

Сардэчна віншуем цудоўнага чалавека, любячага мужа, клапатлівага бацьку і дзядулю, дарагога брата **МАКАРОНКА Міхаіла Цімафеевіча** з Мінска

з 60-годдзем!

Жадаем быць заўжды багатым — Багатым шчасцем і спакоем, Здароўем, радасцю ў сям'і, Сябрамі вернымі, любоўю І ўсім прыгожым на зямлі.

З павагай уся вялікая радня.

Вяртаючыся да надрукаванага

Што нельга рабіць у межах водаахоўнай зоны?

У «Звяздзе» ад 7 снежня мінулага года пад рубрыкай «Гарачы тэлефон» быў змешчаны адказ на запыт шматдзетнай маці Алены Станіславаўны Лужынскай з вёскі Гардынава Валожынскага раёна «З дакументамі на зямельны ўчастак разабраліся, а з водаахоўнай зонай — пакуль не». Дакладней, як вынікае з загалоўка, дапамагчы знайсці адказ у рэдакцыі на той момант атрымалася толькі на частку пытанняў, якія задала заяўніца.

Коратка нагадаем сутнасць справы. Жанчына з мужам вырашылі ўзяць банкаўскі крэдыт на рэканструкцыю жылля: зрабіць прыбудову. На той момант гэта ў іх не атрымалася. Па-першае, як высветлілася, у гаспадароў не было на руках дакументаў на зямельны ўчастак, якія б засведчылі правы на яго. З дапамогай Валожынскага сельскага Савета і РУП «Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» гэта пытанне было вырашана, прынамсі, алгарытм дзеянняў у гэтым накірунку для заяўнікаў быў агучаны са старонак газеты.

Па-другое, і, бадай, самае галоўнае, без адказу заставалася пытанне адносна водаахоўнай зоны: зямельны ўчастак спадароў Лужынскіх знаходзіцца побач з ракой і вадаёмам. Як можна было здагадацца, зрабіць прыбудову ў гэтай сувязі ў вяскоўцаў наўрад ці атрымалася б, прынамсі, на законных падставах. Але дакладнага тлумачэння менавіта па гэтай частцы звароту сям'і Лужынскіх мы не атрымалі, паколькі такое пытанне не ўваходзіла ў межы кампетэнцыі вышэйназваных Валожынскага сельскага Савета і РУП «Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры». Давялося тэлефанаваць у Валожынскую раённую інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і дамаўляцца, каб яе спецыялісты з выездам на месца праверылі выкладзеную чытачамі інфармацыю і далі свой кампетэнтны адказ. Што апошнімі і было зроблена.

«У выніку праверкі ўстаноўлена, што зямельны ўчастак знаходзіцца ў водаахоўнай зоне ракі Валожынкі. Матэрыялы па ўстанаўленні водаахоўных зонаў і прыбярэжных палос малых рэк на тэрыторыі раёна распрацаваны Рэспубліканскім праектным інстытутам па землеўпарадкаванні «Белгіпразем» і зацверджаны рашэннем Валожынскага райвыканкама ад 22.12.1987 года. Згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21.03.2006 г. № 377 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку ўстанаўлення памераў і межаў водаахоўных зонаў і прыбярэжных палос водных аб'ектаў і рэжыме вядзення ў іх гаспадарчай дзейнасці, і прызнанні страціўшымі сілу некаторых пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь», у водаахоўных зонах устанаўліваецца спецыяльны рэжым гаспадарчай дзейнасці, якая павінна ажыццяўляцца з захаваннем мерапрыемстваў, што папярэджваюць забруджванне, засмечванне, спустошванне водаў.

У межах водаахоўных зонаў забараняецца: выкарыстанне пестыцыдаў, унясенне мінеральных угнаенняў авіяцыйным метадам; размяшчэнне жывёлагадоўчых фермаў і комплексаў, накапляльнікаў сцёкавых водаў, палеткаў арашэння сцёкавымі водамі, могілак, жывёламагільнікаў, а таксама іншых аб'ектаў, што абумоўліваюць небяспеку мікробнага забруджвання і падземных водаў; размяшчэнне складоў для захоўвання пестыцыдаў, мінеральных угнаенняў, пляцовак для запраўкі апаратуры пестыцыдамі, размяшчэнне аб'ектаў захоўвання нафты і нафтапрадуктаў (за выключэннем складоў нафтапрадуктаў у портах, суднарамонтных заводах і прадпрыемствах водных шляхоў), а таксама іншых аб'ектаў, здольных выклікаць хімічнае забруджванне павярховых і падземных водаў; уладкаванне аб'ектаў размяшчэння адходаў, за выключэннем санкцыянаваных месцаў часовага ўтрымання адходаў па ўзгадненні з тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды; выдаленне аб'ектаў расліннага свету без зацверджаных праектаў добраўпарадкавання і азеляння, за выключэннем санітарных высечак, а таксама дазволеных высечак, якія забяспечваюць бяспеку руху воднага і наземнага транспарту, і іншыя дзеянні, прадугледжаныя заканадаўствам аб раслінным свеце і заканадаўствам аб дзяржаўнай граніцы; мыццё транспартных сродкаў па-за ўстаноўленымі месцамі; будаўніцтва і рэканструкцыя збудаванняў і камунікацый для ачысткі сцёкавых водаў, будынкаў, аўтазаправачных станцый, пунктаў тэхнічнага абслугоўвання і мыцця механічных транспартных сродкаў, гаражоў і іншых месцаў для пастаяннага захоўвання гэтых транспартных сродкаў, а таксама размяшчэнне садаводчых таварыстваў, дачных кааператываў, вытворчасць земляных, днопаглыбляльных, меліяратыўных і свідравіннавыбуховых работ, здабыча карысных выкапняў і водных раслін без узгаднення з тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды.

У водаахоўнай зоне падлягаюць добраўпарадкаванню існуючыя прамысловыя, сельскагаспадарчыя і іншыя аб'екты, населеныя пункты, месца вадапою жывёлы, прадугледжаецца цэнтралізаваная каналізацыя, адвод і ачыстка сцёкавых водаў, уладкаванне воданепранікальных сметнікаў».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Карэспандэнт высвятляў сітуацыю

НОВЫ ЭТАП ПРЫВАТНАГА БІЗНЭСУ

Летась айчынныя індывідуальныя прадпрымальнікі не вельмі актыўна пераходзілі ў новы бізнэс-статус — прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы. І Віцебшчына ў гэтым пытанні — не выключэнне.

Як паведаміла «Звяздзе» **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкама Ілона ШУЛЬГА**, паводле звестак на канец снежня 2007-га толькі 1400 індывідуальных прадпрымальнікаў падалі адпаведныя дакументы на перарэгістрацыю. Для параўнання: у Прыдзвінскім краі каля 10 тысяч «прыватнікаў» маюць наёмных работнікаў.

Большасць, напэўна, спадзяваліся, што прэзідэнцкі Указ будзе адменены. Але ў 2008-м «правілы рынкавай гульні» для індывідуальных прадпрымальнікаў будуць новымі.

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Віктар НІКАЛАЙКІН:

— На жаль, многія так і не зразумелі, што давядзецца працаваць у новых умовах. Да 10 лістапада адпаведныя службы актыўна займаліся прыёмам неабходных дакументаў для перарэгістрацыі. Працавалі да васьмі гадзін вечара. І няма даных аб тым, што ў ахвотнікаў не паспелі прыняць дакументы...

Паводле яго слоў, перамены ў атрыманні дазволу на вядзенне індывідуальнага бізнэсу тлумачацца некалькімі фактарамі, прадыктаванымі самім жыццём. Напрыклад, чаму ІП маюць права і далей працаваць у льготных падатковых умовах? А тыя ж пенсійныя пералічэнні? Не сакрэт, што яны рабіліся зыходзячы з адной сумы зарплаты, напрыклад, 200 тысяч рублёў, а на самай справе наёмныя работнікі маглі штомесяц атрымліваць і па мільёну. Няўжо апошнія не задумваюцца, што ў будучым памер іх пенсіі і будзе залежаць ад афіцыйнай сумы зарплаты? Безумоўна, змены таксама дазволяць абараніць айчынных вытворцаў. Якасць таго ж адзення ў нас лепшая, а на рынках па больш прывабных цэнах можна набыць, што пажадаеш, нават з брэндамі вядомых сусветных марак... А праз нейкі час дае ведаць пра сябе нізкая якасць такой навінкі для гардэробу.

Першы намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Мікалай ГЛУШОНАК:

— З канца чэрвеня 2007-га па дапамогу ў працаўладкаванні звярнуліся 429 чалавек з ліку тых, хто працаваў на індывідуальных прадпрымальнікаў, 80 было прапанавана на прайсці прафесійнае навучанне або перападрыхтоўку. Зразумела, бясплатна. Болей за 100 вырашылі заняцца прыватнай справай. Дзяржава пры гэтым прадстаўляе субсідыю — 1,5 мільёнаў рублёў для пачатку вядзення самастойнага бізнэсу. Больш за тое, можна атрымаць і беспрацэнтную пазыку — мільёнаў 20—25. Цяпер яшчэ неабходна дапамагчы ў пошуках працы 195 чалавекам. Працы хапае на ўсіх. Калі прапаноўваем некуды працаўладкавацца, гавораць, што зарплата нізкая, а па афіцыйных дакументах атрымлівалі раней мізэр. Значыць, рэальна былі ў іх «шэрыя» зарплаты.

Індывідуальны прадпрымальнік Васілій ЛАМАКІН: —

Ужо 6 гадоў я ў бізнэсе. Указам было ўсё прадумана. У каго вялікія абароты ў бізнэсе, рэальна выцягне і ў новых умовах. А вось у каго адзін ларок, адзін павільён, такім будзе цяжка.

Кіраўнік вядомай абутковай фірмы «Марко» Мікалай МАРТЫНАЎ:

— У 2008-м нашай прыватнай справе ўжо будзе 17 гадоў. Пачыналі як таварыства з абмежаванай адказнасцю. Цяпер у нас 3,3 тысячы чалавек. І ніколі не было затрымак з выплатай грошай работнікам. Беларусь, як ў свой час многія краіны, перажыла этап накаплення капіталу. Прэзідэнт многае зрабіў, каб пасля разбурэння СССР этап гэты прайшоў спакойна. Усё роўна ў бліжэйшыя гады прыйдуць да нас расійскія грошы. Цяжка будзе канкурыраваць. Таму трэба своечасова перабудавацца, змяніць стаўленне да вядзення бізнэсу. Рабіць гэта так, як ва ўсім цывілізаваным свеце...

Прыватны бізнэс вельмі чакаюць у малых гарадах, а іх толькі на Віцебшчыне 40. Там дзелавым людзям гарантаваны самыя розныя прэферэнцыі. Толькі пачынай справу, ва ўсім гатовы дапамагчы мясцовыя ўлады. «Зялёнае святло» і тым, хто засвойвае новыя тэхналогіі, распрацоўвае «ноў-хаў». А ўжо, калі застаецца жаданне перапрадаваць тавары, калі ласка, толькі перарэгіструйся і плаці падаткі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Пытальнік

«Установка індывідуальных прыбораў уліку вады — на агульных падставах для ўсіх наймальнікаў»

Я інвалід Вялікай Айчыннай вайны II групы, жыву адзін, мне 83 гады. Пражываю ў аднапакаёвай кватэры агульнай плошчай 28 квадратных метраў. Прашу праз газету адказаць мне на наступнае пытанне: ці маю я права на бясплатную ўстаноўку лічыльнікаў на ваду? Я звяртаўся, каб мне іх паставілі, але адказалі, што трэба плаціць. А таксама, ці маю я льготу на капрамонт, бо штомесяц плачу па 6650 рублёў і мне рамонт па закону павінен быць бясплатным.

(Прозвішча і дакладны адрас заяўніка рэдакцыя не ўказвае свядома), г. Нароўля.

Па просьбе рэдакцыі ліст чытача быў разгледжаны ў Нараўлянскім раённым выканаўчым камітэце. Ці мае заяўнік права на бясплатную ўстаноўку прыбораў уліку вады і льготу па адлічэннях на капітальны рамонт жыллёвага фонду?

«У адпаведнасці з прынятым Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян», які ўступіў у дзеянне з 17 снежня 2007 года, у адпаведнасці з арт. 16 п. 1 інваліды Вялікай Айчыннай вайны II групы вызваляюцца ад платы за тэхнічнае абслугоўванне і (або) карыстанне жылым памяшканнем у межах 20 квадратных метраў агульнай плошчы займаемага жылога памяшкання.

У адпаведнасці з вышэйвыкладзеным ільгота па аплаце адлічэнняў на капітальны рамонт жыллёвага фонду не прадугледжана. Устаноўка індывідуальных прыбораў уліку вады адбываецца на агульных падставах для ўсіх наймальнікаў жыллёвага фонду, без прадастаўлення льготаў».

Па пытанні сямейнага статусу і матэрыяльнага забеспячэння заяўніка работнікамі Нараўлянскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва было праведзена абследаванне. Рэдакцыя атрымала акт гэтага матэрыяльна-бытавога становішча. У ім, у прыватнасці, указана, што заяўнік атрымлівае пенсію па ўзросце на льготных умовах у памеры 584 930 рублёў у месяц. У склад сям'і чытача ўваходзіць жонка (яна атрымлівае пенсію па ўзросце на агульных умовах) і сын, якому 56 гадоў і які працуе ў Гомелі. Дарэчы, у заключэнні правяраючага запісана, што «падчас абследавання высветлілася, што муж з жонкай знаходзяцца ў шлюбе, але разам не пражываюць. Жонка пражывае па пэўным адрасе. Па заяве чытача (лістапад 2002 года) гэты дом быў газіфікаваны прыродным газам з устаноўкай новай газавай пліты. Таксама па заяве чытача ў 2004 годзе ў гэтым доме быў праведзены мантаж ацяпляльнай сістэмы з устаноўкай газавага катла за кошт сродкаў аблгаза. У 2004 годзе Нараўлянскім раённым вузлом электрасувязі быў устаноўлены бясплатна тэлефон у кватэры, дзе пражывае ўжо сам заяўнік (на суму 284 040 рублёў)». Жыллёвыя ўмовы ў чытача наступныя: прыватызаваная кватэра жылой плошчай 25 квадратных метраў (з ільготнай аплатай), з цэнтральнай каналізацыяй і ацяпленнем, цэнтральным халодным водазабеспячэннем, газавай плітой і ваннай. Сярод адзнак аб аказанні дапамогі (акрамя бясплатнай устаноўкі тэлефона) ёсць, у прыватнасці, гуманітарная дапамога прадуктамі на суму 91 640 рублёў ад цэнтра сацыяльнага абслугоўвання (18.09.2005 г.), аднаразовая грашовая дапамога ў памеры 25 тысяч і 20 тысяч адпаведна ад аблвыканкама і «Аграсэрвісу» (09.05.2005 г і 09.05.2007 г.), аднаразовая грашовая дапамога ў памеры 100 тысяч рублёў ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (15.04.2005 г.) і інш.

СТРАТЭГІЧНАЕ НАСТУПЛЕННЕ НА «БЕЛЫЯ КАЎНЕРЫКІ»

Першага студзеня споўнілася роўна год падраздзяленням па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ў стратэгічных накірунках.

Як паведаміў выконваючы абавязкі начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС краіны Алег Слепчанка, за першы год свайго існавання памянёныя падраздзяленні, а яны існуюць ва ўсіх абласцях і ў сталіцы, выявілі больш за тысячу крымінальных парушэнняў закона ў прыярытэтных сферах эканомікі. Прычым, амаль 80 працэнтаў гэтых злачынстваў адносяцца да катэгорыі цяжкіх і асабліва цяжкіх: хабарніцтва, злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі, буйныя крадзяжы і г.д. Улічваючы, што падобныя злачынствы здзяйсняюць высокаінтэлектуальныя асобы, на прафесійным слэнгу іх называюць «белыя каўнерыкі», вынікі першага года працы памянёных падраздзяленняў можна лічыць даволі паспяховымі.

Так, менавіта супрацоўнікі «стратэгічных падраздзяленняў» вывелі на чыстую ваду дваіх нядобрасумленных судовых выканаўцаў, якія вымагалі хабар у памеры 170 тысяч долараў у прадстаўнікоў ААТ «Трэйдынг-Інтэр». За гэтыя грошы судовыя выканаўцы абяцалі бізнэсменам станоўча вырашыць пытанне з перамогай на аўкцыёне па продажы арыштаваных вытворчых памяшканняў РУП «Завод дакладнага машынабудавання «Планар-ТМ». Абодва служкі Феміды ўжо асуджаны, кожны з іх атрымаў па 9 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

У Брэсцкай вобласці супрацоўнікі памянёнага падраздзялення выявілі цэлую арганізаваную злачынную групу, якой кіраваў дырэктар адной з гандлёвых устаноў. Як высветліла следства, у перыяд з 2002 па 2004 год гэты гандляр, злоўжываючы службовым становішчам, украў грошай і матэрыяльных каштоўнасцяў больш чым на 60 мільёнаў рублёў. Завадатар групоўкі асуджаны на 3,5 года пазбаўлення волі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Каб думаць разам «Звязда» мая...

Змалку з роднай мовай мне не шчасціла: у пачатковых школах палескіх ваенных гарадкоў беларускую, як кажуць, не праходзілі. Так што вывучаць яе стаў пасля, калі бацькі пераехалі ў горад...

Туды, у нашу Рагачоўскую сярэднюю школу, і завітаў неяк карэспандэнт «Чырвонай змены», каб зафіксаваць пачатак іспытаў у восьмых класах. Настаўнік кажа: «Ну, хто першым пойдзе адказваць, таго журналіст сфатаграфуе». Усталявалася цішыня. «А, думаю, была-не была...». Падняў руку. У бліжэйшым нумары і насамрэч з'явілася мая фатакартка. А з ёю потым — па-першае, цікавасць да ўсіх беларускамоўных выданняў, а па-другое — вострая неабходнасць чытаць іх, бо працаваў у ВНУ, меў пастаянную патрэбу ў інфармацыі.

Выпісваў я тады многія выданні. Што цікава: падпіску ладзіла партыйная арганізацыя. І па завяршэнні яе — падводзіла вынікі. Кшталту: на гэту газету падпісалася столькі чалавек, на гэту — столькі. А далей — даслоўна: «На газету «Звязда» на белорусском языке подписался один человек. Кулинкович». Уся зала, здаецца, пад 200 чалавек, паглядзела на мяне, а нехта — нават засмяяўся. Падумаў тады: «Чаго гэта яны? З большага ж тутэйшыя сялянскія хлопцы, і што — цураюцца чытаць па-свойму?»

Сёння думаю аб іншым. Няўжо ідэя пралетарскага інтэрнацыяналізму неяк прыгнятала нацыянальную? Наўрад ці Інтэрнацыянальнае, зараз разумею, гэта нешта глабальнае (усе народы сябруюць), але ж кожная з моў выконвае сваю гістарычную ролю. У тым ліку і наша — беларуская, якой заўжды трымалася «Звязда».

Яшчэ і за гэта я люблю яе... Зачытваюся артыкуламі. Асобныя — кранаюць ледзь не да слёз...

Самае цікавае і патрэбнае чытаю потым яшчэ раз, услых, сваёй жонцы (яна ў мяне расіянка). Разам думаем і перажываем. За што асобны дзякуй маёй газеце.

Леанід Мікалаевіч КУЛІНКОВІЧ, ветэран Вялікай Айчыннай вайны,
г. Мінск

Рэха публікацыі

Прыпынкі па запатрабаванні: перавозчык, як і пасажыры, не супраць. Апошняе слова — за дарожнымі арганізацыямі?

Мінчанка, што рэгулярна наведвае сваіх бацькоў у Смалявіцкім раёне, даволі часта карыстаецца паслугамі маршруткі «Мінск—Жодзіна», якая адпраўляецца з аўтавакзала «Маскоўскі». На карысць маршруткі гаворыць яе расклад руху: транспарт ходзіць літаральна кожныя 15—20 хвілін у адрозненне ад звычайнага аўтобуса, які ідзе па гэтым жа маршруце толькі тры разы на дзень. Наша заяўніца не даязджае да канчатковага прыпынку, а выходзіць на павароце на Смалявічы. Трэба заўважыць, што ў гэтым месцы няма ніякага прыпыначнага пункта, абсталяванага па ўсіх правілах. Звычайна людзі проста прасілі вадзіцеля маршруткі спыніцца і выходзілі дзе трэба. Пакуль аднойчы з мінчанкай не здарыўся выпадак, пра які яна і паведаміла ў газету.

— Вадзіцель катэгарычна адмовіўся спыніцца там, дзе было трэба мне і яшчэ чатыром пасажырам, маўляў, калі заўважыць ДАІ, у яго будуць непрыемнасці. Так і вёз нас лішнія 7—8 кіламетраў да бліжэйшага «афіцыйнага» прыпынку. Пашчасціла, што мяне павінна была сустракаць на аўтамабілі сваячка, таму яна проста ехала за маршруткай гэтыя лішнія кіламетры, перагаворваючыся са мной па «мабільніку». А каб не яна, тады што? — прыгадвала той выпадак заяўніца.

Па «гарачых слядах» у аддзеле перавозак філіяла «Мінскі аўтавакзал» нам патлумачылі, што вадзіцель, у адпаведнасці з Правіламі перавозак пасажыраў, нічога не парушыў, паколькі на гэтым маршруце ёсць афіцыйна зацверджаныя прыпыначныя пункты. Памянёнае чытачкай месца ў іх лік не ўваходзіць. «Але ёсць чалавечы фактар», — дадалі нам. Маўляў, вадзіцель мог і саступіць просьбам пасажыраў. «Транспарт жа ў нас для людзей, згодны? Няхай пасажыры звяртаюцца да перавозчыка!» Дарэчы, амаль так даслоўна мы і назвалі матэрыял, які быў змешчаны пад рубрыкай «Гарачы тэлефон».

Таму нам сапраўды падалося цікавым меркаванне кіраўніцтва гэтага перавозчыка на згаданым маршруце — даччынага ўнітарнага прадпрыемства «Аўтамабільны парк № 18», які размешчаны ў Жодзіне.

«Адміністрацыя ДУП «Аўтапарк № 18» г. Жодзіна лічыць, што матэрыял «Транспарт у нас для людзей. Няхай пасажыры звяртаюцца да перавозчыка», апублікаваны ў газеце «Звязда», закранае вельмі «хворую» тэму. Сапраўды, вельмі многія маршруты аўтобусаў не заўсёды могуць спыняцца там, дзе гэта неабходна для зручнасці пасажыраў.

У накірунку г. Мінска (дарога Слабада — Навасады, Р-53) існуе абмежаваная колькасць абсталяваных прыпыначных пунктаў, на якіх, згодна з Правіламі аўтамабільных перавозак пасажыраў у Рэспубліцы Беларусь (пастанова Мінтранса ад 22.07.02 г. № 23, гл. 6, п. 102, 103) могуць спыняцца прыгарадныя аўтобусы. ДУП «Аўтапарк № 18» неаднаразова звярталаса да дарожных арганізацый, адказных за арганізацыю прыпыначных пунктаў на данай дарозе. Аднак істотных змяненняў у сітуацыі не адбылося, нягледзячы нават на павелічэнне ДТЗ на праблемных участках дарогі (скрыжаванне дарог Р-53 і Р-66, прыпыначныя пункты «Калюга», «Жажэлка»).

У накірунку Жодзіна—Мінск выконваюцца рэйсы на двух прыгарадных маршрутах. Для змяншэння колькасці ДТЗ і, згодна з зацверджанымі належным чынам маршрутаў руху, прамежкавыя прыпыначныя пункты па запатрабаванні (у тым ліку і «паварот Смалявічы) дзейнічаюць толькі для прыгараднага маршрута «Жодзіна (вайсковая часць) — Мінск», які ідзе ў звычайным рэжыме. Па прыгарадным маршруце «Жодзіна — Мінск», які ідзе ў экспрэсным рэжыме, згодна з маршрутам руху прадугледжана меншая колькасць прыпыначных пунктаў.

Дадаткова паведамляем вам, што адміністрацыя ДУП «Аўтапарк № 18» з лета 2007 года не можа атрымаць узгадненне па прыгарадным маршруце «Смалявічы — Мінск», вельмі патрэбным для перавозкі пасажыраў з раённага цэнтра ў сталіцу. У снежні дакументы паўторна былі накіраваны ў ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» на ўзгадненне. Пры станоўчым рашэнні ў пачатку 2008 года даехаць з г. Мінска ў г. Смалявічы можна будзе без перасадак».

Магчыма, сапраўды сваё слова маглі б сказаць і дарожныя арганізацыі, адказныя за арганізацыю прыпыначных пунктаў, на якія спасылаецца перавозчык?

Сяргей РАСОЛЬКА.

Вясельна-пахавальны сіндром

Час і традыцыі: спрэчныя нататкі

Наша вёска адыходзіць у нябыт, і праз нейкае дзесяцігоддзе застануцца, бадай што, аграгарадкі ды вялікія вёскі. Але мяняюцца не толькі населеныя пункты, але і іх жыхары, традыцыйны ўклад жыцця.

Вяселлі спраўляюць круглы год, але здаецца, што жэняцца найбольш летам. У гэтую пару маладыя трапляюцца на вочы часцей, а зімой, калі яшчэ мароз, то з кветкамі па вуліцы не прагуляешся — з машын у ЗАГС, затым такім жа чынам да кавярні, а там застолле. Але ніхто не хоча, каб вяселле ператварылася ў гаварыльню з выпіўкай ды добрай закускай. Вось тут і пачынаюць успамінаць вясельныя традыцыі. Толькі іх ужо нельга ажывіць і тады выбіраецца самае яркае. У кожнай мясцовасці нешта сваё, але без музыкаў ды каравая не абыходзіцца ніводнае вяселле.

Некалі музыкантаў мелі ў сваёй вёсцы ці наймалі ў суседняй тых, каго ведалі ў наваколлі. І яны здольныя былі задаволіць вясковага чалавека — сыграць польку, факстрот, кракавяк, а бывала, гарманіст апытваў гасцей, якія сядзелі за сталом і за рубель іграў на заказ — мяцеліцу, барыню...

Сёння музыкантаў можна знайсці ў райцэнтры, пры сельскім Доме культуры ці па аб'яве. «Вакальна-інструментальны ансамбль (кларнет, баян і барабан) упрыгожаць вам любую ўрачыстасць», — можна прачытаць падобнае ў газеце ці на нейкім слупе.

Такі ансамбль будзе іграць і спяваць, але ўсё добра знаёмае — з рэпертуару Кадышавай, Бабкінай, Газманава і яшчэ ліха ведае каго, а калі госці расслабяцца, то гучаць і прыпеўкі. Аднойчы давялося пачуць: «Дождж ідзе — трава сухая, эх, бяда якая, малады ў маладой трусікі здымае», — гучала пад адабральны смех прысутных.

І справа тут не ў маладых хлопцах, якія стараюцца зарабіць сабе на жыццё. Праблема ў нас. Мы страцілі арыенцір і не ведаем ужо, што добра, а што пошласць. Проста мы жывём не ў сваім моўным і культурным рэчышчы. Дарэчы, нічога агульнага не маем і з рускімі народнымі традыцыямі, бо мы іх не ведаем. Выходзіць, што сваю культуру мы бяром з тэлебачання.

А там Пугачова ў сваіх прыпеўках сыпле матам і зала ёй апладзіруе, а калі камедыянт Петрасян на ўсю СНД адпускае пахабшчыну, то што хацець ад гэтых дзяцей з баянам і барабанам, якія прыехалі ў вёску з пачуццём перавагі, хоць бацькі іх яшчэ мясілі гной у хлявах!

Дэмакратыя — гэта добра, але калі паважаюцца правы ўсіх грамадзян. У той жа Францыі, дзе ёсць закон аховы нацыянальнай мовы, за такія перлы з экрана тэлевізара — закон, а не цэлюліт паставіў бы кропку на кар'еры спявачкі.

Традыцыі не могуць заставацца непахіснымі, бо час, як тыя жорны, перамеле ўсё. І мы ўжо не тыя, якімі былі дваццаць гадоў таму.

А цяпер вернемся да вясельнага каравая, бо калі на стале з'яўляўся ён — гэта была вяршыня ўрачыстасці. Пасля раздачы каравая вяселле ішло на спад.

Некалі каравай, які стаяў перад маладымі, дзялілі (наразаў) сват. «Маладыя дораць караваем роднага дзядзьку», — аб'яўляў ён і клаў у дзядзькаву хусцінку кавалак каравая, а той у адказ апускаў перад маладымі грошы. Іншым разам сват суму абнародваў, альбо не, але ўсе бачылі, колькі грошай паклаў чалавек. Тым больш што цікаўных хапала, каб не прапусціць працэс дарэння.

У любым выпадку ўсё рабілася прылюдна і ніякага сакрэту тут не было. Калі бацькі маглі падарыць многа, то далёкі сваяк, «дзесятая вада на кісялі», спакойна клаў пяць рублёў і яго ніхто не асуджаў.

У мінулым годзе ў адной з вёсак Палесся (раён не буду называць, хоць вылічыць, напэўна ж, можна) адбылося вяселле. Хлопец з райцэнтра ўзяў мясцовую дзяўчыну. З боку маладога родных было ўсяго 10 чалавек, бо бацькі яго не тутэйшыя, а вось сваякоў маладой сабралася чалавек дзвесце. Вёска вялікая, і калі запрашаеш аднаго сваяка, то трэба і другога, трэцяга... Такія шматлюдныя вяселлі ў палескім рэгіёне — з'ява звычайная.

Гулялі і часталіся, а затым настаў час і маладых адорваць. Як гаварылася вышэй, некалі клалі грошы ў адкрытую, а цяпер у канвертах — больш далікатна і культурна. А калі тыя канверты пачалі адкрываць, то высветлілася, што з боку маладой, а гэта дзвесце чалавек, падарылі грошай утрая менеі, чым дзесяць сваякоў маладога. І гэта не таму, што ў апошняга багатыя бацькі і браты. Многія ў канверты клалі мізэр — тысячу, дзве, тры... Некалі пяць савецкіх рублёў — гэта трыццаць боханаў хлеба ці амаль тры кілаграмы ялавічыны, а за тысячу і бохана не купіш.

Хоць гэта і не горшыя варыянты, бо бываюць выпадкі, калі на вяселлі кладуць і пустыя канверты. Можна на гэту сітуацыю паглядзець па-рознаму. У людзей няма грошай і таму яны так робяць, хоць, хутчэй за ўсё, кожны паклаў у той канверт свой гонар ці сумленне.

Помніцца, калі сусед запрашаў да сябе ў госці, то да яго ішлі са сваёй гарэлкай і бралі яшчэ нешта прыкусіць. Спрадвеку так было.

«Ісці ў госці са сваёй бутэлькай, то які сэнс? — дзівяцца маладзейшыя. — Гэтак жа і дома можна выпіць».

Напэўна ж, у чалавека ёсць выбар: ісці на вяселле ці застацца дома. А калі пайшоў, то ўзяў на сябе і абавязкі, якія выцякаюць з тых жа традыцый. Але што значаць сёння яны?!

За савецкім часам маладыя ўскладвалі кветкі да помніка Леніна — машыны спыняліся на плошчы і маладыя ішлі да манумента. Такая была традыцыя. А чаму сёння да Леніна маладыя не спяшаюцца? Цяпер многія ідуць вянчацца проста так, дзеля моды, бо нярэдка праз месяц ужо будуць разводзіцца. А хіба не сказана, што калі шлюб заключаны на небе — на зямлі яго скасаваць нішто не можа?

І ўсё ж ёсць у нас традыцыя, якая мае выражанае адценне — гэта памінкі. Ператвараць памінальную вячэру ў застолле з рознымі прысмакамі і напоямі мы ўмеем. Калі на стол ставяць ананасы, загорнутыя ў мяса, то відаць і нябожчык у магіле варухнецца. Памінальнае абжорства — традыцыя старадаўняя і трывалая. Вось і на саракавіны ў рэстаране аднаго райцэнтра сабралі больш за сто чалавек. Відаць, калі чалавек памірае, то ў нас да яго абуджаецца нейкае асаблівае пачуццё любові.

Але ёсць зрухі і да лепшага. Вось прывезлі святара да старога, які ўжо падышоў да схілу жыцця, каб прычасціць нямоглага. А калі была здзейснена таемнасць, у зусім маладога святара спыталі наконт аплаты.

«Тут не грошы самае важнае — гэта справа дзесятая, зямная», — адказаў бацюшка.

Святару заплацілі, бо ад іншых ведалі, што і да чаго, але сам адказ абнадзейвае. Жыццё не стаіць на месцы і разам з адмоўным з'яўляецца і станоўчае.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Паўтарэнне пройдзенага

Па радыё некалі спявалі, што салдатамі не нараджаюцца, салдатамі становяцца... Як, дарэчы, і настаўнікамі, дактарамі, цеслярамі... Альбо заатэхнікамі, як мая прыяцелька.

Пачынала яна, як многія, ці амаль усе — тры месяцы вучобы, месяц практыкі. І вось пачалася першая... У калгасе. Як на тое ліха, з каровай бяда — ад віду крыві практыкантка ледзь прытомнасць не страціла, прынеслася да ветфельчара белая, як мел, голас дрыжыць:

— Сцяпанавіч, там... Там карова параніла.

Ён пытаецца:

— Што параніла?

А ў дзяўчыны ад страху з галавы ўсе словы прапалі: не можа сказаць, што вымя, на сабе паказвае:

— Бюст.

Фельчар у рогат...

Ён, дарэчы, і наогул «прыкаліст» быў. Падчас той жа практыкі пытаецца:

— Таццяна, а ці ведаеш ты, як карову абсемяніць?

— Не, — кажа. — Мы яшчэ не праходзілі.

— То зараз якраз мы абсемяняць будзем, — можаш паглядзець... Але карову для гэтага перш-наперш трэба паваліць. Дык ты спрытнейшая, збегай да клаўшчыка. Хай ён вяроўку дасць.

Ну практыкантка і панеслася. Просіць вяроўку. Кладаўшчык пытае, навошта. Яна (за чысцюткую манету ж усё) яму адказвае. А той таксама гумарыст, немаведама над кім пажартаваць рашыў. Факт, што кажа ёй:

— Ты, дзеўка, бяжы назад, распытай Сцяпанавіча: калі «абсемяняць» карову будуць быком, то валяць яе не трэба, а калі Сцяпанавіч сам... Ну тады прыбяжыш яшчэ раз, і вяроўку я табе дам.

Таццяна прыбегла, усё далажыла...

Гэта ў тым калгасе была яе першая практыка і... апошняя, бо папрасілася — хоць да чорта на рогі, толькі не да Сцяпанавіча ў калгас...

Але, што цікава, вучобу яна скончыла на выдатна. Што яшчэ цікавей — у свой час настаяла, каб разабралі дах і салому з яго скармілі каровам, якія з голаду не тое, што стаяць, нават на вяроўках вісець ужо не маглі. Тады падобныя рашэнні (галодны быў год, суровая зіма...) прымалі не адзінкі, але ж Таццяне было 19. Дзіця горкае, а скеміла, што холад жывёла можа яшчэ і перажыве, а вось голад...

Соф'я КУСЯНКОВА,
в. Лучын, Рагачоўскі раён

Як беднаму жаніцца...

Мая гісторыя мо зусім не смешная, але што праўдзівая — факт.

У няпоўныя 20 я пазнаёмілася з вельмі прыгожым хлопцам. Я — студэнтка, ён — на тры гады старэйшы, скончыў тэхнікум, працаваў на рынку, жыў у сваякоў. Мы сталі часта сустракацца, разам недзе хадзіць і ездзіць, нават, аднойчы, за мяжу — адпачываць.

Дарэчы, туды мы паехалі без пуцёўкі, так званымі дзікунамі. Назад вярталіся — на самалёце. Білеты, помню, купляў ён, і быў выбар: ляцець у салоне, дзе курыць, альбо — дзе не?.. Мой кавалер — смаліў і таму ляцець рашыў з першымі. Спытаў, дзе лепей мне? Я, зразумела ж, сказала, што з ім...

Ніколі не думала, што гэта так цяжка: у салоне, лічы, адны мужыкі, цыгарак з рук не выпускаюць, дыму — хоць сякеру вешай... Карацей, з самалёта мяне пад рукі вывелі... Але ж нашых адносінаў гэта не сапсавала. Я кахала яго, ён казаў, што любіць мяне. І не бяда ж тады (я так лічыла), што не прапаноўвае ён ні руку, ні сэрца, не кліча ў ЗАГС.

У так званым грамадзянскім шлюбе — мы пражылі восем гадоў. Ён здымаў кватэру, пазнаёміў мяне са сваімі бацькамі. Летам часцяком мы разам прыязджалі ў вёску да маіх. У нас там

36,6°

Пры халадовай траўме кожная хвіліна дарагая

З надыходам зімовых маразоў пачашчаюцца халадовыя траўмы: халадовая алергія, абмаражэнні.

Алергія праяўляецца тым, што ў халоднае надвор'е адкрытыя ўчасткі цела адказваюць на кантакт з холадам з'яўленнем чырвані, ацёчнасці, можа быць скураны сверб, дрэнна дыхае нос.

Як раіць дацэнт кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Людміла Маслава, людзям, якія маюць схільнасць да халадовай алергіі, у марозныя дні трэба прытрымлівацца пэўных правілаў. Неабходна прымаць антыгістамінныя прэпараты. Зараз ёсць даволі эфектыўныя і бяспечныя лекі — такія, як эрыус, зіртэк, філфаст. Іх можна прымаць раз у суткі, і яны не выклікаюць прывыкання. Калі вы са свайго ранейшага вопыту ведаеце, пры якой мінусавай тэмпературы ў вас пачынаюцца непрыемныя сімптомы, то можаце пачаць прымаць прэпараты рэгулярна. З улікам таго, што дрэнна дыхае нос, трэба падключыць лячэнне рыніту. Самымі эфектыўнымі прэпаратамі для гэтага на сёння з'яўляюцца інгаляцыйныя глюкакафістонды для мясцовага прымянення, напрыклад, назанекс. Ён аказвае супрацьзапаленчае дзеянне. Безумоўна, гэта не хуткая дапамога, прэпарат пачынае дзейнічаць праз некалькі дзён, але эфект ад яго трывалы.

Пры халадовай траўме дарагая кожная хвіліна. Асабліва гэта датычыцца абмаражэння. Прычым першыя яго прыметы распазнаюцца не адразу. Узнікае лёгкае паколванне, якое часта не ўспрымаюць усур'ёз, паколькі гэтыя сімптомы рэзкага дыскамфорту не дастаўляюць і хутка знікаюць.

Руковы румянец на шчоках у час рухальнай актыўнасці — гэта нармальна. А вось прыйшоўшая на змену пачырванению бледнасць — сімптом сур'ёзны. Адразу вызначыць цяжкасць абмаражэння дастаткова складана. Бо толькі пасля сагравання ў вобласці паражоных участкаў узнікае боль, з'яўляюцца ацёкі і пухіры на скуры. Чым пазней з'явіцца гэтыя прыметы, тым большая верагоднасць паражэння глыбокіх тканак.

Таму трэба як мага хутчэй зайсці ў цёплы пакой, каб сагрэць абмарожаныя ўчасткі і аднавіць у іх кровазварот. Нельга выкарыстоўваць пры гэтым сухое цяпло. Самы просты і эфектыўны спосаб — гэта саграванне ў цёплай вадзе. Мясцовыя ванны робяць пры абмаражэнні рук і ног. Спачатку тэмпература вады павінна быць 36—37 °С, потым яе паступова павышаюць да 40 °С. Ванну трэба прымаць не менш як 30 хвілін, таму вам не раз прыйдзецца падліваць гарачую ваду. Калі пры сагрэванні з'явіўся боль і пачырванела скура, значыць вашы старанні не прайшлі дарэмна — кровазварот аднавіўся. Замацаваць поспех дапаможа лёгкі масаж, які можна рабіць прама ў вадзе. Пачынаць расціранні трэба з кончыкаў пальцаў, паступова прасоўваючыся ўверх. Пасля ванны накладваюць саграваючыя павязкі з некалькіх слаёў марлі і тоўстага слою ваты, які зверху прыкрываюць цэлафанам. Абмарожаныя пальцы трэба абавязкова праклясці палоскамі бінту. Такімі ж цеплаізаляцыйнымі павязкамі саграваюць вушы, нос і шчокі. Пры лёгкім абмаражэнні вынік павінен з'явіцца на працягу першых 10—20 хвілін. Калі нічога не змяняецца, выклікайце хуткую дапамогу. Да прыезду ўрачоў не рабіце рэзкіх рухаў канечнасцямі. Руку можна падвесіць з дапамогай хусткі ці шаліка, а ногі пажадана ўкласці так, каб яны былі крыху апушчаны ўніз. Пазбегнуць халадовых траўмаў дапаможа захаванне наступных правілаў.

* На мароз выходзьце ў шматслойным адзенні. Праслойкі паветра паміж тканінамі выдатна ўтрымліваюць цяпло. Трэба адмовіцца ад металічных упрыгажэнняў.
* Змажце твар і рукі спецыяльным тлустым (а не звычайным увільгатняльным) крэмам. А вось спіртавымі ласьёнамі карыстацца не рэкамендуецца.
* Не гуляйце на галодны страўнік. Калі адчуваеце, што пачынаеце замярзаць, парухайцеся!
* Не расцірайце твар рукавіцай, толькі сухой далонню, а лепш папрактыкавацца ў грымаснічанні: усміхайцеся, моршчыце нос.
* Пасля таго як моцна прамерзняце, будзьце ўважлівыя, трапіўшы нарэшце ў цёплае месца: у транспарце паспрабуйце сесці, бо часта працэс сагравання суправаджаецца моцнымі болевымі адчуваннямі і галавакружэннем ажно да страты прытомнасці.
* Не паліце на марозе. Нават адна цыгарэта выклікае спазм капіляраў канечнасцяў, які працягваецца некалькі гадзін, а гэта шлях да абмаражэння.
* Не варта і выпіваць на вуліцы. Алкаголь пашырае сасуды, што павялічвае цеплааддачу і садзейнічае пераахаладжэнню.
* Чаго нельга рабіць пры абмаражэнні? Правілы простыя: не расцірайце пабляднелую скуру снегам. Ён не толькі лёгка траўмуе скурнае покрыва, але і можа быць крыніцай інфекцыі.

Вольга ШАЎКО.

НАРОДНЫЯ СРОДКІ ПРЫ АБМАРАЖЭННІ

- Расціраць абмарожаныя месцы надзёртымі цыбуляй і часнаком.
- Добра лечыць абмарожаныя месцы заячы тлушч.
- Абмарожаныя ногі і рукі пасля аднаўлення адчувальнасці пагружаць на 30 хвілін у цёплы несалёны бульбяны адвар.
- Змазваць на ноч абмарожаныя месцы камфарна-іхтыёлавай маззю.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.25	16.08	7.43
Віцебск —	8.22	15.51	7.29
Магілёў —	8.15	15.58	7.43
Гомель —	8.04	16.02	7.58
Гродна —	8.39	16.24	7.45
Брэст —	8.31	16.33	8.02

Месяц
Маладзік.

Імяніны
Пр. *Сцяпана, Фёдара;*
К. *Аліцыі, Тэрэзы, Адрыяна, Антонія, Юліяна.*

Дзве даты

9 студзеня

1856 год — у Англіі ўпершыню ў свеце ўведзены падаходны падатак.

1951 год — адбылося афіцыйнае адкрыццё будынка Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Нью-Йорку.

Цытата дня:

«Язык — самая небяспечная зброя: рана ад мяча лягчэй залечваецца, чым ад слова».

Кальдэрон дэ ла Барка (1600—1681), іспанскі драматург.

Усміхнёмся!

Прыгожая жанчына радуе мужчынскі позірк, непрыгожая — жаночы.

☺

— Чаму ўраганы называюць жаночымі імёнамі?

— Таму што спачатку яны загадкавыя і непрадказальныя, а потым забіраюць дамы і машыны.

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+1..+3°С	КІЕЎ	-4..-2°С	РЫГА	-2..-4°С
ВІЛЬНЮС	-2..0°С	МАСКВА	-10..-8°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-2..0°С

Шчырыя пажаданні здароўя, удачы і поспехаў, шчасця і дабрабыту з нагоды дня нараджэння **Уладзіміру Піліпавічу РАДЗЕВІЧУ** са Стаўбцоўшчыны.

Марыя, Дзмітрый.

Royal

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Платиновая лихорадка 2»

1. Настоящая рекламная игра называется «ПЛАТИНОВАЯ ЛИХОРАДКА 2», проводится в соответствии с условиями настоящих правил с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников игры дополнительной платы.

Игра имеет цель — дополнительное увеличение посетителей (клиентов) казино «Royal», город Минск, проспект Независимости, 11, корп.1.

2. Организатором Игры является ООО «Дакарай», расположенное по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11/2-610. Учетный номер плательщика 190617507. Свидетельство № 614 о государственной регистрации коммерческой организации выдано Мингорисполкомом 18 апреля 2005 г. (далее по тексту — «Организатор»).

3. Игра проводится в казино «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11, корп. 1 в период **с 14 января 2008 года по 20 марта 2008 года** (включительно).

4. Призовой фонд Игры.

Размер Призового фонда Игры составляет **57 780 000** (пятьдесят семь миллионов семьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей и формируется в полном объеме за счет чистой прибыли Организатора Игры — ООО «Дакарай».

Состав призового фонда:

Вид приза	Количество	Сумма, бел. руб.	Общая сумма, бел. руб.
Денежный приз	9	428 000	3 852 000
Денежный приз	9	642 000	5 778 000
Денежный приз	27	1 070 000	28 890 000
Денежный приз	9	2 140 000	19 260 000

5. В Игре в период ее проведения, могут принять участие совершеннолетние физические лица, в возрасте старше 18 лет (далее по тексту — «Участники»), с учетом ограничений, изложенных в настоящих Правилах.

В Игре не имеют права участвовать работники и представители Организатора Игры, работники предприятий, связанных с Организатором договорными отношениями (обслуживающих Игру), а также члены семей названных работников и представителей, работники и представители любых других юридических лиц, имеющих отношение к организации и/или проведению настоящей Игры, а также члены их семей.

6. Описание Игры.

Механизм проведения Игры:

- Для того чтобы принять участие в Игре и розыгрыше призов Участнику следует в период с 14 января 2008 года по 20 марта 2008 года посетить казино "Royal", расположенное по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1 и принять участие в играх «ПОКЕР» столы № 1, 2 и/или «БЛЭК ДЖЭК», и/или «РУЛЕТКА» стол № 1. Нумерация столов указана на столах.

При этом участнику игры «ПОКЕР» независимо от игры у «дилера» выдаются игровые купоны за выпадение следующих комбинаций:

«Стрит» — 1 купон;
«Флэш» — 2 купона;
«Фул Хауз» — 3 купона;
«Карэ» — 4 купона;
«Стрит флэш» — 10 купонов;
«Роял флэш» — 20 купонов.

Участнику Игры «БЛЭК ДЖЭК» выдается 1 (один) купон за выпадение комбинации:

«Блэк Джэк одной масти»;
«6», «7», «8».

Участнику Игры «РУЛЕТКА» при выплате суммы, эквивалентной 860 000 (восемьсот шестьдесят тысяч) белорусских рублей выдается 1 (один) игровой купон.

Также, участник единожды купивший в кассе казино фишек на 214 000 (двести четырнадцать тысяч) белорусских рублей, получает 1 купон.

Купоны выдаются в период проведения рекламной игры с 00 час. 00 мин. 14 января 2008 года до 22 час. 55 мин. 20 марта 2008 года. Выдача купонов для участия в розыгрыше заканчивается за 5 минут до начала соответствующего розыгрыша.

Каждый купон, состоит из двух частей, имеющих свой идентификационный номер.

Участник Игры, получивший купон, по линии отрыва разделяет купон на две половины, одну половину оставляет себе, вторую — возвращает сотруднику Организатора Игры для дальнейшего участия переданной части купона в розыгрыше призов. Переданные Организатору Игры купоны помещаются в лототрон.

Получение купона участника Игры подтверждает факт ознакомления и полное согласие Участника с Правилами Игры, выражает желание Участника участвовать в Игре, а также обязывает присутствовать при проведении розыгрыша призового фонда Игры.

Организатор имеет право проводить дополнительные экспертизы купонов участников Игры, в том числе с привлечением экспертов. Поддельные купоны участника Игры, к участию в Игре не допускаются. Идентификация купонов участника Игры осуществляется работниками Организатора Игры.

7. В рамках Игры создается комиссия по проведению рекламной игры. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения рекламной игры с 14 января 2008 года по 20 марта 2008 года.

Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной Игры:

- Персональный состав комиссии утверждается приказом директора ООО «ДАКАРАЙ». В состав комиссии входят 3 человека — председатель и два члена комиссии.
- Решение комиссии признается действительным при условии присутствия большинства членов из общего состава комиссии.
- Член комиссии ведет протокол заседаний комиссии. В протоколе отражаются время и место проведения заседания комиссии, повестка дня.
- В протоколе розыгрыша призового фонда отражается время и место проведения розыгрыша призового фонда, сведения о составе комиссии по проведению розыгрыша, действия комиссии по проведению розыгрыша в том порядке, в каком они совершались, результаты проведения розыгрыша с указанием выигравшего купона и сведений о победителе, обладателе Приза рекламной Игры.
- Протоколы подписывают все члены комиссии, присутствующие при проведении заседания комиссии.
- Протокол заседания комиссии по проведению розыгрыша приза рекламной Игры является основанием для выдачи приза победителю.
- Комиссия уполномочена рассматривать жалобы и предложения со стороны участников Игры.

8. Розыгрыши призов Игры состоятся по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, казино «Royal» в присутствии комиссии по проведению рекламной Игры и участников Игры в 18 (восемнадцать) этапов по следующему графику:

1- ый этап розыгрыша призового фонда:
- 21 января 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- 21 января 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- 21 января 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;

2-ой этап розыгрыша призового фонда:
- 24 января 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 24 января 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 24 января 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей;

3-ий этап розыгрыша призового фонда:
- 28 января 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- 28 января 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- 28 января 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;

4-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 31 января 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 31 января 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 31 января 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей;

5-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 04 февраля 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- 04 февраля 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- 04 февраля 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;

6-ой этап розыгрыша призового фонда:
- 07 февраля 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 07 февраля 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 07 февраля 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей;

7-ой этап розыгрыша призового фонда:
- 11 февраля 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- 11 февраля 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- 11 февраля 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;

8-ой этап розыгрыша призового фонда:
- 14 февраля 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 14 февраля 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 14 февраля 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей;

9-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 18 февраля 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- 18 февраля 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- 18 февраля 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;

10-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 21 февраля 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 21 февраля 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 21 февраля 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей;

11-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 25 февраля 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- 25 февраля 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- 25 февраля 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;

12-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 28 февраля 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 28 февраля 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 28 февраля 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей;

13-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 03 марта 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- 03 марта 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- 03 марта 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;

14-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 06 марта 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 06 марта 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 06 марта 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей;

15-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 10 марта 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- 10 марта 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- 10 марта 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;

16-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 13 марта 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 13 марта 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 13 марта 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей;

17-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 17 марта 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей;
- 17 марта 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей;
- 17 марта 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;

18-ый этап розыгрыша призового фонда:
- 20 марта 2008 года в 22.00 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 20 марта 2008 года в 22.30 — розыгрыш денежного приза в размере 1 070 000 (один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей;
- 20 марта 2008 года в 23.00 — розыгрыш денежного приза в размере 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей;

Определение победителей игры будет проводиться посредством случайной выборки купонов участников Игры.

В каждом этапе к розыгрышу допускаются игровые купоны, полученные в срок до момента проведения последнего розыгрыша каждого этапа. После проведения каждого этапа розыгрыша, игровые купоны, участвовавшие в этапе, в дальнейших этапах участие не принимают.

Все допущенные к участию в розыгрыше купоны участника игры помещаются представителем Организатора в лототрон и перемешиваются. Один из членов комиссии случайным образом вытягивает купоны участника Игры из лототрона, объявляется идентификационный номер купона. Если в зале отсутствует владелец второй части купона с данным идентификационным номером, то из лототрона вынимается следующий купон. Данная процедура повторяется до тех пор, пока не будет вытянут купон с идентификационным номером, совпадающим с номером купона, присутствующего в зале участника Игры. Таким образом, определяются победители Игры.

9. По итогам розыгрыша составляется и подписывается членами комиссии протокол розыгрыша. Решение комиссии, касающееся результатов соответствующего Правилам розыгрыша Призового фонда, является окончательным и обязательным для всех участников и не может быть изменено.

10. О рекламной Игре можно получить информацию, позвонив по телефону «горячей линии» (8029)1113333 ежедневно с 09.00 до 24.00, либо непосредственно в казино «Royal» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1.

11. Вручение призов будет осуществляться по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1, казино «Royal» в срок до **23 марта 2008 года** (включительно).

12. Для получения приза выигравшему участнику Игры, необходимо иметь при себе паспорт, удостоверяющий личность и вторую половину игрового купона для сверки его идентификационного номера с номером выигрышного купона.

Выдача призов производится в пределах заявленного Призового фонда.

С момента получения приза, а также любого иного дохода в рамках Игры, любой Участник несет ответственность за уплату всех применимых налогов, установленных действующим законодательством Республики Беларусь.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках рекламной Игры их имена, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники игры по их согласию могут давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

13. Информирование о проведении Игры и ее условиях производится посредством размещения рекламы в средствах массовой информации, с использованием средств наружной рекламы, выпуском полиграфической продукции.

Настоящие Правила, сведения о Призовом фонде игры и порядке его формирования, сведения о составе комиссии по проведению рекламной игры и регламенте ее работы подлежат публикации в средствах массовой информации до начала рекламной игры.

Информация о результатах розыгрыша Призового фонда Игры будет опубликована в том же СМИ, где будут опубликованы правила настоящей Игры и дополнительно может быть размещена в других средствах массовой информации не позднее 30 апреля 2008 года.

Дополнительную информацию об Игре можно получить по телефону «горячей линии»: (8029)1113333 ежедневно с 09.00 до 24.00.

14. Участие в Игре автоматически подразумевает ознакомление с настоящими Правилами и согласие участников Игры следовать всем условиям настоящих Правил. Несоблюдение Участником выполнения настоящих Правил считается его отказом от участия в Игре.

Состав комиссии рекламной игры «Платиновая лихорадка 2»:

Председатель комиссии:
- Магеров Сергей Федорович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)

Члены комиссии:
- Курленя Алексей Иванович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — начальник смены)
- Умецкий Станислав Александрович (Место работы — ООО «Дакарай», должность — заместитель начальника смены)

Комиссия будет осуществлять свою деятельность в период проведения рекламной игры **с 14 января 2008 года по 20 марта 2008 года** (включительно).

Размер Призового фонда рекламной игры «ПЛАТИНОВАЯ ЛИХОРАДКА 2» составляет 57 780 000 (пятьдесят семь миллионов семьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей. Всего: 9 денежных призов по 428 000 (четыреста двадцать восемь тысяч) белорусских рублей; 9 денежных призов по 642 000 (шестьсот сорок две тысячи) белорусских рублей; 27 денежных призов по 1 070 000 (одному миллиону семьдесят тысяч) белорусских рублей; 9 денежных призов по 2 140 000 (два миллиона сто сорок тысяч) белорусских рублей.

Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры выдано Министерством торговли Республики Беларусь за № 922 от 22 декабря 2007 года.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.670. Індэкс 63850. Зак. № 105. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12